Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 СТУДЗЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 18 (28128) Кошт 2300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ВЫ — НАШ ГОНАР!

Дзеячам навукі, работнікам навукова-даследчых інстытутаў і вышэйшых навучальных устаноў

Дарагія сябры!

Віншую вас з прафесійным святам — Днём беларускай навукі.

Сёння ведам належыць важная роля ў фарміраванні канкурэнтнай эканомікі і паляпшэнні якасці жыцця людзей. Развіццё адукацыі і навукі — гэта залог самастойнасці і суверэнітэту дзяржавы, павышэння культурнага, інтэлектуальнага і духоўнага ўзроўню нацыі. Таму ў нашай краіне вялікая ўвага надаецца захаванню і ўмацаванню айчынных навуковых школ, укараненню ў практыку эфектыўных распрацовак.

Мы абапіраемся на магутны навукова-тэхнічны кадравы патэнцыял, які па праве з'яўляецца прадметам нашага гонару. Дасягненні беларускіх вучоных атрымліваюць сусветнае прызнанне і павышаюць прэстыж краіны на міжнароднай арэне. Але галоўнае — прыносяць бачную карысць грамадству.

Упэўнены, і ў далейшым вашы талент, працаздольнасць і невычэрпная энергія будуць служыць роднай Беларусі.

Зычу вам моцнага здароўя, дабрабыту і новых поспехаў у працы.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ЛІС, старшыня Брэсцкага аблвыканкама:

«Супрацоўніцтва сеткавых гандлёвых структур з мясцовымі таваравытворцамі павінна быць пастаўлена на якасна новы ўзровень. Ім трэба часцей сустракацца. На гэтых сустрэчах яны могуць абмеркаваць, які патрэбен сёння тавар, якой якасці, па якой цане. Гэта будзе падганяць і нашы прадпрыемствы, каб выраблялі патрэбную і канкурэнтную прадукцыю, і сеткі будуць разумець, што трэба працаваць таксама ў інтарэсах тэрыторыі, на якой яны знаходзяцца. Непрымальная тая сітуацыя, калі на прылаўках сеткавых крамаў адсутнічае якасная мясцовая прадукцыя».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 7°
Віцебск	+ 4°
Гомель	+ 3°
Гродна	+ 6°
Магілёў	+ 4°
Мінск	+ 4°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.01.2016 г.

Долар ЗША	20823,00	▼
Еўра	22623,00	▼
Рас. руб.	276,39	▲
Укр. грыўня	816,59	▼

ISSN 1990 - 763X

У НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ

Фота БЕЛТА.

Наталля НАДЗЕЖНАЯ — дацэнт кафедры «Аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў і вытворчасцяў» Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. За распрацоўку абсталявання медыцынскага прызначэння для пасляаперацыйнай рэабілітацыі анкалагічных хворых ёй прызначана стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 2016 год. Разам з аспірантамі кафедры Андрэем ГНІДЗЕНКАМ і Ягорам ЧАРНОВЫМ яны займаюцца новымі распрацоўкамі.

■ У ліку найлепшых

НАВУКА НА СЛУЖБЕ ЭКАНОМІКІ

Поспехі беларускай навукі знаходзяць адлюстраванне ў самых розных міжнародных рэйтынгах. Так, напрыклад, у 2015 годзе Беларусь увайшла ў топ-10 краін свету з найбольш імклівым развіццём інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. У глабальным індэксе інавацый за пяць гадоў наша краіна паднялася з 78-га на 53-ці радок. 15-е месца ў свеце па стварэнні новых ведаў, 32-е месца па выніках навукова-тэхнічнай дзейнасці — як сцвярджае старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр ШУМІЛІН, па згаданых паказчыках Беларусь выйшла на ўзровень краін Еўрапейскага саюза.

За апошні час беларусамі рэалізаваны шэраг праектаў міжнароднага ўзроўню. Так, у складзе аб'яднання ATLAS нашы навукоўцы зрабілі вялікі ўнёсак у адкрыццё славутага базона Хігса. Быў распрацаваны матэматычны дызайн хімічных злучэнняў, якія патэнцыйна могуць нейтралізоўваць ВІЧ-інфекцыю I тыпу. Лінейка «беспілотнікаў», энергаэфектыўныя святлодыёдныя выпрамяньвальнікі для вырошчвання сельскагаспадарчай прадукцыі, тэхналогія цеплавой стэрылізацыі хлебабулачных вырабаў без прымянення хімічных кансервантаў, кампазіцыйныя матэрыялы для 3D-прынтараў, шэраг фармацэўтычных распрацовак — усё гэта толькі маленькая частка са зробленага беларускімі навукоўцамі за апошні час.

Адна з галоўных рыс сучаснай беларускай навукі — яскравы ўхіл у бок прыкладных даследаванняў. Як зазначае **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ**, практычна ўсе айчынныя распрацоўкі знаходзяць прымяненне на вытворчасці. Больш за 80% унутраных выдаткаў НАН накіроўваецца менавіта на прыкладныя работы, а фундаментальныя даследаванні вылучаюцца сваёй практычнай скіраванасцю. Як вынік — ужо цяпер ва ўстанове фарміруюць спіс з топ-100 навуковых распрацовак для ўкаранення ў рэальным сектары эканомікі.

СТАР. 2

■ Будзь у курсе!

СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫЯ ПРАПАНУЕ ЗНІЖКІ

Сёння і заўтра ў крамах Белкаапсаюза пройдзе Адзіны дзень зніжак.

Пакупнікам усіх нехарчовых тавараў будуць дадзены зніжкі ў памеры 15 працэнтаў. Апроч таго, да 20 лютага Белкаапсаюз разам з пастаўшчыкамі будзе праводзіць распродаж тавараў зімовага асартыменту. На вырабах лёгкай прамысловасці ахвотныя нешта набыць змогуць зэканоміць 15 працэнтаў ад цэн.

У акцыях удзельнічае больш за тысячу ўнівермагаў і спецыялізаваных гандлёвых аб'ектаў спажывецкай кааперацыі, ва ўсіх абласцях тавары па зніжаных цэнах прапануюць і пункты выязнога (вынаснога) гандлю нехарчовымі таварамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЕЗ МАЛОГА СТО АБ'ЕКТАЎ

Прэзідэнт Указам №30 зацвердзіў Дзяржаўную інвестыцыйную праграму на 2016 год

На фінансаванне 99 аб'ектаў, уключаных у праграму, плануецца накіраваць Br4 трлн 584,1 млрд, у тым ліку за кошт дзяржаўных капітальных укладанняў — Br1 трлн 156,1 млрд, сродкаў рэзервовага фонду Прэзідэнта Беларусі — Br730 млрд, сродкаў рэспубліканскага дарожнага фонду — Br1 трлн 65,5 млрд, сродкаў на захаванне і пашырэнне сельскагаспадарчых угоддзяў (аб'екты меліярацыі) — Br517 млрд, сродкаў дзяржаўнага мэтавага бюджэтнага фонду нацыянальнага развіцця — Br1 трлн 115,4 млрд.

У 2016 годзе намечана пачаць фінансаванне будаўніцтва (рэканструкцыі) 19 новых аб'ектаў, у тым ліку 9 жылых дамоў для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-сірот, дзіцячага сада на 190 месцаў у мікрараёне №2, водазабора №2 і кацельні №2 у Астраўцы, другой штучнай узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце Мінск. З ліку аб'ектаў, якія пачынаюць будавацца, 11 плануецца ўвесці ў эксплуатацыю сёлета.

Усяго ў 2016 годзе ў адпаведнасці з праграмай прадугледжваецца ўвесці 36 аб'ектаў, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

ВЫСОКАЯ АЦЭНКА

Прэзідэнт падпісаў два ўказы аб прысуджэнні дзяржаўных узнагарод

У прыватнасці, намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Мікалай Мельчанка ўзнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені. У ліку ўзнагароджаных ордэнам Францыска Скарыны — вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Тадэвуш Коктыс, медалём «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку» — міліцыянер-вадзіцель групы затрымання роты міліцыі Барысаўскага аддзела дэпартамента аховы МУС Сяргей Глод, «За працоўныя заслугі» — дырэктар ААТ «Піянер-Агра» Капыльскага раёна Аляксандр Макарчук, медалём Францыска Скарыны — акцёр кіно, каскадзёр і пастаноўшчык трукаў, член Беларускай гільдыі акцёраў кіно Генадзь Чацверыкоў.

Узнагарод удастоены таксама прадстаўнікі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Так, медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання Міхаіл Кустоўскі. Ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» прысвоена прарэктару па вучэбнай рабоце — дырэктару Інстытута дзяржаўнай службы Сяргею Шаўруку.

Акрамя таго, ганаровыя званні прысвоены прадстаўнікам іншых сфер. У прыватнасці, заслужаным артыстам Беларусі стала вядучы майстар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Галіна Букаціна, заслужаным дзеячам мастацтваў Беларусі — загадчык кафедры інструментоўкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Вячаслаў Кузняцоў, заслужаным майстрам спорту Беларусі — спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды па цяжкай атлетыцы Дзіна Сазанавец і іншыя.

НАВУКА НА СЛУЖБЕ ЭКАНОМІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яшчэ адзін кірунак працы Акадэміі — стварэнне так званых кластараў, устаноў, скіраваных на выяўленне «кропак росту» і апераджальных абласцей развіцця навукі. Ужо працуе некалькі дзясяткаў такіх цэнтраў. На базе НАН пастаянна ствараюцца вытворчыя прадпрыемствы. Адзін з самых буйных праектаў, які ўжо знаходзіцца ў стадыі рэалізацыі, — «Белбіяград», шматфункцыянальны навукова-тэхнічны парк.

«Мінулы год быў Годам моладзі, і вельмі важна, што пятая частка даследчыкаў НАН — гэта маладыя навукоўцы, — адзначыў Уладзімір Гусакоў. — А ўвогуле, я сказаў бы, што акадэмія навук — гэта маладзёжная арганізацыя, сярэдні ўзрост супрацоўнікаў знаходзіцца на ўзроўні 50 гадоў. Існуюць цэлыя маладзёжныя лабараторыі і праекты, а іх удзельнікі атрымліваюць шматлікія прэміі і ўзнагароды, у тым ліку міжнародныя».

«Добрая сістэма адукацыі без добрай навукі немагчымая, — упэўнены **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.** — Таму мы ўсе свае ўстановы вышэйшай адукацыі разглядаем як комплексы, дзе прыярытэтнымі з'яўляюцца навуковыя даследаванні. У нас сёння ў сістэме адукацыі дзейнічае прыкладна 300 навуковых школ па розных кірунках. І калі казаць пра прыярытэты дзяржавы, то нам падаецца, што менавіта ва ўніверсітэтах павінны аднолькава развівацца як фундаментальны, так і прыкладны сектар».

У беларускіх універсітэтах ствараюцца і ўстановы трансферту ведаў, дзе студэнтаў вучаць укараняць навуковыя веды на вытворчасці. Адсюль — вялікая колькасць прадпрыемстваў і цэнтраў, створаных на базе ВНУ. Развіваюцца і новыя формы студэнцкай навукі, у прыватнасці стартап-рух. Летась у Палескім дзяржаўным універсітэце прайшоў першы форум, прысвечаны менавіта гэтаму віду дзейнасці.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

Ад кааперацыі — да сумесных інавацый

Такія задачы ставяць перад дзелавымі коламі ўрады Беларусі і Санкт-Пецярбурга. Пра гэта ды іншыя кірункі ўзаемадзеяння паведаміў Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр Беларусі, падчас пасяджэння Савета дзелавога супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Санкт-Пецярбурга, якое адбылося ўчора ў горадзе на Няве. Наступная сустрэча такога ж узроўню пройдзе ў чацвёртым квартале 2016 года.

Фота БЕЛТА.

— Санкт-Пецярбург — адзін з самых важных гандлёва-эканамічных партнёраў Беларусі сярод расійскіх рэгіёнаў, — заявіў Андрэй Кабякоў. — Па выніках 2015 года наш таваразварот склаў амаль паўтара мільярда долараў. Гэта не мала, але значна менш, чым было ў 2014 годзе. Тады мы мелі два мільярды долараў. Гэта быў пік. Мы павінны ў бліжэйшай перспектыве выйсці на тое, каб паказчыкі 2014-га года сталі звычайнымі і нават пераўзыдзенымі.

Беларускі прэм'ер станоўча ацаніў супрацоўніцтва паміж Беларуссю і горадам на Няве і адзначыў, што «ўсім нам неабходна садзейнічаць яго развіццю». Асноўнымі кірункамі мусяць стаць сферы вытворчай кааперацыі, транспартных, будаўнічых паслуг, экспартных паставак беларускіх тавараў, харчовых прадуктаў. Двухбаковыя адносіны, па словах старшыні Саўміна, — добры прыклад наладжвання міжрэгіянальных сувязяў.

Беларуская ўрадавая дэлегацыя агледзела экспазіцыю Цэнтра імпартазамяшчэння і лакалізацыі і наведала навукова-вытворчае аб'яднанне па перапрацоўцы пластмас «Камсамольская праўда». **Генеральны дырэктар аб'яднання Сяргей ЦЫБУКОЎ** падкрэсліў, што сумесны беларуска-піцерскі праект «доўгайграючы, стратэгічны, распісаны па гадах».

Для піцерскага НВА былі закуплены тэрмапласт-апараты Баранавіцкага станкабудаўнічага завода «Атлант». «Мы арганізавалі сумесны навучальны цэнтр, стварылі новую прафесію — механік-наладчык, запусцілі спецыяльныя курсы. Цяпер ствараецца інжынірынгавы цэнтр, — сказаў Сяргей Цыбукоў, каментуючы падпісанне адпаведнага дакумента.

Губернатар Санкт-Пецярбурга Георгій ПАЛТАЎЧАНКА заўважыў, што ў двухбаковым супрацоўніцтве назіраецца станоўчы трэнд развіцця. «Ён заключаецца не толькі ў нарошчванні паступленняў тых ці іншых тавараў, у тым ліку прадуктаў харчавання, — лічыць кіраўнік паўночнай сталіцы Расіі. — Мы маем добрую тэндэнцыю да развіцця кааперацыі, няхай пакуль і першаснага ўзроўню. Мы ставім перад сабой задачу перахадзіць ад кааперацыі да больш шчыльнага супрацоўніцтва для стварэння інавацыйных, высокатэхналагічных прадуктаў, з якімі горад Санкт-Пецярбург і Рэспубліка Беларусь маглі бы выхадзіць на знешнія рынкі».

Адметнай падзеяй мінулага года сталі Дні Мінска ў Санкт-Пецярбургу, якія адбыліся ўвосень. Па словах **Андрэя ШОРЦА, старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта**, дзякуючы ім быў падпісаны шэраг дакументаў, падчас кірмашоў — кантракты на 500 тысяч долараў, агучаны дамоўленасці аб адкрыцці пунктаў па продажы беларускіх абутку і касметыкі, развіцці медыцынскай і фармацэўтычнай сфер. «Мы і надалей будзем развіваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва і чакаем Санкт-Пецярбург з візітам у адказ», — сказаў мэр беларускай сталіцы.

Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ станоўча адзначыла ўзаемадзеянне ў вобласці друку і інфармацыі. Па яе словах, піцерскія калегі па пяры пастаянна ўдзельнічаюць у профільных мерапрыемствах беларускага боку. «Гэта павышае прафесійнае майстэрства і самае галоўнае — садзейнічае аб'ектыўнаму інфармаванню аб шматгранным супрацоўніцтве Беларусі і Санкт-Пецярбурга», — лічыць міністр.

Таксама важным кірункам у гуманітарным супрацоўніцтве выступае кніжна-выдавецкая дзейнасць, дадала Лілія Ананіч. Яна выказала падзяку губернатару Георгію Палтаўчанку за тое, што Беларусь была прадстаўлена на Санкт-Пецярбургскім міжнародным кніжным салоне ў якасці краіны — ганаровага госця. Міністр адзначыла, што ўжо праз колькі дзён Беларусь чакае прадстаўнікоў Санкт-Пецярбурга на XXIII Мінскую міжнародную кніжную выставу-кірмаш.

Што тычыцца лічбавага вымярэння адносін, то на працягу апошніх гадоў узаемны таваразварот паступова павялічваўся і вырас з 983 мільёнаў долараў у 2010 годзе да 1950 мільёнаў у 2014-м. Але ў студзені—лістападзе мінулага года знізіўся амаль на 30% у параўнанні з пазамінулым і склаў 1 млрд 284 мільёнаў долараў. Сальда традыцыйна засталося станоўчым — 303 мільёны долараў.

Аснову беларускага экспарту ў Санкт-Пецярбург складаюць пастаўкі мясной і малочнай прадукцыі, нафтапрадуктаў, а таксама цукру, таматаў, яблыкаў ды груш. У студзені—лістападзе мінулага года амаль па ўсіх пунктах назіраўся спад экспарту, акрамя садавіны, цукру і вырабаў з пластмасы. Пры гэтым пастаўкі нафтапрадуктаў скараціліся ў 2,7 раза, а ялавічыны, якая з'яўляецца першай у грашовым эквіваленце па аб'ёмах экспарту, на 31%.

У той жа час з Санкт-Пецярбурга на беларускі рынак пастаўляюцца легкавыя аўтамабілі, тытунь і яго заменнікі, бананы, трубы, электрычныя рухавікі і генератары. Рост назіраўся ў пастаўках тытуню і яго заменнікаў, рухавікоў і генератараў, абутку і харчовых прадуктаў, а па астатніх пазіцыях імпарт значна знізіўся.

Пра канкрэтны характар пасяджэння Савета дзелавога супрацоўніцтва сведчыць і той факт, што выступоўцы — кіруючыя асобы з абодвух бакоў — казалі не толькі пра «плюсы», але і аб праблемах, і шукалі спосабы іх вырашэння. Напрыканцы быў падпісаны пратакол, а таксама наменклатура і аб'ёмы паставак харчовых тавараў з Беларусі ў Санкт-Пецярбург у 2016 годзе.

Пасля ўдзелу ў Савеце дзелавога супрацоўніцтва прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў сустрэўся з расійскім калегам Дзмітрыем Мядзведзевым. Кіраўнік беларускага ўраду падкрэсліў, што Беларусь і Расія прадоўжаць супрацоўніцтва ва ўсіх сферах.

«Разлічваю, што сёння мы ўсё змястоўна абмяркуем і напярэдадні Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы даложым кіраўнікам дзяржаў, што ў нас ёсць план, разлікі і перспектывы, каб праявы, звязаныя з эканамічнай нестабільнасцю, паспяхова пераадольваліся», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Паводле яго слоў, у гэтым годзе ўжо прыняты шэраг рашэнняў у Саюзнай дзяржаве. «Прапаную падвесці вынікі і намеціць план супрацоўніцтва», — сказаў Андрэй Кабякоў.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by
Санкт-Пецярбург.

■ Адзнака

НАЙЛЕПШЫЯ ТАВАРЫ КРАІНЫ

Вызначаны лаўрэаты конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» 2015 года. Было адзначана 248 тавараў, якія выпускаюцца 143 арганізацыямі Беларусі.

Прадпрыемствам, тавары якіх удастоены звання лаўрэата, будуць уручаны дыпломы і дадзена права размяшчэння лагатыпа конкурсу на таварах і іх упакоўцы, а таксама ў дакументацыі і рэкламных матэрыялах.

У намінацыі «Харчовыя тавары» лаўрэатамі сталі 168 найменняў прадуктаў 84 арганізацый. Па катэгорыі «Прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння» вызначаны 46 тавараўпераможцаў 30 прадпрыемстваў, а ў намінацыі «Прамысловыя тавары для насельніцтва і вырабы народных промыслаў» — 31 тавар, які выпускаецца 26 арганізацыямі. Звання лаўрэата конкурсу ў намінацыі «Паслугі насельніцтву» ўдастоены 3 арганізацыі.

У прэс-службе Дзяржстандарта адзначылі, што многія прадпрыемствы ўдзельнічаюць у конкурсе штогод і перамагаюць у ім, бо стабільна забяспечваць высокі ўзровень прадукцыі і пашыраюць яе асартымент. Сярод іх — акцыянерныя таварыствы «Савушкін прадукт» (Брэст), «Беллакт» (Ваўкавыск), кіруючая кампанія холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка» (Віцебск), «Калінка» (Салігорск), Беларускі металургічны завод — кіруючая кампанія холдынга «Беларуская металургічная кампанія» (Жлобін) і іншыя.

— Ёсць прадпрыемствы, якія ўпершыню ўдзельнічалі ў гэтым конкурсе і адразу сталі яго лаўрэатамі. Напрыклад, гэта Ляхавіцкі малочны завод, камбінат «Усход» (Гомельская вобласць), СВК «Прагрэс-Верцялішкі» (Гродзенская вобласць), СВК імя В.І. Крамко (Гродзенская вобласць), ТАА «ЭФЕКТЫЎНЫЯ СІСТЭМЫ ЎПАКОЎКІ» (Мінская вобласць) і іншыя, — падкрэслілі ў прэс-службе камітэта.

Звесткі аб таварах-лаўрэатах і іх вытворцах размяшчаюцца на сайце Дзяржстандарту (www.gosstandart.gov.by) і ў штогадовым ілюстраваным каталогу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», які рассылаецца ў прадстаўніцтвы нашай краіны за мяжой.

Дар'я ШОЦІК

ПРАКУРОРСКІ ІСК ДА... СЫНА

Пракурорам усіх раёнаў даручылі наведаць на даму людзей, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту, інвалідаў першай групы, і паглядзець, як пра іх клапоцяцца сацыяльныя работнікі, а таксама сваякі, атрымліваючы грашовую дапамогу па доглядзе гэтых людзей. Аб гэтым паведаміў пракурор Гродзенскай вобласці Віктар МАРОЗАЎ.

Як вядома, клопат аб састарэлых бацьках — гэта яшчэ і канстытуцыйны абавязак дзяцей. І калі няма сумлення, то пра патрабаванні заканадаўства нагадае пракуратура. Вялікаўзроставае дзіця атрымлівае афіцыйнае папярэджанне са спасылкай на закон. Не ўсвядоміў сваёй адказнасці — у інтарэсах састарэлых бацькоў у суд накіроўваецца іск аб спагнанні з такіх дзяцей аліментаў.

— Гэта робяць не самі пажылыя людзі (вядома ж, ім сорамна прыцягваць да судовай адказнасці сваіх дзяцей), а пракуроры. Такія прыклады былі ў Гродзенскім, Шчучынскім раёнах, у абласным цэнтры, — зазначыў Віктар Марозаў.

Акрамя таго, дзяцей, якія ігнаруюць свае апякунскія абавязкі па доглядзе бацькоў, пазбаўляюць грашовай дапамогі. За апошнія гады на Гродзеншчыне было каля двухсот выпадкаў, калі адпаведныя выплаты спыняліся.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

■ Шпацыр па Камароўцы

ПАЧЫМ ЦЯПЕР ВІТАМІНЫ ДЛЯ АРГАНІЗМА?

Кідаецца ў вочы багацце айчыннай садавіны: яблыкі — на любы смак і густ. Кілаграм «кавуновага ліголя» стане вашым усяго за 20 тысяч рублёў, па тым жа кошце ідуць антонаўкі — іх надзвычай шмат на прылаўках. Некаторыя прадаўцы аддаюць усе папулярныя айчынныя гатункі ў сярэднім па 15 тысяч рублёў за кілаграм. Беларускія грушы ідуць па 18—20 тысяч. Надзвычай спакушальна выглядаюць вялізныя, сакавітыя «бэры» па 35 тысяч рублёў за кілаграм. Калі параўнаць, то грушы даражэйшыя за мандарыны, якія прадаюць па 25—30 тысяч. Ананасы можна адшукаць па 20—40 тысяч рублёў за кілаграм.

На прылаўках хапае хурмы гатунку «какі», але варта не траціць пільнасці пры выбары пладоў. Напрыклад, аддавалі кілаграм на першы погляд неблагіх «какі» за дзесяць тысяч рублёў. Выявілася, што хурма насамрэч пабітая і месцамі падгнілая, трэба выразаць мякаць. Для параўнання: прыгожая вялізная хурма каштуе ў два ці два з паловай разы даражэй (за гэтую суму можна забраць і кіло грэйпфрутаў). Падобная сітуацыя назіралася з бананамі: счарнелыя і непрыгожыя аддавалі па 10 тысяч рублёў, а жоўтыя і вялікія — па 18. За 18 тысяч рублёў можа дазволіць сабе адзін плод авакада альбо паўкілаграма вінограду гатунку «кішміш». Прыгожыя вялізныя азербайджанскія гранаты стануць вашымі за 30 тысяч рублёў за кілаграм. Па тым жа кошце знойдзецца сунічнае ківі. Самы вітамінны супрацьпрастудны прадукт — лімон — прадаюць у сярэднім па 45 тысяч рублёў за кілаграм. Дарэчы, дадаўшы да гэтай сумы яшчэ 15 тысяч, зможаце забраць літровы слоік цудоўных буйных журавін альбо тры кілаграмы «мускатнага» кавуна.

Прыгожыя чырвоныя памідоры аддаюць у сярэднім па 40-45 тысяч за кілаграм, чэры ёсць як па той жа цане, так і даражэй — 70 тысяч (дарэчы, па такім кошце мне параілі забраць 40-грамовы пакецік сушаных белых грыбоў, акурат для супу). Перац, пекінская капуста, кабачкі ў наяўнасці па 35 тысяч рублёў за кілаграм. Агуркі ў параўнанні з імі танныя: коштавая планка пачынаецца ад 10 тысяч рублёў і даходзіць у сярэднім да 25 тысяч рублёў за кілаграм. За дзесяць тысяч рублёў прапануюць кілаграм морквы альбо буракоў ці бульбы, хоць апошнюю можна знайсці і ў два разы танней. Кілаграм капусты ідзе па кошце стаграмовага пучка зялёнай цыбулі — 9 тысяч рублёў, на такую ж суму можна набыць дзве галоўкі часнаку. Саленняў таксама дастаткова. Квашаная капуста да бульбачкі ёсць па 30—35 тысяч за кілаграм, морква па-карэйску даражэй на 15 тысяч рублёў.

Лічыльнік «Звязды»

(Цэны за кілаграм, калі не пазначана іншае.)

Сала хатняе, салёнае — 100—145 тыс.
Сала свежае — 45—100 тыс.
Паляндвіца — 200—250 тыс.
Свініна (філе) — 100 тыс.
Ялавічына (філе) — 100—140 тыс.
Ялавічына (кумпяк) — 130—140 тыс.
Кураня (кумпячкі) — 37 тыс.
Сардэлькі «Аматарскія» — 82 тыс.
Сервелат «Крамлёўскі» — 116 тыс.
Сальцісон хатні — 100 тыс.
Стронга слабасалёная — 280 тыс.
Сёмга слабасалёная (200 г) — 80 тыс.
Селядзец слабасалёны — 58 тыс.
Хамса слабасалёная — 45 тыс.
Сачавіца (800 г) — 24 тыс.
Рыс круглы (800 г) — 14 тыс.
Грэчка (800 г) — 15 тыс.
Проса (800 г) — 8,5 тыс.
Алей сланечнікавы рафінаваны (1 л) — 25—30 тыс.
Яйка курынае Д-1 (дзясятак) — 16—21 тыс.
Яйка перапялінае (20 шт.) — 27 тыс.

Кацярына РАДЗЮК. *radziuk@zviazda.by*

■ Эканамічная бяспека

А КАМБАЙН «ЗАБЫЛІ» Ў ПОЛІ

Работнікі пракуратуры выявілі на Віцебшчыне нямала парушэнняў патрабаванняў Дырэктывы №3 ад 14 чэрвеня 2007 года (у новай рэдакцыі дырэктыва мае назву: «Аб прыярытэтных напрамках умацавання эканамічнай бяспекі дзяржавы»).

— Быў праведзены маніторынг сельгаспрадпрыемстваў у перыяд падрыхтоўкі да працы ў зімовых умовах. Асаблівая ўвага надавалася выкананню правілаў і ўмоў захоўвання сельскагаспадарчай тэхнікі, збожжа, угнаенняў, утрымання жывёлы. Дарэчы, летась адказным асобам, у тым ліку і кіраўнікам аблвыканкама, райвыканкамаў, неаднаразова ўказвалася на парушэнні. Сярод іх нядобрасумленнае захоўванне ўласнасці ў перыяд пасяўной кампаніі, уборкі і пры забеспячэнні захаванасці новага ўраджаю. Аднак і чарговы раз патрабаванні Дырэктывы праігнаравалі, — паведаміла «Звяздзе» **старшы пракурор аддзела па нагляду за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў пракуратуры Віцебскай вобласці Вольга ГРЫЦКЕВІЧ**.

На тэрыторыі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў павялічылася колькасць крадзяжоў. Для параўнання: у 2014 годзе іх было каля 90, а летась — больш за 125. Адна з прычын — адсутнасць належнага догляду за маёмасцю ў гаспадарках.

Падчас рэйду ў Сенненскім раёне кантралёры не сустрэлі на механізаваным двары вартаўніка, але ўбачылі адчыненыя браму і кабіны тэхнікі, а таксама... пустыя бутэлькі з-пад спіртнога. І ў іншай гаспадарцы таго ж раёна падобная карціна. Там жа збожжа са склада высыпалася на вуліцу праз спарахнелыя сцены.

Не ўберагаюць сцены і мінеральныя ўгнаенні ў адной з гаспадарак Шаркаўшчынскага раёна: трапляюць на іх дождж і снег. Туды таксама лёгка можа зайсці любы старонні чалавек. Пра ўсе гэтыя недахопы пракуратурай раёна раней ужо былі інфармаваныя адказныя асобы, але сітуацыя засталася нявыпраўленай.

Ва Ушацкім раёне летась з аб'ектаў прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу здзейснена 17 крадзяжоў, з іх 11 — у ААТ «Ушацкі райаграсэрвіс».

— Пра што гаварыць, калі ў вышэйзгаданай арганізацыі на ферме, якая не выкарыстоўваецца, адсутнічалі аконныя рамы, вароты былі адчыненымі, а ўнутры яе знаходзілася халадзільнае абсталяванне, — абураецца старшы пракурор.

У Аршанскім раёне пасля жніва камбайн застаўся ў полі. З машыны скралі акумулятарныя батарэі коштам больш за 6,7 мільёна рублёў.

Усяго пракуроры раёнаў падрыхтавалі 26 прадстаўленняў і столькі ж прадпісанняў аб ліквідацыі парушэнняў закона. Да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі 11 чалавек.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

НАХАБСТВА МЕЖАЎ НЕ ВЕДАЕ?

Жыхар Гомеля самавольна захапіў больш за пяць сотак зямлі каля самага Цэнтральнага рынку. На іх ён пабудаваў дом і памяшканні, якія выкарыстоўваюцца пад склады мясцовымі прадпрымальнікамі. Намеснік начальніка ўпраўлення Камітэта дзяржкантролю Гомельскай вобласці Андрэй Прыкота адзначае, што больш за пяць гадоў Гомельскім гарвыканкамам не прымаюцца меры, каб вызваліць прынаднае месца ад самавольных пабудоў.

— Згодна з той інфармацыяй, якая ў нас ёсць, грамадзянін з'яўляўся дырэктарам камерцыйнай структуры па вытворчасці мэблі. Да таго ж, здаваў у арэнду прадпрымальнікам незаконна пабудаваныя склады. Яму і дагэтуль праз дарогу носяць тавар для захоўвання. Пра гэты факт у гомельскім гарвыканкаме ведаюць больш за два гады. Але ж, пэўна, ёсць нейкая маўклівая згода, — лічыць Андрэй Прыкота. — Гавораць, што ў чалавека трое дзяцей і таму гэты дом не будуць зносіць. Між тым ва ўласнасці гэтага грамадзяніна яшчэ зарэгістраваны жылы дом плошчай 900 кв. м у пасёлку Паляны Чонкаўскага сельсавета і кватэра. Згодна з заканадаўствам, легалізаваць гэтую самавольную капітальную пабудову на самавольна занятым участку не атрымаецца. Ёсць толькі адзін варыянт — знос.

А тым часам грамадзянін робіць самавольныя ўрэзкі да водаправода, газу, электрычнасці. Пратаколы адпаведныя службы складаюць, яго адключаюць, а ён робіць гэта зноў. Між тым продаж толькі гэтага зямельнага ўчастка праз аўкцыённыя таргі дазволіў бы забяспечыць дадатковае паступленне ў мясцовы бюджэт не менш за Br0,4 млрд.

Кантралёры здзіўляюцца і іншым фактам безгаспадарчага стаўлення да зямлі ў абласным цэнтры, дзе попыт на ўчасткі і іх кошт у 5—10 разоў вышэйшыя, чым у раёнах. (Кадастравая вартасць зямельных участкаў у цэнтры Гомеля пад офісы за 1 кв. м складае $160. Пад індывідуальную забудову — больш за $30.)

У межах праверкі выяўлена больш за 40 зямельных участкаў агульнай плошчай 3 га, якія зараслі пустазеллем і хмызнякамі, а ў многіх выпадках захламленыя смеццем. Два гады таму супрацоўнікі КДК паведамлялі пісьмова ў Гомельскі гарвыканкам, што такія землі ёсць на вуліцах Пляханава і Рагавога.

Летась Гомельскім гарвыканкамам у раёне індывідуальнай жылой забудовы Раманавічы была праведзена інвентарызацыя. Прадпісанні накіраваны па 600 зямельных участках. Больш чым палова грамадзян пасля гэтага прыступілі да асваення, 170 ад участкаў адмовіліся, а астатнія ніякіх мер не прынялі. Ужо сёлета супрацоўнікі КДК выявілі 40 зямельных участкаў у першародным стане. Згодна з заканадаўствам, калі грамадзянін на працягу года хаця б не заклаў фундамент жылога дома, зямельны ўчастак канфіскуецца. У той жа час каля 1000 чалавек налічваецца ў чарзе жадаючых атрымаць зямлю.

Усяго па выніках праверак, праведзеных летась, выяўлена больш за 710 га зямлі, якая не выкарыстоўваецца, у Веткаўскім, Добрушскім, Лоеўскім, Мазырскім раёнах Гомельскай вобласці. Цяпер Камітэтам дзяржкантролю Гомельскай вобласці разглядаецца пытанне аб прыцягненні да адказнасці асоб, якія дапусцілі парушэнні зямельнага заканадаўства.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■ Май на ўвазе

«ТЭЛЕФОННАЯ» НЕЗАКОНАПАСЛУХМЯНАСЦЬ

Яна пагражае не толькі штрафам, але і трагедыяй на дарозе

Дзяржаўтаінспекцыя Гродзеншчыны б'е трывогу: калі ў 2014 годзе за выкарыстанне тэлефоннай сувязі падчас руху аўтамабіля да адказнасці прыцягнулі 544 кіроўцы, то летась — ужо 1140. Рост больш чым удвая! Нават з улікам узмацнення кантролю з боку ДАІ на «тэлефонную» законапаслухмянасць за рулём, мяркуючы па гэтай статыстыцы, вельмі многім удзельнікам дарожнага руху проста пляваць.



Пры гэтым Дзяржаўтаінспецыя звяртае ўвагу, што выкарыстанне мабільнага тэлефона падчас кіравання аўтамабілем магло быць адной з прычын першай у гэтым годзе смерці на дарозе. Так, куды больш верагодна, што бяда здарылася з-за выкарыстання летніх шын на задняй восі машыны. Аднак ДАІ не выключае і ўплыў «тэлефоннага» фактару. Дарэчы, у Астравецкім раёне, дзе адбылося гэтае ДТЗ, колькасць фактаў пакарання за карыстанне тэлефонам падчас язды павялічылася з 5 у 2014 годзе да 61 — у мінулым.

ДА ВЕДАМА:

За першае «тэлефоннае» парушэнне падчас руху аўтамабіля кіроўца падлягае адказнасці ў выглядзе папярэджання альбо штрафу да 2 базавых велічынь (да 420 000 рублёў). За паўторнае парушэнне на працягу года штрафныя санкцыі складаюць ад 2 да 8 базавых велічынь (420 000 — 1 680 000 рублёў).

Вучоныя сцвярджаюць, што пры выкарыстанні мабільнага тэлефона за рулём з'яўляецца так званы «тунэль віжн» альбо абмежаваны далягляд, калі не ўспрымаецца інфармацыя звонку. Рэакцыя на тую ці іншую дарожную сітуацыю ў кіроўцаў — аматараў размаўляць па тэлефоне падчас язды можа быць занадта маруднай. Гэта куды больш небяспечна, чым размаўляць з пасажырам альбо слухаць музыку.

Відавочна і тое, што выкарыстанне мабільных тэлефонаў таксама зніжае ўвагу, пагаршае каардынацыю іншых удзельнікаў дарожнага руху — пешаходаў. І ў выпадку ўзнікнення аварыйнай сітуацыі на «зебры» ў іх будзе менш шанцаў правільна і хутка зрэагаваць на пагрозу. На сённяшні дзень беларускае заканадаўства не прадугледжвае нейкай адказнасці за размовы па тэлефоне на пешаходным пераходзе. Але ж хіба ёсць цана ўласнаму жыццю і здароўю?

— Паважаныя пешаходы! Пераходзячы дарогу, не адцягвайце сваю ўвагу размовамі па тэлефоне і глядзіце па баках столькі разоў, колькі гэта неабходна для вашай бяспекі, — заклікае Дзяржаўтаінспекцыя.

Так, ісціна прапісная, але далёка не ўсімі засвоеная.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

■ Схаванае мінулае

ТАМ, ДЗЕ СУСТРАКАЮЦЦА МОРЫ

ЯК ЖЫЛІ БЕЛАРУСКІЯ ВЯСКОЎЦЫ ТЫСЯЧУ ГАДОЎ ТАМУ?

У канцы мінулага года Нацыянальная акадэмія навук, як звычайна, аб'явіла спіс з дзесяці найважнейшых вынікаў працы беларускіх навукоўцаў у 2015-м. Цікава, што ў топ побач з фізікамі, хімікамі і біёлагамі трапілі і айчынныя археолагі. Спецыялісты Інстытута гісторыі правялі велізарны аб'ём працы ў гісторыка-культурным комплексе X—XII стагоддзяў «Васілеўшчына» і знайшлі нямала рэчаў, якія могуць расказаць пра жыццё нашых продкаў. Пра незвычайны аб'ект і працу на ім гісторыкаў «Звяздзе» расказалі намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі НАН Вадзім ЛАКІЗА і загадчык аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны Інстытута гісторыі НАН Андрэй ВАЙЦЯХОВІЧ.



— Раскажыце, з чаго пачалася праца на комплексе? Увогуле, ці даўно гісторыкі ведалі, што на гэтым месцы знаходзілася старажытнае паселішча?

А.В.: — Пра тое, што пад сельскагаспадарчымі землямі на мяжы Мінскага і Дзяржынскага раёнаў захоўваюцца рэшткі старажытнага славянскага паселішча, мы ведалі прыкладна з 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Але археалагічных работ дагэтуль там ніхто не праводзіў. Справу зрушыў пачатак будаўніцтва МКАД-2, якая па праекце павінна пралягаць якраз па тэрыторыі комплексу. Мы прынялі рашэнне правесці раскопкі на тым участку былога паселішча, дзе будзе знаходзіцца дарожнае палатно. Экспедыцыя Інстытута гісторыі НАН пад нашым кіраўніцтвам на працягу некалькі месяцаў даследавала помнік на плошчы больш як 2 гектары з агульных 10, якія займала гэтая буйная вёска.

— Што было знойдзена на тэрыторыі Васілеўшчыны?

А.В.: — 74 археалагічныя аб'екты, якія з'яўляюцца рэшткамі самых розных пабудоў: жылых, гаспадарчых, вытворчых... Сярод іх доменныя печы, запоўненыя шлакамі, — гэта значыць, жыхары старажытнай Васілеўшчыны актыўна займаліся плаўкай жалеза з балотнай руды. У астатніх аб'ектах знойдзена вялікая колькасць розных артэфактаў, якія шмат распавядаюць пра побыт жыхароў вёскі, што ўваходзіла ў ваколіцы буйнога горада — гістарычнага Менска, які знаходзіўся непадалёк, на рацэ Менцы.

— У чым галоўная вартасць зробленай навукоўцамі працы?

В.Л.: — Па-першае, гэта было адно з самых буйных даследаванняў сельскіх паселішчаў у гісторыі археалагічнай навукі Беларусі. І гэта пры тым, што раскопкі праводзіліся толькі на пятай частцы паселішча. Мы шмат даведаліся пра самыя розныя дэталі жыцця нашых продкаў. Скажам, аналіз згаданых 74 аб'ектаў пры дапамозе спецыяльных метадаў даў нам інфармацыю пра асаблівасці тагачаснага будаўніцтва. Цяпер мы ведаем форму жылых і гаспадарчых пабудоў, іх памеры, планіроўку. Два гектары, на якіх праводзіліся работы, дазваляюць нам аднавіць усю структуру самога паселішча: па якіх правілах размяшчаліся пабудовы розната прызначэння, як забудоўвалася вёска і гэтак далей.

Сама старажытная Васілеўшчына была незвычайным паселішчам. Адна яго частка пачала функцыянаваць прыкладна з X—XI стагоддзя, другая з'явілася толькі ў XII. Якраз у гэты перыяд у тагачасным грамадстве адбываліся сур'ёзныя перамены — пераход ад абшчыннага ўкладу да феадалізму. І нашы знаходкі ў больш новай частцы вёскі гэта добра ілюструюць: у адной з сядзіб мы знайшлі зброю, рыштунак вершніка, упрыгажэнні з каштоўных металаў, якія сведчаць аб тым, што там жыў ужо не просты селянін, а княжацкі дружыннік. Менавіта прыклад Васілеўшчыны пацвярджае ранейшыя нашы тэорыі аб тым, як адбываўся пераход да прыватнага землеўладання.

Акрамя таго, шэраг знаходак пацвярджае, што насельніцтва вёскі актыўна займалася і гандлем. Так, мы адшукалі арабскія дырхемы, шкляныя пацеркі і ўнікальныя пярсцёнкі... Яшчэ адна важная і ўнікальная знаходка — праселка з цёмнага нарвежскага мыльнага каменя. Усё гэта сведчыць аб тым, што тагачаснае насельніцтва вёскі мела наладжаныя гандлёвыя сувязі як з поўднем, прычым вельмі далёкім, так і з поўначчу.

А.В.: — Трэба сказаць, што само месца, дзе знаходзілася паселішча, надзвычай унікальнае, і ўжо гэта робіць яго даследаванне вельмі важным. Адтуль усяго паўтара кіламетра да Пцічы, а сама Васілеўшчына знаходзіцца на рацэ Уса. Гэтыя рэкі адносяцца да вадазборных сістэм Дняпра і Нёмана і, адпаведна, да розных марскіх басейнаў. Менавіта тут праходзіць водападзел Чорнага і Балтыйскага мораў, а гэта значыць, месца для размяшчэння вёскі было выбрана вельмі ўдала — яе гаспадары кантралявалі найважнейшую гандлёвую магістраль і мелі сувязі практычна з усім светам.

Ёсць і іншая ўнікальная асаблівасць — тут сутыкаліся зоны ўплыву розных племянных аб'яднанняў: крывічоў і дрыгавічоў. Дзякуючы гэтаму на Міншчыне сфарміравалася асаблівая славянская культура, якую, магчыма, нават варта было б вылучыць у якасці асобнай, бо яна вельмі моцна адрозніваецца ад іншых. Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў Васілеўшчыне наша гістарычная навука займела новы апорны помнік славянскай культуры, і яго значэнне цяжка пераацаніць.

— Ці можна казаць аб тым, што праца ў Васілеўшчыне ўжо завяршылася?

В.Л.: — Вядома, не. Калі казаць пра навуковы аспект, то вынікі работы археолагаў будуць апрацоўвацца яшчэ доўга, не менш за год. У перспектыве гэта патрабуе асобнай манаграфіі, бо, як мы ўжо казалі, месца ўнікальнае. У кнізе трэба прааналізаваць усё тое, што патрабуе ўвядзення ў навуковы ўжытак. Плануем ініцыяваць і працу па ўключэнні комплексу ў спіс дзяржаўных гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Ёсць і практычны плён — гэта ў першую чаргу артэфакты, якія папоўняць калекцыі нашых музеяў. Дарэчы, мы плануем зладзіць першую адмысловую выставу самых цікавых знаходак з Васілеўшчыны на Дзень навукі.

А.В.: — Нават у плане археалогіі нам яшчэ ёсць чым заняцца на гэтым комплексе. Зусім побач знаходзяцца курганы, даследаванне якіх дасць нам звесткі пра пахавальны абрад і побыт тагачасных насельнікаў вёскі. Акрамя гэтага, мы даведаемся пра этнічную прыналежнасць жыхароў гэтай тэрыторыі. Пры дапамозе нашых генетыкаў зможам вызначыць і іх генатып, а гэта яшчэ большы аб'ём новых ведаў.

— Магчыма, і ў 2016-м археолагі парадуюць нас новымі адкрыццямі і цікавымі знаходкамі?

В.Л.: — Планы ў нас стандартныя, будзем працаваць ва ўсіх без выключэння рэгіёнах Беларусі. Вядома, важнае месца зойме будаўніцтва першага беларускага скансэна (археалагічнага музея пад адкрытым небам) у Белавежскай пушчы. Будуць праводзіцца работы на так званым Крывіцкім тарфяніку пад Бешанковічамі. Яшчэ адзін аб'ект на Віцебшчыне — Бірулі, унікальны комплекс, які дае шмат інфармацыі пра супрацоўніцтва крывічоў і русі (маецца на ўвазе гістарычная супольнасць, якая аб'яднала балцкія, фіна-ўгорскія і славянскія плямёны. — **Аўт.**). Працягнем працу на Падняпроўі, арганізуем даследаванні на тэрыторыі Мірскага замка. Сумесна з французскім бокам будзем працаваць на Студзёнцы. Не спыняюцца і работы ў абласных цэнтрах, у Мінску. Традыцыйна будзем ладзіць археалагічныя летнікі для школьнікаў, падчас якіх дзеці змогуць паўнавартасна паўдзельнічаць у раскопках.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

■

■ Святло ў акне

ШЛЯХ УГОРУ

Праект «Супер Пупер Дзеці» шукае новых «зорак» сярод сірот

Прафесійны гук і святло, сцэна, на якой спявалі беларускія і расійскія зоркі, навакольны антураж начнога клуба і... дзеці. Спалучыць неспалучальнае ўдалося ў тэатры-караоке «Багема», які днём ператвараецца ў рэпетыцыйную залу для ўдзельнікаў праекта «Супер Пупер Дзеці». Сярод юных спевакоў — інваліды, сіроты і дзеці без абмежаванняў ад 5 да 17 гадоў.

Генеральная рэпетыцыя.

Ідэя такога пачынання з'явілася літаральна ў сярэдзіне снежня мінулага года, напрыканцы 2015-га ўжо прайшоў адбор талентаў, а ў нядзелю ўвечары адбудзецца конкурс маладых вакалістаў «Super Puper Hit 2016». Такая аператыўнасць стала магчымай дзякуючы агульным намаганням людзей, зацікаўленых у рэабілітацыі дзяцей, іх сацыялізацыі і раскрыцці талентаў.

— Праз конкурс мы вырашылі аб'яднаць таленавітых дзяцей усіх катэгорый, каб яны не адчувалі падзелу на інвалідаў, сірот і іншых, — расказаў **Аляксандр КУПРЫЯНОВІЧ, кіраўнік дзіцячага прадзюсарскага цэнтра «Супер Пупер», завадатар праекта.** *— Я ведаю не па чутках, што катэгорыя малых, якія не могуць дазволіць сабе прафесійныя студыі, мікрафоны, запісы і іншае з-за фінансавай нястачы, але маюць таленты, вельмі вялікая. У рэалізацыі праекта, дарэчы, вельмі дапамог камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама, які пайшоў нам насустрач і дазволіў дзеткам удзельнічаць у кастынгу.*

Заняткі па вакале і харэаграфіі ў юных артыстаў пачаліся толькі 2 студзеня, але на генеральнай рэпетыцыі, што адбылася тыдзень таму, здагадацца пра гэта было немагчыма. Упэўненасць і задавальненне ззялі на твары кожнага выканаўцы. Прафесійны падыход і жаданне саміх дзяцей спяваць адразу відаць, адзначылі спецыяльна запрошаныя на галоўны «прагон» артыстаў госці — людзі, якія маюць дачыненне да рэалізацыі праекта.

— Асноўная катэгорыя выканаўцаў — дзеці, якія маюць фізічныя або псіхалагічныя недахопы. А тут, на сцэне, яны такія ж, як і ўсе. На свае вочы бачыла, як адна з удзельніц — дзяўчынка, якая вельмі слаба бачыць, — на сцэну падымалася, трымаючыся за руку памочніка. І вось яна стаіць, дрыжыць, а ледзьве пачалася музыка — змянілася. Усе рухі адразу сталі дакладнымі, скаардынаванымі, прыгожымі, галасок зазвінеў, — **падзялілася Таццяна КОТ, старшыня міжнароднага грамадскага дабрачыннага аб'яднання «Незалежная дапамога дзецям»**. — Гэта жывое сведчанне таго, наколькі важныя і як дапамагаюць творчыя заняткі такім дзеткам. Такія праекты трэба рабіць, і добра было б, каб іх падтрымлівалі на ўсіх узроўнях.

— Сама ідэя заахвоціць нашых дзетак займацца спевамі на такім прафесійным узроўні вельмі добрая, — адзначыла **Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, загадчыца сектара сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама**. *— Гэта цудоўны дадатковы занятак, тым больш бясплатны і якасны. Ён дапаможа малым у далейшым — калі не стаць «зоркамі» сцэны, дык сацыялізавацца ў грамадстве, вызваліцца ад стэрэатыпаў, вольна пачуваць сябе ў розных абставінах.*

Нестандартны падыход да пошуку месца выступлення арганізатары тлумачаць проста.

— Я палічыў, калі мы запросім дзяцей у класнае месца, дзе яны рэальна змогуць адчуць сябе сапраўднымі артыстамі, то гэты праект запомніцца ім надоўга. Трапіць сюды на выступленне вельмі праблематычна нават для вядомых беларускіх «зорак». Я сам ніколі ў жыцці на такой сцэне не стаяў, — жартуе Аляксандр Купрыянавіч. — *Наша задача — не знайсці ў іх Лучана Павароці, а зрабіць з іх упэўненых у сабе людзей, якія ведаюць сабе цану, ведаюць, што яны могуць. Гэта шлях угору. Таму толькі ў такім месцы трэба рабіць такія праекты.*

Незалежна ад ацэнкі журы кожны ўдзельнік канцэрта атрымае падарунак, паабяцалі арганізатары. Прызёры і ўладальнікі гран-пры, а таксама яшчэ некалькі асабліва таленавітых дзетак атрымаюць стыпендыю, якая дасць ім права цэлы год займацца ў цэнтры «Супер Пупер». І для кагосьці гэта можа стаць паваротным момантам лёсу.

Ірына СІДАРОК.
Фота аўтара.

В извещение о проведении 02.03.2016 2016 в 11.00 по адресу: 230015 г.Гродно, ул. Максима Горького, 87 , каб. №204, открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, опубликованного в газете «Звязда» № 17 от 29.01.2016, вносятся изменения в части размера коэффициента по лоту № 9 и № 10:

Адрес арендуемого имущества	№ Лота	Площадь, кв.м	Коэффициент от 0,5 до 3,0	Начальная цена продажи, базовые арендные величины*	Размер задатка, базовые арендные величины*	Характеристика
Изолированное помещение, помещение связи, 1-й этаж, помещения, Гродненская область, г. Гродно, ул. Пестрака, 36, пом. 3	лот №9	21,6	2,0	5,4	0,54	Помещения находятся на первом этаже пятиэтажного здания во второй зоне города. В помещениях имеется естественное освещение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизированы. В здании имеется водоснабжение и канализация. Помещения находятся в удовлетворительном состоянии.
	лот №10	11,3	2,0	2,825	0,2825	

Телефоны для справок (0152) 606805, 606801.

УНП 500826567

■ Час вызначацца

РАБОЧАЯ ПРАФЕСІЯ — НЕ ТУПІКОВЫ ШЛЯХ

ПАМЫЛЯЕЦЦА ТОЙ, ХТО ЛІЧЫЦЬ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ «КАМЕРАЙ ЗАХОЎВАННЯ» ДЛЯ НЯЎДАЧНІКАЎ

Гэтую думку ўжо не першы год беларускія педагогі імкнуцца данесці да сваіх вучняў. Аднак падчас чарговай уступнай кампаніі сітуацыя зноў паўтараецца — асноўны паток абітурыентаў накіроўваецца на штурм ВНУ, а сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы разглядаюцца маладымі людзьмі ў якасці «запаснога аэрадрома». Ні для кога не сакрэт, што моладзь, асабліва з вялікіх гарадоў, часта з пагардай ставіцца да рабочых прафесій. Прычым у такім стаўленні да «працы рукамі» маладых людзей падтрымліваюць і бацькі. Аналагічная сітуацыя назіраецца ў многіх постсавецкіх і еўрапейскіх краінах. Захаваць прэстыж рабочых спецыяльнасцяў удалося толькі ў Германіі. У плане сацыялізацыі вучняў і матывацыі да граматнага выбару прафесіі гэта краіна дабілася найлепшых вынікаў на кантыненце. Вышэйшая адукацыя не з'яўляецца для маладых немцаў самамэтай, а галоўную каштоўнасць для іх уяўляюць набытыя навыкі і магчымасць працаваць па атрыманай спецыяльнасці...

ПАГЛЫБЛЕННЕ Ў СВЕТ ПРАФЕСІЙ

Два гады таму ў Беларусі стартаваў сумесны беларуска-нямецкі праект па фарміраванні ў моладзі матывацыі да прафесійнага самавызначэння на прыкладзе багатага досведу сістэмы адукацыі Германіі. У ім разам з культурна-спартыўным таварыствам «Віта» (Германія, г.Дортмунд) і Мінскім гарадскім інстытутам развіцця адукацыі былі задзейнічаны сталічныя ўстановы адукацыі, мінскі гарадскі адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Лідар», а таксама вучні 7—9-х класаў з Віцебскай і Гродзенскай абласцей (Бабініцкай і Гальшанскай сярэдніх школ).

— Мы мелі магчымасць вывучыць вопыт арганізацыі прафарыентацыйнай работы ў Германіі і на свае вочы пераканацца ў тым, што ў гэтай краіне адсутнічае выразны перакос у бок прэстыжнасці вышэйшай адукацыі, — падкрэслівае **рэктар Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі (МГІРА) Таццяна МАРОЗ**. — Змяняецца час, і наш вучань таксама змяняецца, таму многія з тых напрацовак, якія былі зроблены шмат гадоў таму, напэўна, сёння ўжо страцілі сваю актуальнасць. Сучасны падлетак у выніку аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын зусім па-іншаму глядзіць на выбар прафесіі. На першы план выходзіць яе прэстыжнасць...

Нямецкія дзеці пачынаюць знаёміцца са светам прафесій яшчэ ў дашкольным узросце. На больш сур'ёзным узроўні знаёмства працягваецца ўжо у школе. Бацькі бачаць здольнасці сваіх дзяцей і ўжо пасля пачатковай школы (4 класа) сумесна выбіраюць будучыя прафесіі. Зразумела, што гэтае рашэнне не канчатковае, але ўсё ж такі скіроўвае на далейшую працу ў пэўным напрамку. Паралельна з вывучэннем прадметаў прыродазнаўча-матэматычнага і гуманітарнага цыклаў у агульнаадукацыйных і рэальных школах не менш важны акцэнт у 5-6-х класах робіцца і на вывучэнні прыкладных прадметаў — чарчэння, дамаводства, якія забяспечваюць практычную падрыхтоўку школьніка да самастойнага жыцця. У 7-8-х класах прадугледжаны кароткія навучальныя курсы «Арганізацыя працы», «Тэхнічнае чарчэнне», «Інфармацыя для спажыўцоў», «Грошы і формы фінансавання», а таксама ўведзена планаванне хатняй гаспадаркі. У 8-10-х класах школьнікі наведваюць заняткі па выбары, выконваюць праектныя работы, праходзяць вучнёўскую практыку, працуюць на школьных міні-прадпрыемствах.

За кожнай навучальнай установай замацаваны прадпрыемствы, дзе навучэнцаў, пачынаючы з пятага класа, знаёмяць з рознымі відамі работ. На заканадаўчым узроўні замацавана праходжанне кожным вучнем двухтыднёвай сацыяльнай практыкі, у ходзе якой ён атрымлівае навыкі па чатырох відах прафесій. Да заканчэння агульнаадукацыйнай або рэальнай школы кожны выпускнік можа вызначыцца, што яму рабіць далей: працягваць вучобу або перайсці ў гімназічны клас, ці замацавацца за канкрэтным прадпрыемствам і атрымаць рабочую прафесію пры цэнтры развіцця прафесійных ведаў або ў каледжы прафадукацыі. Навучэнцам такіх цэнтраў, якія праходзяць практыку на прадпрыемстве, выплачваецца стыпендыя ў памеры прыкладна 600 еўра.

Пасля заканчэння абавязковага 9-гадовага навучання каля 80% маладых людзей працягваюць навучанне ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі: каля 70% — у форме вытворчага вучнёўства і каля 10% — у прафшколах поўнага дня.

— У Германіі, у параўнанні з іншымі краінамі Еўразоны, насамрэч самы нізкі ўзровень беспрацоўя сярод моладзі і адсутнічаюць тыповыя для вашай краіны праблемы з запаўненнем прафесійна-тэхнічных устаноў, — канстатуе **кіраўнік Праграмы падтрымкі Беларусі Федэральнага ўрада Германіі Вольга РЭНШ-ВЕТЦЭЛЬ**. — Заробак спецыялістаў рабочай кваліфікацыі залежыць ад складанасці работы і можа быць вельмі высокім — перавышаць 5 тысяч еўра ў месяц. Ва ўмовах сучаснай вытворчасці фактычна ствараецца новы тып рабочага, запатрабаванага не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Веданне замежных моў, якасныя прафесійныя веды і практычныя ўменні робяць гэта магчымым.

ЗРОБЛЕНА СВАІМІ РУКАМІ

Як падрыхтаваць выпускніка, які будзе валодаць неабходнымі для выбару прафесіі прадметнымі і эканамічнымі ведамі і зможа «прэзентаваць» сябе наймальніку? Як сфарміраваць варыятыўнае адукацыйнае асяроддзе, якое будзе спрыяць прафесійнаму самавызначэнню школьнікаў? Адказы на ўсе гэтыя пытанні і спрабуюць знайсці сёння ўдзельнікі беларуска-нямецкага праекта... Школьнікі вывучаюць пытанні, звязаныя з выбарам прафесіі, на факультатыўных занятках, а таксама праз сацыяльныя практыкі, арганізаваныя на прадпрыемствах у рэгіёнах. Пра шматстайнасць запатрабаваных сучасным грамадствам прафесій яны могуць даведацца і з іншых крыніц, чаму спрыяе індывідуальная праектная дзейнасць і ўдзел у тэматычных конкурсах.

Мінулым летам на базе мінскага гарадскога адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Лідар» была арганізавана ўнікальная міжнародная змена: 12 беларускіх падлеткаў з розных рэгіёнаў, у тым ліку і са сталіцы, сабраліся разам, каб з дапамогай нямецкіх спецыялістаў паспрабаваць сябе ў розных рабочых прафесіях. Змена доўжылася 14 дзён і размяшчалася ў палатачным гарадку.

— Першыя дні былі для падлеткаў даволі складанымі ў плане як фізічнай, так і маральнай нагрузкі. Дзеці пачыналі свой «працоўны дзень» а восьмай гадзіне, і доўжыўся ён калі-некалі аж да 23 гадзін. Зразумела, што працоўны — умоўна. Актыўная праца на прыродзе, пастаянная змена дзейнасці, спорт... Падлеткі нават не ўяўлялі, што столькі ўсяго можна зрабіць за такі кароткі прамежак часу! Да таго ж трэба было прывыкаць да самаабслугоўвання, дзяжурстваў і шмат чаго іншага, з чым некаторыя дзеці сутыкнуліся ўпершыню ў жыцці, — расказвае **мадэратар змены, метадыст упраўлення каардынацыі стажыровак і міжнароднага супрацоўніцтва МГІРА Ганна ДАСЬКО**. — Прычым ім усім трэба было не проста суіснаваць разам, а стаць калектывам, дружнай камандай.

Як матываваць дзяцей да атрымання рабочых прафесій? Адказ ляжыць на паверхні — пазнаёміць іх з улюбёнымі ў сваю справу паспяховымі людзьмі. Падлеткаў спрабавалі захапіць сваімі прафесіямі ландшафтны садоўнік Маркус Фляйшэр і два браты — Міха (цясляр) і Рубэн (мехатронік). Пад іх кіраўніцтвам дзеці павінны былі стварыць экалагічныя зоны на тэрыторыі цэнтра. У выніку яны змаглі паспрабаваць сябе ў такіх прафесіях, як плітачнік, спецыяліст па дрэваапрацоўцы, ландшафтны дызайнер і кветкавод-азеляняльнік.

Нямецкія спецыялісты пазнаёмілі беларускіх дзяцей з інструментамі і тэхнікай бяспекі, а затым паэтапна адпрацоўваліся навыкі выканання работ з нівелірам, узроўнем і шнуром для фіксацыі роўнасці паверхні, навыкі замешвання цэменту і ўкладкі тратуарнай плітак. Дзяцей вучылі знаходзіць выйсце з нестандартных сітуацый, калі не хапае матэрыялу ці часу або рабоце перашкаджае дрэннае надвор'е. Галоўнай умовай было, каб кожнае звяно тэхналагічнага ланцужка праходзіў кожны ўдзельнік каманды. Прыкладам для пераймання для нашых хлопцаў і дзяўчат сталі захопленасць, прафесіяналізм, эрудыцыя і павага да сваёй справы нямецкіх спецыялістаў. Як прызналіся самі падлеткі, найбольш моцнае ўражанне пакінула веданне простым нямецкім садоўнікам дзвюх замежных моў.

МАЛЕНЬКІ ЦУД

Вынікам сумеснай творчай працы беларускіх школьнікаў і нямецкіх майстроў сталі экалагічны куток з квітнеючымі лілейнікамі, шалфеем, мятай, млынам, мініяцюрным возам і іншымі элементамі беларускага побыту.

Акрамя магчымасці дакрануцца да кожнай прафесіі ўласнымі рукамі, для ўдзельнікаў атрада было арганізавана наведванне ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі сталіцы. Выканаўчы дырэктар Міжнародай асацыяцыі менеджменту нерухомасці ў Беларусі Генадзь Калёнаў пазнаёміў падлеткаў з такой прафесіяй як хаус-майстар, які адказвае ў Германіі за ўтрыманне шматкватэрнага дома і тэрыторыі, што да яе прылягае. Наведванне экапарку, аграсядзібы, Цэнтральнага батанічнага саду, бізнес-трэнінгі і семінарскія заняткі — літаральна кожны дзень быў насычаны для ўдзельнікаў міжнароднай змены цікавымі падзеямі і мерапрыемствамі.

— Мы не зараблялі грошай, не працавалі на прадпрыемствах, затое вучыліся працаваць на зямлі, рабілі навакольны свет крыху лепшым, рэалізуючы ўласны патэнцыял і ўкладваючы ў агульную справу часцінку сваёй душы, — дзеліцца сваімі ўражаннямі Ганна Дасько. — Сваімі рукамі мы стваралі маленькі цуд для іншых...

■ Пакаленне XXI

У МАЛАДЗЁЖНАЙ СТАЛІЦЫ — СТУДЭНЦКАЕ СВЯТА

Урачыстая цырымонія перадачы сімвалічнага ключа ад маладзёжнай сталіцы пройдзе сёння ў Баранавічах.

Маладзёжная сталіца Беларусі — праект, які быў прапанаваны ў Год моладзі.

— Мы доўга выбіралі з усіх прэтэндэнтаў (а на гэтае званне прэтэндавалі першапачаткова 35 гарадоў) самы маладзёжны, цікавы, займальны, адукацыйны і спартыўны горад. Конкурсны адбор ажыццяўляўся на падставе многіх крытэрыяў, у прыватнасці ўлічваліся колькасць моладзі ў населеным пункце, добраўпарадкаванне тэрыторыі горада, магчымасці для атрымання якаснай адукацыі, баўлення вольнага часу моладдзю і іншыя. У досыць складанай барацьбе перамог горад Баранавічы, — падкрэслівае **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК**.

Журы былі прэзентаваны шматлікія месцы для баўлення вольнага часу — усе паркавыя зоны горада (летась у Баранавічах адкрыўся парк моладзі «Натхнёныя Перамогай»), стадыён па хакеі на траве «Дубава-Спорт» і стадыён «Лакаматыў», Лядовы палац, вастраў закаханых у Паўночным мікрараёне... Абсалютным пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года — 2014» стала пяцікурсніца Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандра Малаканава, што таксама ўвайшло ў залік...

— Маладзёжная сталіца падорыць краіне шмат цікавых праектаў, — паабяцаў Віктар Якжык. — Сярод мерапрыемстваў, якія пройдуць у 2016 годзе, — «Збяры Беларусь у сваім сэрцы», «Лідар года», «Малады спецыяліст», форум «Фестываль маладзёжнай навукі», выставы «100 ідэй для СНД», іншыя буйныя і крэатыўныя праекты.

Учора ў маладзёжнай сталіцы адкрыўся Рэспубліканскі студэнцкі форум «Моладзь — надзея і будучыня Беларусі», які сабраў прадстаўнікоў 43 ВНУ.

Плануецца, што два дні юнакі і дзяўчаты будуць абмяркоўваць праблемы, праекты і ініцыятывы. У горадзе арганізавана дзейнасць культурна-асветніцкіх, эколага-турыстычных і спартыўных пляцовак. Пройдзе маладзёжны танцавальны флэш-моб «Мы з табой разам», фотаконкурс мабільнай фатаграфіі, спаборніцтвы па камп'ютарных гульнях, інтэрактыўны бліц-праект «Рэцытацыя. Багдановіч». Адбудзецца падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам адукацыі, Баранавіцкім гарвыканкамам і Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ) аб далучэнні Баранавіч да міжнароднай ініцыятывы «Горад, дружалюбны да дзецей». А ў Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце будзе арганізаваны адкрыты дыялог «Залог поспеху краіны — поспех моладзі» з удзелам міністра адукацыі Міхаіла Жураўкова.

Да слова, званне «маладзёжная сталіца» — пераходнае, і за яго ў будучыні зможа пазмагацца любы абласны ці раённы горад Беларусі

КЛАСНЫЯ НАВІНЫ

Вучыцца... у любым зручным месцы

На хімічным факультэце Белдзяржуніверсітэта ўкаранілі ўнікальныя для Беларусі інавацыйныя тэхналогіі адукацыі — лекцыйны падкастынг і відэалабараторныя работы. Гэта зусім новая мадэль арганізацыі навучальнага працэсу, якая дапаможа павысіць эфектыўнасць самастойнай пазааўдыторнай і аўдыторнай працы студэнтаў.

Інавацыйны падыход да правядзення заняткаў прадугледжвае стварэнне падкастаў — гукавых або відэафайлаў, якія транслююцца ў інтэрнэце. На хімічным факультэце выбраны фармат «аўдыё + слайд-шоу» і «аўдыё + відэа + слайд-шоу». Скарыстаная тэхналогія дазваляе пры жаданні прыбраць відэа і сканцэнтравацца толькі на слайдах з каментарыямі выкладчыка. У модулі ёсць навігацыя і пошук па словах. Напрыканцы кожнай лекцыі прысутнічае закладка «тэсціраванне», якая дазваляе студэнтам самастойна правяраць свае веды.

Падкасты — выдатны дадатак да традыцыйных лекцый, паколькі актыўна выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў і экзаменаў. Перавагай метаду з'яўляецца магчымасць паўторнага праслухоўвання лекцый. Студэнт можа неабмежаваную колькасць разоў праглядаць матэрыялы цалкам або па частках у розны час і ў любым месцы. Таксама можна дыстанцыйна асвоіць тэму і пры неабходнасці вярнуцца да яе тлумачэння. Асабліва карысная сучасная тэхналогія для запісу лекцый запрошаных выкладчыкаў.

Інавацыі былі ўкаранёны і пры правядзенні лабараторных практыкумаў для будучых хімікаў. Створаны відэафільмы, у якіх паслядоўна дэманструецца выкананне лабараторных работ самімі студэнтамі. Пры гэтым наглядны матэрыял суправаджаецца аўдыятэкстам з падрабязным апісаннем дзеянняў, тэарэтычнымі палажэннямі і формуламі, неабходнымі для выканання працы..

— Нельга скідваць з рахункаў той факт, што цяперашняе пакаленне маладых людзей — гэта пакаленне інтэрнэту. Таму трэба змяніць ролю выкладчыка і стварыць умовы, якія дазволяць яму адмовіцца ад крэйды і дошкі і пачаць выкарыстоўваць электронныя прадукты, напрыклад створаныя на платформе Web 2.0, — дзеліцца сваім поглядам **намеснік дэкана хімічнага факультэта БДУ Таццяна САВІЦКАЯ**.

Распрацаваныя падкасты і відэалабараторныя работы даступныя на спецыялізаваных сайтах хімічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта — «Інавацыйныя тэхналогіі ў адукацыі», «Зялёная хімія», а таксама на электронным партале ядзерных ведаў устаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь (http://lar.inpnet.net/el/belnet/)

Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Невядомае пра вядомых

КАЛІ ТАТА — НАРОДНЫ ПІСЬМЕННІК

СЁННЯ Ў КРАІНЕ АДЗНАЧАЕЦЦА 95-ГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ІВАНА ШАМЯКІНА

Таццяна і Алеся Шамякіны, дочкі знакамітага празаіка, народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна — сёння вядомыя навукоўцы. Таццяна Іванаўна — доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры Белдзяржуніверсітэта. Яе малодшая сястра, Алеся Іванаўна — вядомы тэкстолаг, кандыдат філалогіі, супрацоўніца Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі. Як навукоўцы яны даследуюць спадчыну бацькі, апякуюцца выданнем яго твораў, зберагаюць архіў і багатую бібліятэку Івана Пятровіча. Але калісьці і яны былі маленькімі дзяўчынкамі, стаялі перад выбарам прафесіі і лёсу.

Якім бацькам, чалавекам быў Іван Шамякін? Ці паўплывала яго асоба на выбар прафесіі дзецьмі і нават унукамі? Якія таямніцы і сёння хавае архіў знакамітага празаіка? На гэтыя і многія іншыя пытанні падчас сустрэчы з карэспандэнтам «Звязды» адказваюць Таццяна і Алеся Шамякіны.

ВЫХАВАННЕ ПА-ШАМЯКІНСКУ

— Наш бацька ў сям'і быў абсалютна не строгі. Мяккі, рахманы, добразычлівы да людзей, — дзеліцца ўспамінамі Таццяна Іванаўна. — Мы ж, як кажуць, «на галовах хадзілі». Вечны гвалт, размовы, музыка... Бацька лічыў, што дзеці павінны свабодна развівацца. Унукаў вельмі любіў, з выключным замілаваннем да іх ставіўся, ледзь не да слёз расчульваўся, чуючы цікавае дзіцячае маўленне ці назіраючы за гульнямі.

— Сапраўды, — дадае Алеся Шамякіна. — Тата быў ліберальны чалавек, умеў па-добраму растлумачыць, даць параду. Ён нават рэжым сваёй працы падладжваў пад дзяцей. Калі мы былі малыя ці ў хаце гадаваліся ўнукі, працаваў па начах, з-за чаго сапсаваў сабе здароўе. Калі дзеці падраслі, крыху змяніў графік. Пісаў з раніцы і ўдзень, прыкладна з дзесяці да двух, а ўжо потым ехаў па справах у Саюз пісьменнікаў ці на працу ў выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя», дзе быў галоўным рэдактарам. Начамі многа чытаў. Ды і дзеці яму ніколі не перашкаджалі пісаць. Тата ў кабінеце зачыняўся, але на ключ дзверы ніколі не замыкаў. Можна было зайсці, паклікаць да тэлефона, звярнуцца з пытаннем.

— Як чалавек тата быў незласлівы і верны ў сяброўстве і ў каханні, — дзеліцца Таццяна Іванаўна. — Яго недахопы? Магчыма, залішняя абачлівасць, асцярожнасць, закрытасць для чужых пры ўсёй да іх добразычлівасці. Духоўнае сваё яшчэ адкрываў толькі жонцы і блізкім сябрам. Безумоўна, на працягу жыцця ён мяняўся. Я памятаю яго розным. У маладыя гады — смяшлівы, дасціпны, часта з гумарыстычным поглядам на з'явы рэчаіснасці. Любіў разам са сваім сябрам Андрэем Макаёнкам разыгрываць калег і знаёмых. Але акцёрскімі здольнасцямі, як Андрэй Ягоравіч, абсалютна не валодаў і ўвогуле быў чалавекам даволі сціплым. Губляўся перад нахабнікамі, таму проста імкнуўся іх не заўважаць. Але ўрэшце ўсім усё даравaў.

Таццяна і Алеся Шамякіны прызнаюцца: яны заўсёды разумелі, што жывуць у незвычайнай сям'і, а прафесія бацькі паўплывала і на іх выбар жыццёвага шляху.

— У раннім дзяцінстве, як толькі навучылася чытаць і пісаць, я ўжо марыла быць пісьменніцай, пісала. Нават давала чытаць свае творы бацьку, — распавядае Таццяна Іванаўна. — Калі тата ездзіў у Амерыку ў 1963 годзе, мы яму дасылалі лісты. Пасля Шамякін выдаў эсэ «Два месяцы ў Нью-Ёрку», дзе пісаў, што мае лісты былі самыя цікавыя. І пацвярджаў, што я маю літаратурныя здольнасці. Яго пахвала, заахвочванне, сапраўды, паспрыялі ў выбары прафесіі. Праўда, і мама наша таксама была філолагам. Яшчэ да вайны яна закончыла медыцынскае вучылішча і працавала ў вёсках фельчарам-акушэрам, а ўжо маючы траіх дзяцей, у пачатку 1950-х гадоў, закончыла тагачасны педагагічны інстытут, аддзяленне рускай філалогіі. Але па прафесіі ніколі не працавала: выконвала сакратарскія функцыі, дапамагала бацьку. Друкавала на машынцы тэксты, вычытвала карэктуры раманаў, чытала лісты чытачоў і ў многіх выпадках на іх і адказвала. А пасля гэтай працай займаліся і мы з Алесяй.

— У бацькі ёсць апавяданне «Выпрабаванне пачуццяў», яно пры жыцці пісьменніка не публікавалася, — распавядае Алеся Шамякіна. — Гэтае апавяданне Шамякін напісаў у Познані ў кастрычніку 1945 года, калі даслужваў у войску, і даслаў яго Васілю Вітку для публікацыі ў часопісе «Беларусь». Але Вітка па нейкай прычыне тэкст не надрукаваў, і апавяданне да 1971 года ляжала ў яго архіве. І толькі калі на юбілейным вечары з нагоды 50-годдзя бацька ў ліку настаўнікаў назваў і Вітку, той пасля імпрэзы адшукаў твор і даслаў назад Івану Шамякіну. Зараз рукапіс знаходзіцца ў сямейным архіве. Ёсць ў архіве і ліст Міхася Лынькова да Івана Шамякіна з водгукам на яго самыя першыя апавяданні, напісаныя яшчэ да вайны. Бацька даслаў іх у часопіс «Полымя». Творы таксама не былі надрукаваныя, але Лынькоў напісаў падрабязны разбор гэтых тэкстаў. Бацька пранёс ліст праз усю вайну, збярог.

Іван Шамякін з жонкай Марыяй і дачкой Таццянай, канец 1940-х.

Дарэчы, філалагічныя і сумежныя спецыяльнасці абралі і ўнукі Івана Шамякіна. Старэйшы, сын Ліны Іванаўны, скончыў гістарычны факультэт, дочкі Таццяны Іванаўны — філолагі, абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Толькі сын Алесі Іванаўны вырашыў стаць юрыстам. Адзінае, што крыху бянтэжыла Шамякіна, — творчыя перавагі ўнучкі Марыі. Ён яшчэ заспеў час, калі яна стала сябрам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Увесь час угаворваў Марыю, каб пісала рэалістычныя творы, а яна... звярталася да містычнай паэзіі і фантастычнай прозы.

ТАЯМНІЦЫ СЯМЕЙНАГА АРХІВА

Частку свайго архіва Іван Шамякін сам перадаў у Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, але асноўную масу дакументаў, лістоў, дзённікаў, багатую бібліятэку бацькі сёння зберагае Алеся Іванаўна. І там знаходзяцца сапраўды ўнікальныя дакументы.

Darэчы, Дарэчы, праца па разборы архіва Івана Шамякіна яшчэ працягваецца. І часам у ім трапляюцца сапраўды незвычайныя знаходкі, якія з новага боку раскрываюць творчую індывідуальнасць пісьменніка. Так, напрыклад, колькі гадоў таму былі выяўленыя раннія... вершы Шамякіна.

— Яны ніколі пры жыцці бацькі не друкаваліся, ды сам пісьменнік ніколі пра іх не згадваў. Не так даўно гэтыя вершы былі надрукаваныя ў часопісе «Полымя», нават літаратуразнаўцы здзівіліся такому адкрыццю і адзначылі, што Шамякін быў нядрэнным паэтам, — дзеліцца Таццяна Іванаўна і дадае: — Магчыма, нас чакаюць і новыя нечаканыя знаходкі. Гэта тычыцца перадусім ліставання. У бацькі былі прыяцелі ў Маскве, Ленінградзе, Кіеве, ён ліставаўся з многімі выдатнымі творцамі. Да яго прыязджалі нават кітайскія перакладчыкі. Чамусьці ў Кітаі вельмі палюбілі творы Шамякіна, пераклалі і выдалі практычна ўсе самыя значныя раманы і аповесці.

СЯБАР І КАЛЕГА

Сёстры ўспамінаюць, што ў хаце заўсёды было шмат гасцей — беларускіх, расійскіх, украінскіх пісьменнікаў, перакладчыкаў. Калегі нават прыдумалі адмысловую сістэму: калі з'яўляліся новыя выданні, яны ішлі не ў кнігарню, а ў госці, абменьваліся кнігамі з аўтографамі. Было ў Івана Пятровіча многа гасцей з маскоўскіх выдавецтваў, рэдакцый газет, часопісаў: Шамякін доўгі час з'яўляўся членам праўлення маскоўскага выдавецтва «Советский писатель». Таму чытаў шмат рукапісаў, пісаў мноства рэцэнзій — проста не мог адмовіць, калі прасілі.

Але былі ў яго асабліва блізкія сябры. Алеся Іванаўна распавядае:

— Вельмі доўга існавала адмысловая чацвёрка: бацька, Андрэй Макаёнак, Аляксей Кулакоўскі і Пятро Васілеўскі. У пачатку 2000-х Галіна Васілеўская нават выдала кнігу «Іх было чацвёра». Але сяброўства распалася пасля таго, як Пятро Васілеўскі ў сярэдзіне 1960-х зняў фільм «Рагаты бастыён» па п'есе Макаёнка «Лявоніха на арбіце». Драматурга стужка не задаволіла, ён быў вельмі катэгарычны і пасварыўся з даўнім таварышам. Потым і Кулакоўскі пачаў менш сустракацца з сябрамі. Таму з чацвёркі сябраваць засталіся толькі бацька і Макаёнак. Часта бываў у нас у гасцях паэт Анатоль Грачанікаў, тата быў у добрых адносінах з Барысам Сачанкам, Іванам Чыгрынавым, Максімам Танкам, Піменам Панчанкам, Пятром Глебкам, Петрусём Броўкам.

Таццяна Шамякіна дадае:

— Моцна сябравалі Іван Шамякін і Іван Навуменка — мы ж былі суседзямі. Тата не толькі ўмеў сябраваць, дапамагаў калегам і сваякам, але і пакінуў добрыя ўспаміны пра літаратараў. Калі яны былі сабраныя разам у адным томе нядаўна выдадзенага збору твораў, то аказалася, што ў беларускай літаратуры за паўстагоддзя ніхто больш не напісаў пра сваіх калег, як Шамякін. З добразычлівасцю, аналізам творчасці, раскрыццём рыс характару.

Сёстры распавялі, што Іван Шамякін быў не толькі выдатным пісьменнікам, добрым сябрам, але і надзвычай паспяховым дзелавым чалавекам. Ён дваццаць шэсць гадоў з'яўляўся першым сакратаром Саюза пісьменнікаў Беларусі і дзесяць гадоў (усе 1980-я) узначальваў выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі». І пры ім гэтыя арганізацыі літаральна квітнелі. Без махлярскіх прыёмаў, без уціску, мякка, добразычліва, ён умеў «выбіваць» з чыноўнікаў розных рангаў фонды, будаўнічыя матэрыялы, дэфіцытнае абсталяванне, мэблю, паперу... Так, у ліку самых значных праектаў, якімі апекаваўся Шамякін, можна назваць будаўніцтва Дома літаратара на Фрунзэ, 5, арганізацыю паліклінікі для пісьменнікаў спачатку ў цокалі Саюза пісьменнікаў па вуліцы Энгельса, потым побач з Домам літаратара, будаўніцтва Дома творчасці «Іслач».

Іван Шамякін з дачкой Алесяй і ўнукам Алёшам (1973).

З ЧАГО ПАЧАЦЬ ЗНАЁМСТВА?

Сёння можна пачуць меркаванне, што творы Івана Шамякіна несучасныя, што сам празаік — тыповы прадстаўнік сацыялістычнага рэалізму. Але для яго дачок кожны тэкст бацькі — адметны, бо звязаны з сямейнымі ўспамінамі пра той час, калі ён быў напісаны. Ды і сапраўднае мастацтва, на самай справе, не старэе, а з часам набывае новыя ноты, прачытваецца па-іншаму.

— Мой любімы твор — «Трывожнае шчасце», таксама як і ў самога Шамякіна, — прызнаецца Таццяна Іванаўна. — Можа быць, таму, што я назірала яшчэ дзяўчынкай, як распачыналася работа над аповесцю «Непаўторная вясна» — першай часткай пенталогіі. Напэўна, гэта было адно з самых шчаслівых ле-

Іван Шамякін з акадэмікам Віктарам Каваленкам (1984).

таў нашай сям'і, якое мы праводзілі ў Церусе, што на Гомельшчыне, на радзіме маці. Тады да бацькоў нават вярнуліся нейкія юнацкія пачуцці, хоць прайшло ўжо больш як паўтара дзесяцігоддзя ў шлюбе. Было прыгожае лета, добразычлівая атмасфера, мы, тады яшчэ малыя дзеці, радаваліся... Калегі па кафедры адзначаюць, што аповесці Шамякіна, напісаныя ў 1990-я гады, — надзвычай цікавыя і найлепш распавядаюць пра гэты час. А я іх не люблю! Ніколі не рэкамендую

Іван Шамякін на лецішчы ў Ждановічах (1980-я).

студэнтам. Можа быць, таму, што тыя гады ўвайшлі ў свядомасць як надзвычай жахлівыя, цяжкія.

А вось Алеся Іванаўна сваімі любімымі творамі называе раманы «Сэрца на далоні», «Атланты і карыятыды» і «Вазьму твой боль». Школьнікам параіла б звярнуцца да пенталогіі «Трывожнае шчасце» і рамана «Сэрца на далоні», студэнтам жа рэкамендуе звярнуць увагу на аповесць «Ах, Міхаліна, Міхаліна», дзе ідзе гаворка пра жыццё школьных настаўнікаў.

ЗБОР ТВОРАЎ. ЦІ ПОЎНЫ?

Не так даўно ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» завяршыўся надзвычай важны і маштабны праект. Пабачыў свет збор твораў Івана Шамякіна ў 23 тамах. Чым ён цікавы для чытачоў? Па меркаванні Алесі Іванаўны, збор значны тым, што тут можна прачытаць творы, якія раней ці зусім не друкаваліся, ці з'яўляліся толькі ў выглядзе часопісных публікацый. Яна зазначае: — «Гэта, напрыклад, апавяданне «Чалавек з Бізоніі». Ці самы першы бацькаў твор на сур'ёзную тэму — «Снежная пустыня», яго Іван Пятровіч напісаў у 1944 годзе на руска-фінскім слоўніку. Але гэты слоўнік, на жаль, не захаваўся. У архіве ёсць толькі другі аўтограф апавядання, напісаны ўжо на звычайнай паперы. Там ужо пазначаны даты і месца: 1944—1946 гг., Мурманская вобл., Пракопаўка».

— У Зборы твораў, у прадмовах і пасляслоўях да кожнага тома — вельмі добры аналіз творчасці Шамякіна, — дадае Таццяна Іванаўна, — Апавяданні разгледзела мая малодшая калега Таццяна Бельская, дачка знакамітага літаратуразнаўцы, акадэміка Віктара Каваленкі, які таксама ў свой час вывучаў творчасць нашага бацькі. На высокім прафесійным узроўні выкананы аналіз твораў Шамякіна акадэмікамі Уладзімірам Гніламёдавым і Міхасём Мушынскім. Гэта літаральна новае слова пра прозу бацькі. Самі навукоўцы прызналіся, што па-новаму прачыталі раманы і аповесці, многае для сябе адкрылі, ужо зірнуўшы на тэксты з дыстанцыі часу.

Лічыцца, што 23-томнік — гэта поўны збор твораў Івана Шамякіна. Але насамрэч гэта не так. Алеся Іванаўна падлічыла: калі б яго спадчына прадстаўлялася поўна, то атрымалася б не 23, а 29 тамоў. Таму можна спадзявацца, што нас яшчэ чакаюць новыя адкрыцці.

Марына ВЕСЯЛУХА.
Фотаздымкі з сямейнага архіва Таццяны і Алесі Шамякіных

■

■ На свае вочы

ХТО НАЧАМІ ПАЛЮЕ... ЗА КНІГАМІ

Яшчэ некалькі гадоў таму, калі з'явіліся электронныя кнігі, многія сцвярджалі, што век папяровых выданняў падыходзіць да свайго канца. Але час зноў паказаў супрацьлеглае — звычайныя кнігі па-ранейшаму набываюць для сябе, дораць, збіраюць. Хіба толькі шукаць рэдкія выданні ўжо не прыходзіцца. Ды і новыя кніжныя крамы з'яўляюцца адна за адной. У іх, дарэчы, ёсць і альтэрнатыва. Напрыклад, кніжныя выставы, якія праводзяцца ўвесь год. Адна з самых папулярных — начная, якая штотыдзень праводзіцца ў спарткомплексе «Дынама». Карэспандэнты «Звязды» запасліся кавай і наведаліся ў будынак комплексу, каб даведацца пра цэны і паназіраць за публікай.

Мы прыязджаем да будынка, у якім праводзіцца выстава, роўна апоўначы. На паркоўцы амаль няма вольных месцаў — пэўна, большасць пакупнікоў прыязджае сюды на ўласных аўто.

У гандлёвай зале не аншлаг, але людзей дастаткова, не менш за сотню. На змену тым, хто выходзіць з выставы з пакупкамі, адразу прыходзяць іншыя. А вось прадаўцоў не так шмат — хапае вольных месцаў і пустых сталоў. Відаць, у першыя пасляназагоднія тыдні кнігамі не вельмі цікавяцца. Публіка самая розная: ад школьнікаў і студэнтаў да пенсіянераў. Пераважаюць, праўда, якраз людзі сталага ўзросту.

— Цяпер не лепшая фінансавая сітуацыя ды і не кніжны час, — пацвярджае думку жанчына, якая гандлюе часопісамі. — Новыя пачкі нават не распакоўваю, усё адно не разбяруць, таму пакуль што ў продажы толькі старыя нумары.

Прыглядаемся да асартыменту. Насамрэч, кніжнай выставу можна назваць з нацяжкай. Чаго тут толькі няма, але кнігі ў традыцыйным разуменні (мастацкая, навукова-папулярная і публіцыстычная літаратура) яўна не ў прыярытэце. Шмат канцылярскіх прыладаў: блакнотаў, запісных кніжак, ручак, календароў, штодзённікаў. Цэны, трэба сказаць, сапраўды вельмі дэмакратычныя: запісныя кніжкі, падобныя да славутых Moleskine, за 10—15 тысяч рублёў тут не рэдкасць.

Яшчэ адзін папулярны кірунак — дзіцячыя выданні. Пэўна, кожны трэці шапік на выставе гандлюе таварамі для дашкольнікаў: налепкамі, размалёўкамі, наборамі для творчасці. Шмат кніг для аматараў бісерапляцення, іншых відаў рукадзелля. Ну і традыцыйныя вучэбныя дапаможнікі для школьнікаў: атласы, контурныя карты, задачнікі і матэрыялы для падрыхтоўкі да ЦТ — каля іх таксама збіраюцца чэргі.

Толькі праз 10 хвілін візіту знаходзім першы стэнд з мастацкай літаратурай. Прадаюць у асноўным сусветную класіку, але найбольш хадавы тавар, паводле слоў прадаўца, біяграфіі і ўспаміны славутых людзей. Цэны, як у букіністычных крамах. Скажам, «Сто гадоў адзіноты» Габрыэля Гарсія Маркеса ў пераплёце можна набыць усяго за 45 тысяч. Бяспройгрышны варыянт — усе кнігі пра Гары Потэра аўтарства Джаан Роўлінг. За сем такіх кніжак (усе часткі) просяць 770 тысяч. Галоўныя бестселеры для дарослых — кнігі, паводле якіх здымаюць фільмы ў Галівудзе. Напрыклад, нашумелы «Марсіянін» амерыканца Эндзі Уіра, які абыдзецца ў 75 тысяч.

У іншым кіёску цэны вышэйшыя. З размовы з прадаўцом разумею, што гэта не адзіная яго кропка. Іншая працуе ўдзень. Пры гэтым мужчына сцвярджае, што на начную выставу

Фота Надзеі БУЖАН.

прыходзіць не нашмат менш людзей, чым на звычайную. Па яго словах, мастацкую літаратуру бяруць добра, а невысокая колькасць канкурэнтаў толькі ідзе на карысць. Разглядаю цэннікі. «Імя ружы» Умберта Эка — 160 тысяч, некалькі твораў Чарльза Букоўскі пад адной вокладкай — 150. Даражэй, чым у суседзяў, але танней, чым у большасці кніжных крам, у тым ліку анлайнавых.

Найгоршае, што кідаецца ў вочы, — поўная адсутнасць літаратуры беларускай. Адзінае, што ўдалося знайсці, — некалькі зборнікаў Васіля Быкава, ды і то ў перакладзе на рускую мову. Нават кніг Святланы Алексіевіч, якія не будуць мець праблем з попытам, тут не знайшлося.

Абыходзім апошнія стэнды. Цешымся друкаванай прадукцыяй на любы густ: карты таро, кнігі пра індуізм і ёгу, ведычная літаратура. Зусім побач — кнігі ў стылі «Як дамагчыся поспеху» і «Парады бізнесменаў»... Некалькі сталоў застаўлены кампакт-дыскамі з кінафільмамі і музыкай. Хапае і перыёдыкі: самыя розныя часопісы, у тым ліку старыя, якіх ужо не знойдзеш у продажы, і нават зборнікі сканвордаў. Шапік з амулетамі і ўпрыгажэннямі зноў застаўляе сумнявацца, ці кніжная гэта выстава. Але стэнд, цалкам прысвечаны дэтэктывам расійскіх аўтараў (прывітанне, 1990-я!), здымае пытанні.

— Мяне нельга назваць пастаянным наведвальнікам начной выставы, — распавядае праграміст Вячаслаў Сарока, трымаючы ў руках дзве новыя кнігі. — Апошнім разам прыходзіў гады два таму. Сёння давялося ехаць, бо шукаў канкрэтныя кнігі, у іншых месцах іх няма. Гэта фантастыка: расійскі пісьменнік Раман Злотнікаў і амерыканец Пітэр В. Брэт. Такія кнігі цяжка «ўпаляваць» пасля іх выхаду, а па такіх цэнах — дык увогуле немагчыма. Таму ў начной выставы хапае пераваг. Толькі што дабірацца цяжка...

Маладая маці Аліна Бурко прыйшла сюды па кнігі для сваіх сыноў:

— Мы жывём блізка, таму я часта сюды заходжу. Даведалася пра выставу, калі заўважыла велізарную чаргу каля ўвахода. З цікаўнасці падышла, цяпер вось сама ў ліку пастаянных наведвальнікаў. Набываю сваім хлопцам часопісы, якія прадаюцца разам са зборнымі мадэлямі. Купілі першы нумар і цяпер не можам спыніцца. Я родам з Бабруйска, і сябры часта просяць пашукаць тут мастацкую літаратуру, якая там не прадаецца, — вось я і хаджу са спісам. Сёння, праўда, людзей няшмат, а вось перад святамі сюды было не прабіцца. Выбралася з выставы толькі каля трох гадзін, і тое таму, што змарылася ад колькасці людзей наўкол. За некалькі гадоў разазнаёмілася з прадаўцамі, таму прыходжу яшчэ і пагутарыць пра новыя кнігі, гэта цікава.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

■

■ Уласнае жыллё

ПА РЫНКАВЫМ КОШЦЕ

Цяпер у прыватызацыі ўзаконілі незалежную ацэнку

Аб удасканаленні працэдуры прыватызацыі жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду гаворыцца ва Указе кіраўніка дзяржавы № 25, які спрашчае механізм вызначэння кошту жылых памяшканняў для мэт прыватызацыі.

Як ужо паведамляла «Звязда», гэтым дакументам уносяцца змены ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 524 «Аб прыватызацыі жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду», якія прадастаўляюць права грамадзяніну, калі апошні не згодны з разлічаным у адпаведнасці з жыллёвым заканадаўствам ацэначным коштам жылога памяшкання, самастойна звяртацца па правядзенне незалежнай ацэнкі рыначнага кошту жылога памяшкання, якое прыватызуецца.

Кошт незалежнай ацэнкі кампенсуюць не заўсёды

У каментарыі Дзяржкаммаёмасці да гэтага ўказа гаворыцца, што цяпер грамадзянін да прыняцця рашэння аб прыватызацыі жылога памяшкання абавязаны ў пяцідзённы тэрмін з дня заключэння дагавора на аказанне паслуг па правядзенні незалежнай ацэнкі паведаміць пра гэта ў дзяржаўны орган, надзелены правам на прыняцце рашэння аб прыватызацыі. Рыначны кошт жылога памяшкання вызначаецца на дату ацэнкі, але не раней за дату агляду аб'екта ацэнкі. Надалей прыватызацыя жылога памяшкання будзе ажыццяўляцца па найменшай з разлічаных цэнаў (ацэначнай альбо рыначнай).

Указам таксама прадугледжана падаўжэнне тэрміну ажыццяўлення адміністрацыйнай працэдуры па прыняцці рашэння аб прыватызацыі жылога памяшкання ў выпадку правядзення незалежнай ацэнкі рыначнага кошту да двух месяцаў.

Вырашаецца прынятым дакументам і пытанне ўлічвання выдаткаў на правядзенне такой ацэнкі. Цяпер, калі жыллё прыватызуецца па рыначным кошце, то аплату паслуг па правядзенні незалежнай ацэнкі ўласніку кампенсуюць. Калі рыначная цана будзе большай за ацэначную, тады і кампенсацыі не будзе.

Спіс ацэншчыкаў з'явіцца на сайце камітэта

Цікавая навіна, але ў чытачоў газеты адразу ўзніклі слушныя пытанні. Напрыклад, у якія арганізацыі цяпер можна звяртацца па незалежную ацэнку свайго жылля, колькі гэта звычайна каштуе і як хутка яе зробяць?

Начальнік управўлення ацэнкі Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Дзіна САКАЛОЎСКАЯ паведаміла карэспандэнту «Звязды», што падобнага канкрэтнага спіса арганізацый, якія займаюцца рыначнай ацэнкай жылля, пакуль не існуе. У хуткім часе ён будзе сфарміраваны і размешчаны на сайце камітэта. Між іншым, адпаведныя аддзелы ацэнкі існуюць ва ўсіх прадпрыемствах па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры (былыя БРТІ). У іх ёсць філіялы амаль ва ўсіх раёнах краіны. Такія аддзелы рыначнай ацэнкі жылля існуюць на прадпрыемствах Гандлёва-прамысловай палаты (ГПП), на базе Інстытута нерухомасці і ацэнкі з яго дачыннымі прадпрыемствамі ў Віцебску, Гомелі і Гродне.

Зразумела, што гаворка ідзе аб выключна камерцыйных арганізацыях, але... Так, паводле слоў суразмоўцы, агучаныя структуры сапраўды самастойна зарабляюць грошы на сваё функцыянаванне і развіццё. Бюджэтнага фінансавання тут няма. Разам з тым гэтыя прадпрыемствы нельга назваць нейкай «прыватнай лавачкай», бо ў большасці (акрамя філіялаў ГПП) яны з'яўляюцца акцыянернымі таварыствамі, дзе доля дзяржавы складае 100%.

Указ «разруліць» нестандартныя сітуацыі

Як такія новаўвядзенні выглядаюць на практыцы, калі карыстальнік жылля не згодны з ацэначным коштам гэтага памяшкання? Паводле слоў Дзіны Сакалоўскай, у гэтым выпадку будучы ўладальнік кватэры паведамляе ў камісію па прыватызацыі аб намеры рабіць рыначную ацэнку, ажыццяўляе яе і падае ў камісію адпаведны дакумент. Калі рыначны кошт будзе меншы за ацэначны, то камісія ўносіць змены ў раней прынятае рашэнне аб прыватызацыі.

Зразумела, што на голым месцы гэты дакумент не нарадзіўся. Часам людзі былі не задаволены коштам жылля па ацэнцы камісіі і ў адпаведнасці з жыллёвым заканадаўствам. Кіраўнік управўлення адзначае, што памылак у разліках камісіі і не было, але ацэначны кошт у асобных выпадках аказваўся сапраўды вельмі вялікім. Больш за тое, камісіі часам не маглі адшукаць аналагічны аб'ект для параўнання, каб перайсці да адпаведнай нормы заканадаўства і заказаць рыначны кошт жылля.

Калі неабходна атрымаць рыначны кошт жылля за 10 дзён, то трэба будзе заплаціць 960 тысяч рублёў, а калі за 5 дзён актыўнай працы — то 1 млн 400 тысяч рублёў.

Такія сітуацыі ўзнікалі часцяком па будынках пасля мадэрнізацыі. Напрыклад, калі раней быў ФАП ці інтэрнат, а іх перарабілі ў жылы дом. Зразумела, што канчатковыя выдаткі па такіх аб'ектах складваліся даволі высокія, а аналагаў не было. Цяпер рыначная ацэнка такога жылля абавязкова расставіць усе кропкі над «і».

Дакумент сталіцу не «зачэпіць»

Між іншым, падобная незадаволенасць коштам будучага прыватнага жылля сустракаецца і ў буйных гарадах краіны. Былі выпадкі, калі за прыватызацыю жылля неабходна было заплаціць 38-40 млн рублёў, але людзі адмаўляліся гэта рабіць, бо лічылі, што дорага. Потым заказвалі рыначную ацэнку, па якой кошт жылля аказваўся нават большым. А ў выніку кліент нічога не дабіваўся па канчатковай цане прыватызацыі; акрамя таго, у прыватызацыі не ўлічваліся выдаткі чалавека на правядзенне незалежнай ацэнкі.

Мы патэлефанавалі ў аддзел экспертызы і ацэнкі Мінскага агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. Там нам паведамілі, што, сапраўды, нормы згаданага ўказа распаўсюджваюць сваё дзеянне на жыллёвы сектар Мінска на мінімальным узроўні. Цяпер рыначны кошт жылля ў сталіцы будзе абавязкова большым за ацэначны, што разлічваецца па нарматывах Мінбудархітэктуры. Дарэчы, у сталіцы падобную рыначную ацэнку кватэр робяць звычайна на працягу 5 дзён, а каштуе такая паслуга каля 800 тысяч рублёў.

У рэгіёнах паслугі ацэншчыкаў даражэйшыя

У Баранавіцкім філіяле Брэсцкага агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і кадастры таксама існуе аддзел ацэнкі нерухомасці. Там нам паведамілі, што яны пакуль дакладна не ведаюць, якім чынам будуць працаваць па нормах новага ўказа. У найбліжэйшы час яны павінны атрымаць адпаведныя інструкцыі.

Рыначная ацэнка жылля для прыватных асоб у іх робіцца на працягу 15 працоўных дзён. Каштуе такая працэдура 800 тысяч рублёў плюс 60 тысяч на транспартныя выдаткі па горадзе. Выезд спецыяліста ў вёску ці іншы населены пункт будзе каштаваць даражэй — у залежнасці ад адлегласці да аб'екта. Больш за ўсё памер тарыфу падобнай ацэнкі залежыць ад хуткасці выканання пастаўленай задачы. Так, калі неабходна атрымаць рыначны кошт жылля за 10 дзён, то трэба будзе заплаціць 960 тысяч рублёў, а калі за 5 дзён актыўнай працы — то 1 млн 400 тысяч рублёў. А для сельскага жыхара сёння гэта ўжо сур'ёзныя грошы.

На прыватызацыю засталося 5 месяцаў

Напрыканцы нагадаем, што тэрмін прыватызацыі любых жылых памяшканняў фізасобамі скончыцца сёлета да 1 ліпеня. Спецыялісты Белстата падлічылі, што цяпер у краіне не прыватызавана каля 8 працэнтаў аб'ектаў дзяржаўнага жыллёвага фонду, што падлягаюць прыватызацыі.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Парады спажыўцу

СПАЧАТКУ МЯСАРУБКУ ЛЕПШ ПАМАЦАЦЬ

Гэты агрэгат даўно стаў нязменным атрыбутам кожнай кухні. І хоць класічныя ручныя мясарубкі выпускаюцца і дагэтуль, усё ж будзем улічваць сучасныя тэндэнцыі. Мадэляў электрычных апаратаў у нас хапае на любы густ — ад ультрабюджэтнікаў за некалькі соцень тысяч рублёў, якія ўмеюць толькі круціць мяса, да экзэмпляраў за некалькі мільёнаў, якія могуць усё.

Мясарубка мусіць абавязкова мець абмежавальнік гранічнай магутнасці. Ён выключыць агрэгат тады, калі цвёрды кавалак мяса ці костачкі ў ім аказаліся яму «не па зубах». Інакш можа зламацца электрарухавік ці дэфармавацца механічныя часткі.

На гэтым этапе адсеяліся лічаныя мадэлі з 273 прадстаўленых у айчынным гандлі. У асноўным гэта прадукцыя малавядомых кітайскіх фірмаў, якая вылучаецца зусім невялікай цаной у раёне 600 тысяч рублёў. Ды і ў камплекце да іх ідуць толькі таркі і дыскі для шаткоўкі. А прыгатаваць, скажам, хатнюю каўбасу з іх дапамогай ужо не атрымаецца.

Важная характарыстыка для мясарубкі — наяўнасць рэверсу. Гэта магчымасць кручэння шнэка — часткі мясарубкі, на якую прымацоўваюцца рэжучыя нажы і якая адначасова транспартуе масу, што апрацоўваецца, да іх — у процілеглым кірунку. Спатрэбіцца ён тады, калі ў мясарубцы нешта захрасла або, скажам, жыла наматалася на шнэк і не дазваляе агрэгату працаваць далей. Калі ж рэверсу няма, давядзецца апарат лішні раз разбіраць і вымаць перашкоду ўручную, на што спатрэбіцца час. З-за адсутнасці рэверсу нас пакідае ажно чвэрць мадэляў, большасць з якіх мае бюджэтны кошт у 800-900 тысяч рублёў. Гэта яшчэ некалькі кітайскіх вытворцаў і большая частка расійскіх.

Шнэк для мясарубкі мусіць быць цэльнаметалічным, як у старых савецкіх ручных апаратах, паколькі на яго прыпадае асноўны ціск падчас рабочага працэсу. Мадэлі толькі з пластыкавым шнэкам лепш не браць: ён праслужыць менш часу, і з мясарубкай раз за разам давядзецца хадзіць у сэрвісны цэнтр, што адаб'ецца на кішэні. Зрэшты, на кошце апарата матэрыял гэтай часткі адбіваецца не вельмі: недарагія мадэлі з рэверсам, абмежавальнікам магутнасці і з металічным шнэкам усё ж прадаюцца за 700-900 тысяч рублёў.

Яшчэ адзін немалаважны параметр мясарубкі — максімальная магутнасць пры блакіроўцы вала. Яна дасягаецца толькі тады, калі ў масе, што апрацоўваецца, сустрэлася нейкая перашкода, напрыклад костачка. І, каб яе перамалоць, патрабуецца значна больш высокая магутнасць. Праўда, апарат на гранічнай магутнасці можа працаваць не больш за адну хвіліну, інакш перагрэецца рухавік. Айчынны вытворца электрычных мясарубак прапануе мадэлі з максімальнай магутнасцю блакіроўкі вала ў 1500 Вт і ўсімі пералічанымі вышэй характарыстыкамі за 800—990 тысяч рублёў. У прынцыпе гэтага павінна хапіць, калі вы толькі не мелеце косткі пастаянна. У такім выпадку трэба будзе выдаткаваць на мясарубку замежнага брэнда ўжо 2-3 мільёны.

Неабавязковая, але пажаданая «фішка» мясарубкі — гэта металічны корпус. Савецкія ручныя апараты былі «незабівальныя», дзякуючы ў тым ліку і гэтай асаблівасці. Корпус з металу больш даўгавечны, але разам з тым і даражэйшы. Цана такой мясарубкі становіцца ўжо сямізначнай і моцна залежыць ад краіны — вытворцы агрэгата. Калі «кітайца» можна набыць крыху больш чым за мільён рублёў, то кошт японскіх, французскіх і нямецкіх апаратаў вышэйшы ў два-тры разы! І набыць іх за межамі Мінска не так проста. Хоць і функцыянальнасць у такіх апаратаў максімальная.

Некаторыя імпартныя мясарубкі маюць у камплекце насадку «Кебе». Спатрэбіцца яна хіба што гурманам — ужываецца для прыгатавання нафаршыраваных мяснымі шарыкамі катлетак.

А што ж айчынны вытворца? На жаль, у спісе яго мадэляў няма тых, чый корпус быў бы зроблены толькі з металу. Але прыемнай асаблівасцю стала насадка для прыгатавання хатняй каўбасы, якая ідзе ў камплекце. З ёй можна выбраць больш за дзясятак мадэляў коштам ад 670 тысяч да мільёна рублёў. Да таго ж яны аснашчаны таркамі і ўмеюць выціскаць сок з садавіны. Адным словам, добры варыянт за свае грошы.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

Што мы куплялі анлайн?

Адзін з папулярных сэрвісаў электронных плацяжоў вывучыў, як змяніліся анлайн-траты беларускіх карыстальнікаў у 2015 годзе, на якія тавары і паслугі попыт вырас, а на якія знізіўся. Высветлілася, што жыхары Беларусі сталі больш траціць на анлайн-пакупкі ў Кітаі, камп'ютарныя гульні і кнігі. Сярэдні плацеж аднаго карыстальніка вырас у паўтара раза — да 161 тысячы беларускіх рублёў (па курсе на 21.01.2016).

Самыя актыўныя пакупнікі жывуць у Мінску — летась праз электронную касу яны ў цэлым заплацілі за анлайн-пакупкі больш грошай, чым карыстальнікі з іншых рэгіёнаў. Аднак траты мінчан адносна 2014 года павялічыліся толькі на 24%. Больш за ўсё выраслі анлайн-траты карыстальнікаў з Гродна, Віцебска і Магілёва — у 2015 годзе жыхары кожнага з гэтых гарадоў сукупна патрацілі на 40% больш, чым летась.

Адна з самых папулярных у Беларусі катэгорый плацяжоў — анлайн-гульні. У мінулым годзе колькасць тых, хто плаціць за іх з дапамогай касы расійскага сэрвісу, павялічылася на 41% у параўнанні з 2014 годам, а сярэдні чэк вырас з 60 тысяч да 78 тысяч рублёў. Карыстальнікі сталі больш не толькі гуляць, але і чытаць: колькасць пакупнікоў кніг павялічылася на 21%, а сярэдні чэк — на 7%, да 159 тысяч рублёў.

У Беларусі набіраюць папулярнасць кітайскія інтэрнэт-крамы. За 2015 год колькасць карыстальнікаў, якія аплацілі анлайн-пакупкі ў Кітаі, вырасла ў 2,5 раза, а колькасць заказаў на аднаго чалавека павялічылася з 4 да 6. Найбольшая колькасць пакупак прыпала на Мінск. Самая вялікая цікавасць да кітайскіх тавараў выросла ў Віцебску і Гродне: выдаткі іх жыхароў на анлайн-заказы ў Паднябеснай выраслі на 72 і 70% адпаведна ў разліку на аднаго пакупніка.

У расійскіх жа інтэрнэт-крамах беларускія пакупнікі, наадварот, сталі рабіць менш заказаў — летась колькасць плацяжоў на аднаго чалавека знізілася з 6 да 5. Затое карыстальнікі трацілі больш — сярэдні чэк павялічыўся на 59% — да 126 тысяч рублёў. Больш актыўна за ўсё тавары з Расіі заказвалі зноў жа ў Мінску, дзе за год траты карыстальнікаў на іх падвоіліся. Сталі больш плаціць за анлайн-заказы ў РФ і жыхары Гомеля — на 33%.

■ Рабі дабро

ВАЛАНЦЁРАМ МОЖНА СТАЦЬ З 15 ГАДОЎ

Прыцягнуць работнікаў у сацыяльную сферу няпроста. Адказнасць вялікая, заробкі — невысокія. Адзін са спосабаў задаволіць попыт на сацыяльныя паслугі — развіваць валанцёрскі рух. Цяпер, напрыклад, добраахвотнікаў, якія гатовы дапамагаць сем'ям з хворымі дзецьмі, набірае Беларускі дзіцячы хоспіс. На якую працу патрэбны валанцёры і ці можна адмовіцца ад задання, расказала галоўны спецыяліст па сацыяльнай працы хоспіса Ірына БАЙДАКОВА.

Пяць кругоў на тралейбусе

Па словах Ірыны Васільеўны, пры наборы валанцёраў стаўку робяць на моладзь. Па-першае, у яе больш вольнага часу. Па-другое, наглядаць трэба за дзецьмі і падлеткамі, а тым хочацца кантактаваць з аднагодкамі.

— У кодэксе, складзеным работнікамі хоспіса, прапісана, што валанцёрам можа быць чалавек, старэйшы за 18 гадоў. Але ў летнік да нас прыязджаюць добраахвотнікі з Уэльса, Германіі, якім па15-16 гадоў. Яны добра працуюць. І мы падумалі: няўжо ў нас не настолькі адказныя падлеткі? Мы хочам, каб школьнікі, якія заканчваюць 10-ты клас, таксама выпрабавалі сябе, — кажа спецыяліст.

Калі чалавек заключае дагавор, ён пазначае, колькі гадзін са свайго вольнага часу можа прысвяціць дабрачыннасці. Лёгка знайсці валанцёраў на акцыі, якія праходзяць адзін дзень або ў выхадныя. Складаней — на змену ў летнік.

— Вядома, улетку хочацца самому куды-небудзь з'ездзіць, пападарожнічаць, — з паразуменнем ставіцца Ірына Васільеўна. — Але ёсць маладыя людзі, якія ўжо колькі гадоў свой адпачынак праводзяць не на моры, а разам з нашымі дзецьмі ў лагеры.

Ад валанцёраў, якія дапамагаюць сем'ям на даму, можа спатрэбіцца схадзіць у краму ці, пакуль маці сядзіць з дзіцем-інвалідам, завезці другога малога ў спартыўную секцыю. Бываюць і нестандартныя пажаданні. Так, адзін з хлопчыкаў, калясачнік, прасіў пакатаць яго ў трамваі ці тралейбусе. Разам з валанцёрам яны па пяць кругоў намотвалі, ездзілі з кальца ў кальцо.

Перш чым дазволіць валанцёру працаваць, з ім размаўляе псіхолаг. Бывае, што прыходзяць людзі з парушанай псіхікай. Ці фанатыкі, чыя мэта не дапамагчы дзіцяці і бацькам, а перацягнуць іх у сваю веру.

Раз на месяц маладыя людзі для сваіх падапечных арганізуюць дыскатэку. Дамаўляюцца з начным клубам, прадумваюць забаўляльную праграму (запрашаюць вучняў школ мастацтваў, курсантаў суворaўскага вучылішча, студэнтаў тэхналагічнага каледжа).

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ад валанцёраў патрабуецца розная дапамога. Напрыклад, арганізаваць канцэрт, каб падняць настрой дзецям ці сабраць сродкі ім на лекі.

— Звычайная моладзь можа наведваць дыскатэкі. А нашы дзеці там не бываюць. Адна справа прыйсці на вечар у школу (хоць іх і туды не запрашаюць), а іншая — у начны клуб, дзе свая атмасфера. Для іх гэта вялікае свята, — распавядае Ірына Байдакова.

Чакаюць таксама добраахвотнікаў, якія будуць даглядаць за дзецьмі падчас «сацыяльнай перадышкі». Гэта паслуга адновіцца ў хоспісе з чэрвеня, калі адкрыецца новы будынак.

Сем'і не хочуць шкадавання

Перш чым дазволіць валанцёру працаваць, з ім размаўляе псіхолаг. Бывае, што прыходзяць людзі з парушанай псіхікай. Ці фанатыкі, чыя мэта не дапамагчы дзіцяці і бацькам, а перацягнуць іх у сваю веру. Але такіх, кажуць, падчас гутаркі відаць адразу.

Валанцёру заўсёды тлумачаць, як паводзіць сябе ў той ці іншай сям'і. Бо адно неасцярожнае слова — і вас больш не пусцяць. Ірына Васільеўна згадвае, як адна дзяўчына вырашыла паспачуваць бацькам. Сказала: «Так шкада. За што ж вас Бог пакараў?» І ўсё. Маці патэлефанавала ў хоспіс і сказала, каб тая валанцёрка больш не прыязджала. Сем'і не хочуць шкадавання, яны чакаюць дапамогі.

Добраахвотнікаў папярэджваюць: інфармацыя пра вашых падапечных — канфідэнцыяльная. Калі вы сфатаграфаваліся з дзіцем, не выкладвайце гэта ў сеціве. Не кожныя бацькі хочуць, каб здымкі іх дзяцей былі ў інтэрнэце.

Адмовіцца ад пэўнай працы можна, калі патлумачыць прычыну. Але варта думаць не пра свае інтарэсы, а пра патрэбы дзіцяці, якому вырашыў дапамагаць.

— Памятаю, на сацыяльную перадышку прыехаў хлопчык з вёскі, — распавядае пра выпадак Ірына Васільеўна. — Ён з сабой прывёз касету для плэера, дзе былі і Кадышава, і іншыя выканаўцы. Такая зборка. Хлопец, калі яе слухаў, заўсёды ўсміхаўся. Аднойчы падыходжу, а ён сумны ляжыць. Валанцёрка кажа: «Не ведаю, што з ім. Я ўжо і кніжку пачытала, усё роўна сумуе». Прашу яе ўключыць касету. А дзяўчына кажа: «Ведаеце, я лічу, што такую музыку дзецям слухаць некарысна». Можа, і некарысна, але хлопцу яна нагадвае пра дом. Мы ж пра дзіця клапоцімся, каб яму было тут добра.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■

■ Беражыце сябе!

ЯК НЕ ТРАПІЦЬ У ПАСТКУ ВЯРБОЎШЧЫКАЎ?

У апошнія месяцы назіраецца ўсплёск спробаў вярбоўкі нашых дзяўчат у начныя клубы Паўночнага Кіпра

«Дзясяткі маладых жанчын тэлефануюць нам і кажуць, што ім праз сацыяльную сетку «УКантакце» прапануюць прывабную працу ў Паўночным Кіпры. Прычым распавядаюць свае гісторыі, як пад капірку. У іх ніхто не пытаецца, ці кваліфікаваныя яны танцоўшчыцы, ці ўмеюць рухацца наогул. Проста прапануюць прыляцець у Стамбул (туды беларусам цяпер не патрэбна віза). А пасля прыезду абяцаюць афармiць усе неабходныя дакументы і завезці ў Паўночны Кіпр», — б'е трывогу кіраўнік інфалініі па бяспечным выездзе і знаходжанні за мяжой 113 Ірына ВАРВАРЫНА. І перасцерагае беларусак ад паспешлівых і неабдуманых рашэнняў.

Паводле слоў **кіраўніка Праграмы «Ла Страда Беларусь» Алены НЕСЦЯРУК**, гандляры жывым таварам усё часцей выкарыстоўваюць для вярбоўкі сацыяльныя сеткі. Прыцягнуць да адказнасці такіх вярбоўшчыкаў вельмі складана, бо яны знаходзяцца на тэрыторыі іншых дзяржаў і прыязджаць у Беларусь не збіраюцца.

— Усё больш абанентаў распавядаюць, што ім паступаюць сумніўныя прапановы працы або адпачынку за кошт прымаючага боку, — адзначыла Ірына Варварына. — Далёка не заўсёды гэтыя прапановы такія бяскрыўдныя, як здаецца, як прыгожа могуць гучаць праз сацсеткі. За апошні час два выпадкі завяршыліся завядзеннем крымінальных або адміністрацыйных спраў, дайшлі да суда. Адна з гэтых спраў — вярбоўка групы дзяўчат для працы танцоркамі ў Кітаі. Яны прыязджалі ў Паднябесную па турыстычнай візе, там аддавалі пашпарт наймальніку, быццам бы для афармлення працоўнай візы... Такім чынам аўтаматычна траплялі ў пастку. З'ехаць дадому без пашпартоў яны не маглі. Больш за тое, адну з беларусак выкарыстоўвалі для вярбоўкі новых ахвяр. Яна пісала ў сацсеткі сваім знаёмым і незнаёмым сімпатычным зямлячкам. Маўляў, прыязджайце, умовы тут казачныя. За гэта ёй абяцалі вярнуць пашпарт, заплаціць грошы і адпусціць дадому. У дадзеным выпадку, на шчасце, сітуацыя вырашылася паспяхова. Усе пацярпелыя вярнуліся дадому. У тым ліку і дзякуючы дапамозе консула Беларусі ў Кітаі. А на дзяўчыну, якая распавядала пра казачныя ўмовы працы ў інтэрнэце, пасля вяртання ў Беларусь наклалі штраф.

Каля 70% абанентаў інфалініі 113 цікавяць пытанні, звязаныя з працаўладкаваннем за мяжой.

Другі выпадак выклікаў большы рэзананс — сярод пацярпелых былі і непаўналетнія. Вербавалі маладых дзяўчат праз сацыяльную сетку «УКантакце» для аказання паслуг інтымнага характару мужчыну, які пражывае ў Маскве. Пры гэтым не заўсёды гаварылася, што неабходна будзе аказваць сексуальныя паслугі. Усё падаецца вельмі прыгожа. Прапануецца пазнаёміцца з багатым мужчынам. Калі вы адно аднаму спадабаецеся, то, калі пажадаеце, можаце ўступіць у інтымную сувязь. Калі не — для вас гэта будзе забаўляльная паездка, драйф, добры настрой. Зразумела, чым усё гэта заканчваецца. Сумна, на жаль. Выявіць злачынную схему атрымалася, дзякуючы адной з патэнцыйных ахвяр, якая звярнулася на нашу інфалінію. Па ўстаноўленых фактах заведзена крымінальная справа.

За 15 гадоў Праграма «Ла Страда» дапамагла больш за 340 пацярпелым ад гандлю людзьмі. Садзейнічалі іх вяртанню дадому, аказвалі бясплатную медыцынскую, юрыдычную, псіхалагічную падтрымку.

Нямала зваротаў, паводле слоў Алены Несцярук, звязана з вышукам сваякоў, зніклых за мяжой. «Гаворка ідзе пра сітуацыі, калі чалавек з'ехаў у іншую краіну і перастаў выходзіць на сувязь, або сувязь падтрымліваў і раптам знік. Часта родныя не ведаюць, куды можна звярнуцца, панікуюць. Наша задача — супакоіць, падказаць, як дзейнічаць далей. Калі трэба, дапамагаем скласці афіцыйныя звароты ў тыя ці іншыя арганізацыі. Па магчымасці, вядома ж, і самі звяртаемся да партнёраў за мяжой, іншых грамадскіх арганізацый у краіне, дзе знік чалавек. Усе тыя, каго з дапамогай спецыялістаў праграмы шукалі, ужо вярнуліся на радзіму. Хоць былі вельмі складаныя сітуацыі, напрыклад з вяртаннем дзяўчыны (у яе былі праблемы са здароўем) з адной экзатычнай краіны. Тым не менш удалося, падключыўшы консула, паліцыю, рускамоўных турыстаў, знайсці яе і вярнуць на радзіму».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
dryla@zviazda.by

■

БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫМІ

8 правілаў бяспекі за мяжой

✓ Нікому не аддавайце свой пашпарт. Пакуль знаходзіцеся дома, зрабіце ксеракопіі ўсіх важных дакументаў, адзін асобнік вазьміце з сабой, другі — пакіньце дома. Для падстрахоўкі адпраўце адсканаваныя старонкі пашпарта на сваю электронную пошту.

✓ **Яшчэ да выезду за мяжу абавязкова аформіце ў пасольстве працоўную візу (калі едзеце працаваць). Перш чым прыступаць да працы, заключыце з наймальнікам кантракт. Ніякія вусныя дамоўленасці не дапамогуць вам у далейшым.**

✓ У родных і знаёмых павінен быць дакладны адрас і пашпартныя дадзеныя таго, у каго вы будзеце жыць за мяжой. Каб яны ведалі, з чаго пачынаць пошук. А то часам бацькі тэлефануюць і кажуць: «Я ведаю, што яна ў Турцыі». Турцыя ж даволі вялікая. Калі вы едзеце ў госці да новага знаёмага, з якім пазнаёміліся праз інтэрнэт, лепш за ўсё аформіць гасцявую візу. Яна патрабуе адмысловага запрашэння, афармленага ў дзяржорганах, таму вы дакладна будзеце ведаць, што чалавек з такімі пашпартнымі данными рэальна існуе.

✓ **Варта дамовіцца з блізкімі пра тое, як будзеце падтрымліваць з імі сувязь. Абавязкова прыдумайце ўмоўную фразу, якая дазволіць зразумець, што з вамі нешта здарылася.**

✓ У вас павінны быць грошы для аплаты непрадбачаных выдаткаў. Лепш за ўсё ўзяць банкаўскую картку, на якую родныя пры неабходнасці маглі б пераводзіць патрэбную суму.

✓ **Перад выездам паклапаціцеся пра медыцынскую страхоўку.**

✓ Загадзя даведайцеся як мага больш інфармацыі пра краіну, у якую едзеце. Па кароткім нумары 113 можна задаць ананімна і бясплатна любыя пытанні, звязаныя з працаўладкаваннем, адпачынкам і вучобай за мяжой, шлюбам з замежнымі грамадзянамі.

✓ **Запішыце ўсе неабходныя і важныя нумары тэлефона. Калі за мяжой з вамі здарылася бяда, пішыце на электронную пошту consultation@lastrada.by . З лютага на сайце «Ла Страды» можна будзе атрымаць і анлайн-кансультацыю.**

АД ДОМА ДЛЯ АРГАНІСТА — ДА СКЛЕПА

Карэспандэнт «Звязды» прайшлася па сталіцы ў пошуках старажытных загадак

Каб даведацца пра гарадскія таямніцы, часам трэба зазірнуць далёка ў гісторыю, а часам — проста расплюшчыць (узняць угару, апусціць долу) вочы. Разам з гісторыкам і экскурсаводам Паўлам Дзюсекавым мы павандравалі па сутарэннях сталічных касцёлаў, даведаліся, калі ў Мінску з'явілася мода на кавярні, і ўспомнілі пра падземныя хады.

НЕВЯДОМЫ ЧЫРВОНЫ КАСЦЁЛ

Бадай, самыя прыгожыя паданні нашага горада звязаны з Чырвоным касцёлам. Пабудаваў яго Эдвард Вайніловіч у гонар сваіх памерлых дзяцей Сымона і Алены. Праўда, згодна з легендай, Сымон і Алена памерлі ў адзін момант, але насамрэч спачатку, у 1897 годзе, ад шкарлятыны сканаў Сымон. Праз некалькі гадоў запаленне лёгкіх забрала і жыццё яго сястры. Цяпер злева ад увахода ў касцёл, там, дзе з 2006 года пахаваны астанкі Эдварда Вайніловіча, перавезеныя з польскага Быдгашча, можна ўбачыць і пліту з магілы яго сына. Гэта ўсё, што засталося ад яе. У 1917 годзе маёнтак Вайніловічаў Савічы быў разрабаваны, і разам з унікальным архівам роду, дакументамі XVII стагоддзя, былі знішчаны і пахаванні...

У Мінску пачатку XX стагоддзя быў толькі адзін касцёл (катэдра Найсвяцейшай Панны Марыі, што на плошчы Свабоды) і дзве маленькія капліцы (на Залатой Горцы і на Кальварыйскіх могілках). Падчас свят людзям, натуральна, гэтых храмаў не хапала. Тады Эдвард Вайніловіч, які ўзначальваў Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі, прапанаваў гарадской радзе грошы для будаўніцтва касцёла, але — з умовамі.

Калі жадаеце пабачыць тое, што схавана, і ацаніць сапраўдную веліч адметнага беларускага стылю «віленскае барока» — не палянуйцеся абысці вакол святыні.

— Першая ўмова была ў тым, што ён сам абярэ месца, дзе будзе стаяць храм, другая — што ён вызначыць яго архітэктурны стыль, — гаворыць Павел Дзюсекаў.

Вайніловіч шмат вандраваў і ў польскім Ютросіне пабачыў касцёл Святой Альжбеты работы італьянскага архітэктара Марконі. Ён вырашыў пабудаваць падобны ў Мінску. І вось загадка: з першага погляду не ўсе могуць знайсці адрозненне паміж нашым сучасным касцёлам і яго польскім «братам». У касцёла Святой Альжбеты ёсць плябанія, а тое, што лічыцца плябаніяй каля касцёла Святых Сымона і Алены, насамрэч узводзілася як... дом для арганіста.

Касцёл будавалі з 1905 па 1910 год. Ён выкананы з чырвонай цэглы, прывезенай з польскай Чанстаховы. Кожную цаглінку (а іх тут ад 8 да 10 тысяч), каб не пашкодзіць, упакавалі ў мяккую паперу і ў такім выглядзе транспартавалі.

Храм мае тры вежы: вялікую, што сімвалізуе пакуты бацькоў за сваіх дзяцей, і дзве меншыя, названыя ў гонар саміх Сымона і Алены. Мала хто ведае, але раней касцёл меў і званы. Іх было таксама тры: Міхаіл (названы ў гонар патрона Магілёўскага архібіскупства Святога Міхаіла), Эдвард і Сымон.

У 1930-я гады касцёл быў зачынены і пасля гэтага не працаваў ажно 52 гады. Спачатку яго прыстасавалі пад памяшканне Польскага тэатра БССР. А калі адбылося абвастрэнне адносін паміж СССР і Польшчай у міжваенны час, акцёраў тэатра выгналі, а будынак у 1937 годзе аддалі пад галоўнае памяшканне кінастудыі «Савецкая Беларусь».

У 1991 годзе касцёл вярнулі прыхаджанам, і з таго часу ў ім служыць ксёндз-магістр Уладзіслаў Завальнюк. Шмат добрых спраў было зроблена ім за гэты час на карысць Чырвонага касцёла і вернікаў. Адметна, што святая імша часцей, чым тут, не праводзіцца нават у катэдры. А яшчэ святыня займела і свае рэліквіі: тут захоўваецца копія Турынскай плашчаніцы (бадай, адзіная ў свеце, пастаянна адкрытая для вернікаў), а таксама крыж і шапачка кананізаванага нядаўна Папы Рымскага Яна Паўла II.

СВЯТЫ ФЕЛІЦЫЯН І ТУРЭЦКІЯ СЛОДЫЧЫ

Цяперашняя вуліца Камсамольская з'явілася адносна нядаўна — у самым канцы XIX стагоддзя. Вядома, называлася яна тады па-іншаму — Феліцыянаўская. Даведацца, чаму, можна, калі прайсці па ёй у бок архікафедральнага касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі і зазірнуць у двары. З гэтага непараднага боку касцёла адкрываецца сапраўды неверагодны і... нечаканы від на храм. Калі жадаеце пабачыць тое, што схавана, і ацаніць сапраўдную веліч адметнага беларускага стылю «віленскае барока» — не палянуйцеся абысці вакол святыні. Заадно вачам адкрыецца частка храма, якая калісьці была асобнай каплічкай пры ім у гонар Святога Феліцыяна — патрона горада, ад якой і пайшла назва вуліцы.

Але вернемся на Камсамольскую. Калі стаяць каля кінатэатра «Перамога» тварам да яго і паглядзець направа, позірк утаропіцца ў непрыкметны (з першага погляду) белы дом. Ён таксама мае сваю таямніцу. У канцы XIX стагоддзя ў Мінск прыехаў турак Ахмед Офлі з жонкай. Людзьмі яны былі беднымі і зараблялі тым, што на Нізкім рынку (цяпер у раёне выхада з метро «Няміга» ў бок Палаца спорту) прадавалі свае нацыянальныя слодычы. Мінчукам яны да таго падабаліся, што бізнес Офлі расквітнеў, і ў выніку яны сталі першымі, хто адкрыў у горадзе сетку кандытарскіх кавярняў «Канстанцінопальская». Іх у Мінску ў канцы XIX стагоддзя было чатыры, і адна размяшчалася ў тым самым непрыкметным белым доме на Феліцыянаўскай.

Фота Надзеі БУЖАН.

Касцёл Святых Сымона і Алены — адзін з галоўных сімвалаў Мінска.

Від на Архікафедральны касцёл з двара. Пад драўлянай вежачкай — былая каплічка Святога Феліцыяна.

Калі вярнуцца да кінатэатра, то па суседстве з ім стаіць будынак Генеральнай пракуратуры. А калісьці на яго месцы быў касцёл бенедыкцінак. У 1870 годзе храм перарабілі пад жаночы праваслаўны Праабражэнскі манастыр, потым перабудавалі, а пасля вайны знеслі.

ПАД АХОВАЙ НАЙСВЯЦЕЙШАЙ ПАННЫ

Паглядзеўшы на катэдру з боку апсіды, мы выходзім да параднага ўвахода і трапляем у храм. Пабудаваны галоўны сёння беларускі касцёл быў у 1710 годзе ордэнам езуітаў, якія стварылі пры касцёле калегіум.

Касцёл быў шыкоўна аздоблены, аднак з прыходам савецкай улады храм пераўтварылі ў аўтамайстэрню, і ад былой раскошы не засталося амаль нічога. Пасля вайны яго перабудавалі (знеслі вежы, зрабілі чатыры паверхі, аздобілі будынак класіцыстычным порцікам) і размясцілі тут спартыўнае таварыства «Спартак».

Першапачатковы выгляд касцёлу сталі вяртаць у 1990-я гады, калі храм перадалі назад вернікам.



Адметнасць інтэр'ера кафедральнага касцёла — арган і старажытныя фрэскі.

Аднак самая складаная задача, над якой рэстаўратары б'юцца і сёння, — аднавіць фрэскі. А яны ў катэдры сапраўды ўнікальныя. Толькі ўявіце сабе: вы заходзіце ў храм, а са сцен на вас глядзяць святыя, выявы якіх былі нанесеныя яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай! Праўда, пакуль што фрэскі архікафедральнага касцёла адноўлены толькі фрагментарна.

Мы спускаемся ў падземную частку храма — нізкія скляпенні, нішы ўздоўж сцен, і зноў — часткова раскрытыя фрэскі. «Рады вітаць вас у склепе!» — гаворыць Павел Дзюсекаў. Яго словы — не страшылка для турыстаў, гэта сапраўды склеп. Некалі самыя багатыя і дабрадзейныя людзі горада пасля сваёй смерці траплялі сюды, між іншым, па ўласнай волі. Бо лічыцца, што калі над нябожчыкам пастаянна служыцца святая імша, душы ад гэтага добра. Таму тыя самыя нішы ў сценах служылі для ўмуравання ў іх трунаў. І цалкам верагодна, што некаторыя з іх усё яшчэ знаходзяцца там, не выяўленыя...

Толькі ўявіце сабе: вы заходзіце ў храм, а са сцен на вас глядзяць святыя, выявы якіх былі нанесеныя на сцены яшчэ падчас Рэчы Паспалітай!

ГОРАД ХРАМАЎ

— Мінск згубіў вельмі шмат касцёлаў. Перад апошнім падзелам Рэчы Паспалітай тут іх было больш за 20. Напрыклад, на сучаснай вуліцы Рэвалюцыйнай знаходзіўся касцёл Святога Міхаіла, які належаў ордэну бенедыкцінцаў, кляштар Святой Веранікі з касцёлам, што належаў рахітам і безліч іншых, — працягвае расповед Павел Дзюсекаў.

Шмат чаго з сакральнай каталіцкай архітэктуры сталіцы не дайшло да нашага часу. Напрыклад, ад сучаснага Святадухава кафедральнага сабора (які першапачаткова быў касцёлам у гонар Звеставання Панны Марыі) яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя ішла вуліца Казьмадзям'янаўская, якая вяла да касцёла Святога Яна і кляштара баніфратаў. Кармеліты знаходзіліся каля цяперашняй Петрапаўлаўскай царквы. Францішкане і марыявіткі — на сённяшняй вуліцы Леніна. Самы вялікі і прыгожы ў горадзе дамініканскі касцёл Святога Тамаша Аквінскага, што стаяў каля цяперашняга Палаца Рэспублікі, быў разбураны адносна нядаўна — у пачатку 1950-х гадоў, калі побач паставілі помнік Сталіну.

Храмы на плошчы Свабоды, у адным з якіх, касцёле Святога Язэпа, цяпер размяшчаецца архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі, а другі аднавілі пад канцэртную залу, будавалі бернардзінцы ў сярэдзіне XVII стагоддзя. Нават сучаснае Суворaўскае вучылішча — гэта шмат разоў перабудаваны касцёл Панны Марыі і кляштар шарытак.

Раней храмы ўсіх канфесій у Мінску былі звязаныя паміж сабой падземнымі хадамі, каб можна было ратавацца ў іх у выпадку нападаў. Аднак, на жаль, пасля Другой сусветнай вайны ўсе гэтыя хады былі знішчаны.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
Фота аўтара.

■ Трэба бачыць

ПАРТЫЗАНСКІ ВЕРНІСАЖ

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрылася выстаўка «Зброяй сатыры»

У экспазіцыі прадстаўлена звыш 150 арыгінальных прадметаў з фондаў музея. Плакаты, газетна-часопісная сатырычная графіка, насценныя газеты і замалёўкі партызанскіх мастакоў у жанрах палітычнай і бытавой сатыры — з нямецка-фашысцкімі захопнікамі змагаліся і на творчым фронце. Узброеныя вострым словам і трапным малюнкам, пісьменнікі і мастакі ранілі гітлераўцаў падчас мацней, чым куляй.

Сапраўдным выбухам стаў для апошніх выхад агітплаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», які ўбачыў свет 5 ліпеня 1941 года ў Гомелі. Некалькі разоў мяняючы сваю «прапіску», сатырычнае выданне мабілізоўвала ўсіх на барацьбу з ворагам. З яго старонак да чытачоў звярталіся вядомыя мастакі, такія выдатныя пісьменнікі, як Янка Купала, Якуб Колас, Максім Танк, Пятрусь Броўка, Анатоль Астрэйка і іншыя. Захавалася ўнікальная хроніка, на якой славутыя «раздавілаўцы» — так называлі супрацоўнікаў агітплаката — ствараюць чарговы нумар у творчым цэху ў далёкай Маскве, дзе ўжо газета-плакат выдавалася ў 1942 — 1943 гадах.

Усяго ўбачылі свет 142 выпускі «Раздавім фашысцкую гадзіну». Найбольш цікавыя і яркія з іх прадстаўлены ў экспазіцыі. Тут можна ўбачыць і нумар, у якім апублікавана «Малая партызанская энцыклапедыя», дзе на кожную літару пісьменнікі і мастакі падбіралі трапнае слова і не менш востры малюнак.

Упрыгожвалі «Раздавім фашысцкую гадзіну» малюнкі і карыкатуры Анатоля Волкава, сына вядомага мастака Валянціна Волкава, якога многія ведаюць па карціне «Мінск 3 ліпеня 1944 года». Менавіта яго карыкатура адкрывае першы нумар агітплаката і закрывае апошні, які ўбачыў свет напярэдадні Дня Перамогі.

— Калі пачалася вайна, далёка не ўсе мастакі маглі пакінуць палаючы Мінск, — успамінае сын карыкатурыста, **заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Сяргей ВОЛКАЎ**. — Мой бацька з сям'ёй разам з бежанцамі за 25 і 26 чэрвеня дабеглі да Барысава. У горадзе ўжо быў нямецкі танкавы дэсант. Прыйшлося вяртацца ў Мінск. Сталіца гарэла. Наш дом, які знаходзіўся на вуліцы Мопраўскай (цяпер Камуністычная), згарэў цалкам. Нашу сям'ю, бацькоў і траіх дзяцей, прытуліла сям'я мастакоў. Усе гады акупацыі мы пражылі ў Мінску.

У Мінск рэдакцыя ўжо часопіса «Раздавім фашысцкую гадзіну» пераехала ў верасні 1944 года, а з жніўня 1945-га ён стаў выходзіць як сатырычна-гумарыстычны часопіс «Вожык». Малюнак Анатоля Волкава, на якім чырвонаармеец, як пастаянны персанаж «Раздавім фашысцкую гадзіну», перадае эстафету вожыку, захоўваецца і сёння.

Разам з «Раздавім фашысцкую гадзіну» на ідэалагічным фронце змагалася з ворагам і «Партызанская дубінка». Сатырычны часопіс, месца выдання якога ніколі не ўказвалася, друкаваўся на 8 аркушах. Выйшла ўсяго 19 нумароў. Толькі некалькі разоў да свайго чытача трапіла і выданне Заходняга фронту «Фронтовой юмор», у якім рэзкія вершы і смелыя карыкатуры выкрывалі хлуслівую палітыку фашыстаў, заклікалі насельніцтва далучыцца да ўсенароднай барацьбы.

Прапагандысцка-агітацыйную функцыю ў гады Вялікай Айчыннай вайны выконваў і плакат. У музеі налічваецца каля 500 плакатаў, якія былі створаны ў гады ваеннага ліхалецця. Самыя ўнікальныя прадметы калекцыі — плакаты з серыі «Вокны ТАСС», якія ў 1970 годзе ў музей перадалі славутыя мастакі Кукрыніксы, — не абміне нават самы няўважлівы наведвальнік выставы. Вялікія плакаты ў форме сапраўдных вокнаў ствараліся з дапамогай празразных трафарэтаў з дапамогай гуашы і ілюстравалі сабой зводкі Саўінфармбюро. Маскоўскія мастакі Міхаіл Купрыянаў, Парфірый Крылоў і Мікалай Сакалоў аператыўна рэагавалі на ўсе падзеі на фронце і ў партызанскіх атрадах. Літаральна на наступны дзень пасля атрымання навін на вуліцах Масквы з'яўляўся чарговы плакат. Такія ж «вокны» можна было ўбачыць і ў іншых гарадах Савецкага Саюза.

— Кукрыніксы любілі выкарыстоўваць у сваіх плакатах крылатыя выразы, прымаўкі і прыказкі, якія часта перараблялі на свой манер, — расказвае **загадчыца аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Галіна ПАЎЛОЎСКАЯ.** — Напрыклад, «Аттестат зрелости» або «Руки по швам». А знакаміты плакат «Долг платежом красен» з'яўляецца найлепшым плакатам партызанскай тэматыкі. Часам трапныя радкі да ілюстрацый пісаў Самуіл Маршак. Наклад найбольш паспяховых плакатаў даходзіў да 2 тысяч экзэмпляраў!

Як і Кукрыніксы, асабістым ворагам Гітлера лічыўся Барыс Яфімаў. Вядомы карыкатурыст на працягу ўсёй вайны маляваў гітлераўскіх ваякаў і паказваў іх, вядома, не з лепшага боку. А мастак Віктар Дэні ўвогуле маляваў толькі фюрэра, фізіяноміі якога залежалі ад палітычных падзей на фронце. Сам Дэні казаў: «Плакат павінен быць ясным і простым. Плакат — гэта страла, маланка да падсвядомасці гледача...»

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА

Куратар выстаўкі Наталля ФІЛІПОВІЧ: «Многія работы былі створаны літаральна ў акопах».

Савецкія мастакі падключыліся да барацьбы з ворагам з першых месяцаў вайны. 900 з іх прызвалі ў Чырвоную Армію. Мастак Дзмітрый Красільнікаў, які пазней стаў галоўным мастаком газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», а пасля вайны праілюстраваў многія творы беларускіх аўтараў, увогуле на фронт пайшоў добраахвотна. Той жа мастак Леанід Бойка, змагаючыся ў партызанскай брыгадзе «За Радзіму» Мінскай вобласці, у вялікай колькасці малюнкаў расказваў пра дыверсіі партызанаў, іх побыт. Многія створаныя ў акопах замалёўкі пасля вайны сталі сапраўднымі карцінамі.

— А такіх партызанскіх мастакоў, як Мікалая Абрыньбу і Мікалая Гуцieва, увогуле можна назваць героямі, — лічыць **куратарка выставы, вядучы навуковы супрацоўнік музея Наталля ФІЛІПОВІЧ**. — Першую сваю выстаўку творцы арганізавалі менавіта ў партызанскім атрадзе. Той жа Мікалай Абрыньба ва ўмовах партызанскага побыту напісаў 8 мастацкіх палотнаў. Адно з іх — «Бой за Пышна», створаны ў маі-чэрвені 1943 года. Героі карціны загінулі ў баі за Пышна. Усе яны пайменна ўвекавечаны і на адваротным баку карціны.

Энцыклапедыю жыцця і барацьбы народных мсціўцаў таксама складаюць баявыя лісткі і насценныя газеты. Своеасаблівай справаздачай дзейнасці магілёўскіх партызанаў стала работа Зосіма Шкляра, які на сшытай з двух кавалкаў прасціне расказаў аб здзейсненых дыверсіях. Гэтыя вялікія лічбы, якімі вымералася колькасць знішчаных гарнізонаў, мастоў, рэек, эшалонаў, тэхнікі і жывой сілы праціўніка, аздоблены адпаведнымі малюнкамі. Па словах спецыялістаў, работа выканана рэдкай тэхнікай пісьма — сухім пэндзлем. Каб паглядзець, на што яшчэ былі здольныя партызанскія майстры, трэба наведаць выставу.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

■ Месцы і мястэчкі

ПА ШАПЧЫЦАХ КУЧОМКА

На самай поўначы Рагачоўскага раёна, дзе Гомельшчына вітаецца з Магілёўшчынай, ёсць невялічкая вёска з назвай Шапчыцы. З наваколлем жыве тут 330 чалавек. Самыя ініцыятыўныя з іх стварылі ў мясцовым клубе музей шапак. У межах агульнага праекта (які фінансуецца Еўрасаюзам) «Стварэнне эфектыўнай сістэмы культурных і інфармацыйных паслуг для сельскага насельніцтва «Свет інфармацыі, культуры і творчасці — для ўсіх» на гэту ініцыятыву выдаткавана больш за 2500 еўра. Населены пункт мае старажытную спадчыну, якой іншыя могуць зайздросціць. Да таго ж мясцовыя легенды сведчаць, што звычайная шапка можа адыграць драматычную, а часам і трагічную ролю ў гісторыі.

Ірына СЕДЛЕР, кіраўнік названага праекта ЕС у Рагачоўскім раёне, агучвае версіі паходжання назвы вёскі. Гавораць, быццам калісьці менавіта ў мясцовыя запаветныя лясы накіравала Кацярына Вялікая суднабудаўнікоў — для таго, каб знайсці тут самыя магутныя хвоі. Доўга яны шукалі і менавіта ля гэтай вёсачкі знайшлі такія вялізныя дрэвы, што, калі паднялі галовы, у іх на зямлю пападалі шапкі. У гонар такой своеасаблівай падзеі вырашылі назваць мястэчка Шапчыцамі.

Па другой версіі, вярталіся з горада пасля кірмашу мясцовыя гандляры. Цямнела, і ім хацелася скараціць шлях дадому. Адважыліся яны пайсці праз лес і трапілі ў самае балота. Потым аднавяскоўцы здагадаліся пра сумны іх лёс толькі па шапках на паверхні багны.

Трэцяя версія традыцыйна самая простая. Кажуць, што славутым мястэчка зрабіў майстар з залатымі рукамі. Жыў тут у старажытныя часіны кушнер, які далёка славіўся вырабам футра. Дарэчы, у акрузе было вельмі шмат звяроў, шкуры якіх месцічы выкарыстоўвалі для таго, каб сагрэць вушы. Бегалі тут зайцы, куніцы, ласкі, лісіцы, ваўкі. Бабры і выдры таксама станавіліся трафеямі паляўнічых. Як аргумент і экспанат — шапка з выдры, якую ў будучы музей прынесла мясцовая жыхарка.

Дарэчы, інфармацыя пра паляванне і рыбалку актуальная і сёння. Таму стрэлы паляўнічых у наваколлі — не рэдкасць. А яшчэ ўцякаюць сюды ад жонак аматары адпачыць душой і целам. Закідваюць вуды і надоўга спыняюць гадзіннік жыцця. Нездарма ж кажуць, што хвіліны, праведзеныя на рыбалцы, не залічваюцца ў пражыты час. Тут вакол старыя рэчышчы Дняпра, азёры, лясы, з якіх мясцовае насельніцтва ў кошыках прыносіць дадому нядрэнны даход у выглядзе ягад і грыбоў.

Яшчэ адну мясцовую легенду з трагічнай развязкай згадвае **загадчыца Шапчыцкага сельскага клуба і бібліятэкі Алена ХВОРАСТАВА**:

— Тут побач ёсць балота Татарнаўка. Кажуць, што калісьці казакі гналі татар. Сярод іх на белым кані ўцякала па дуброве прыгожая татарка. І везлі за ёй шмат багацця. Але ж нечакана ўвесь абоз трапіў у балота. На дно пайшлі ўсе — разам з каштоўнасцямі. Можа, і сёння яны недзе тут ляжаць?

Дарэчы, у 1960-я гады мінулага стагоддзя быў у Шапчыцах знойдзены скарб: сярэбраныя дырхемы — манеты Арабскага халіфата, схаваныя прыкладна ў XVIII-XIX стагоддзях. Так што, можа, сапраўды недзе пад журавіннымі балотамі чакаюць сваіх шукальнікаў незлічоныя скарбы?

А яшчэ ў кіламетры на захад ад вёскі археолагамі выяўлена гарадзішча VI-II стагоддзяў да нашай эры. Па пісьмовых крыніцах вёска вядомая з XVI стагоддзя — у Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. Па звестках 1567 года, вёска павінна была вылучаць апалчэнцаў для войска ВКЛ.

Аўтарка тэкста таксама не ўтрымалася ад спакусы памераць капялюш.

Вядома, што ў канцы XIX стагоддзя, акрамя земляробства, мясцовыя жыхары займаліся вырабам карункаў, якімі абшывалі ручнікі, абрусы і іншае. Узоры гэтых карункаў экспанаваліся ў Магілёўскім губернскім музеі. Яшчэ кажуць пра ўнікальныя народныя строі, уласцівыя толькі мясцовым майстрыхам-прыгажуням.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны пры адступленні акупанты спалілі тут сотню дваroў, а 27 жыхароў забілі. 1102 савецкія байцы, якія адстойвалі гэты куток Беларусі, пахаваны ў брацкай магіле ў цэнтры вёскі. У Рагачоўскім краязнаўчым цэнтры захоўваюцца асобныя дэталі савецкага самалёта, знойдзеныя ля Шапчыц.

...У будучым Шапчыцкім музеі шапак збіраюцца ўвасобіць усе тры версіі-легенды пра назву населенага пункта. Пакуль ёсць толькі ідэі, якія патрабуюць творчага асэнсавання. Мяркуюць, будзе тут свой кушнер, які шые кучомкі. Менавіта так нашы продкі называлі шапкі з футра.

— Створым для дзяцей і дарослых гурток па пашыве галаўных убораў, — дадае Алена Хворастава. — Магчыма, зробім майстэрню па вырабе дамскіх эксклюзіўных капелюшоў, якія можна будзе выкарыстоўваць на розныя тэматычныя святы. Важна, каб знайшліся тыя, хто робіць гэтыя рэчы, і тыя, каму цікава будзе гэта купіць. Каб мясцовыя традыцыі не толькі захоўваць, але і прымнажаць.

Галаўныя ўборы прымяраюць дырэктар Доўскай дзіцячай школы мастацтваў, кіраўнік народнага ансамбля «Радасць» Мікалай Дашук і кіраўнік праекта ЕС у Рагачоўскім раёне Ірына Седлер.

— Мы звярталіся да жыхароў усяго раёна праз мясцовую газету, каб людзі пашукалі ў сябе на гарышчах старажытныя кучомкі, кепкі і капелюшы, якія насілі іх дзяды-прадзеды, — дадае Ірына Седлер. — У вёсцы ёсць дзеці, падлеткі і маладыя сем'і, якія таксама могуць унесці свой уклад у захаванне спадчыны. Дарэчы, мінулым летам палова раёна падключылася да конкурсу па стварэнні капелюшоў з самых незвычайных матэрыялаў. У тым ліку з другаснай сыравіны. Вось, глядзіце, якія прыгожыя атрымаліся. Усе просяць іх памераць і, зразумела, сфатаграфавацца.

Вялікае люстэрка ў Шапчыцкай бібліятэцы — падстава, каб адразу ж скарыстацца прапановай. І вось ужо задаволена жаданне кожнай жанчыны пакрасавацца ў капелюшы-экспанаце.

Часта бывае, што месцічы носяць прозвішча, падобнае да назвы роднай вёскі, аднак ні Шапак, ні Шапчанкаў, ні Шапчыцаў, ні Шапкіных, ні Шапкевічаў тут не заўважана. Затое ёсць Наталья Смольнікава, Вольга Вобсева, Яўген Гарбоўскі і Алена Хворастава, якія распрацавалі ініцыятыву па нараджэнні музея і адраджэнні сваёй вёсачкі.

— Магчыма, невялічкі музей, які тут сёлета будзе створаны, не дасць загінуць нашаму маленькаму, населенаму такімі добрымі людзьмі пункту, — марыць Алена Хворастава. — Сюды абавязкова будуць хадзіць дзеці. Вядома ж, вёска жыве, пакуль у ёй працуюць дом культуры, ФАП і школа. А мы хочам, каб нашы ўнукі і праўнукі працягвалі жыць на сваёй зямлі і ведалі пра яе старажытную гісторыю.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by
Фота аўтара

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 4 (304)

■ Пачатак

ПАЭТЫЧНЫ ТЭАТР? ТАК!

Паэт, тонкі лірык, празаік, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась ПАЗНЯКОЎ не так даўно адсвяткаваў свой 65-гадовы юбілей. Аднак вечарына, што прайшла ў сталічнай Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы, стала не проста віншавальнай для творцы. Яна засведчыла пачатак існавання Мінскага гарадскога тэатра паэзіі.

Гэты праект нарадзіўся сёлета, у Год культуры, дзякуючы супрацы адразу трох устаноў — упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама, Мінскага гарадскога аддзялення СПБ і Цэнтральнай бібліятэкі імя Янкі Купалы.

Марына ЯСЮК, галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама, падчас вечарыны зазначыла:

— У аснове праекта новага паэтычнага тэатра — ідэя Міхася Пазнякова, яго імкнення, каб паэтычнае беларускае слова не проста гучала з вуснаў творцаў, а было ўпрыгожана музыкай, тэатральнай дзеяй.

Таму невыпадкова першы спектакль паэтычнага тэатра быў прысвечаны яго стваральніку. Са сцэны гучалі песні на вершы Міхася Паўлавіча, юбіляр чытаў свае творы, працавала выстаўка кніг паэта. Аднак сам Міхась Пазнякоў прызнаўся, што ідэю тэатра ён падгледзеў у сяброў — пісьменнікаў з Дагестана:

— Не так даўно па запрашэнні міністра культуры Дагестана, а таксама старшыні Саюза пісьменнікаў гэтай краіны я пабываў у Махачкале. Там ужо працуе Тэатр паэзіі, які месціцца ў неверагодна прыгожым будынку. Выступіўшы на яго сцэне, прачытаўшы свае вершы, я пачаў марыць пра тое, каб і ў Мінску развівацца падобны праект.

Першы спектакль паэтычнага тэатра меў поспех, таму існуе надзея, што праект будзе жыць і развівацца. Дарэчы, новыя пастаноўкі тэатра, што будуць праходзіць у Купалаўскай бібліятэцы раз на месяц, ужо анансаваныя. Так, наступная сустрэча, што пройдзе ў лютым, будзе прысвечана маладым паэтам, а сакавіцкая імпрэза збярэ ў адной зале прыхільнікаў таленту паэта Анатоля Аўруціна.

Марына ВЕСЯЛУХА.
Фота Кастуся ДРОБАВА.

■ Выстава

Сцены музея як магчымасць выказацца

Маладыя аўтары ў сучасным беларускім мастацтве падзяліліся на некалькі «суполак». Адна з іх імкнецца без залішняга пафасу рэалістычна падкрэсліць нацыянальную культуру, беларускасць; другая пільна сочыць за еўрапейскімі павевамі, захапляецца беспрадметнымі матэрыямі і абстракцыяй. Апошнім часам акадэмічнае майстэрства гарманічна спалучаецца з мовай метафар, сімвалаў, сінкрэтызмам. Мастакі накіроўваюць увагу на свой унутраны свет і спрабуюць сябе ў розных іпастасях: ад класічнага жывапісу і скульптуры да музычна-светлавых інсталяцый ці калажаў...

«Зіма» Вікторыі Шыдлоўскай.

Такая разнастайнасць прадстаўлена на рэспубліканскай мастацкай выставе лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, што працуе ў Нацыянальным гістарычным музеі з 22 студзеня да 7 лютага.

«Абаронца» Арцёма Мядзведзева.

Вернісаж стаў пляцоўкай для студэнтаў і маладых педагогаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў: дызайнераў і жывапісцаў, скульптараў і графікаў. Нехта ўжо даволі гучна заявіў пра сябе на культурнай прасторы як нашай краіны, так і замежжа, іншыя толькі пачынаюць свой шлях да поспеху. Але кожная работа вартая ўвагі. Нават і не скажаш, што многія з мастакоў яшчэ вучацца ці толькі нядаўна скончылі ВНУ.

Вольга Мельнік-Малахава аддае перавагу каларытнаму рэалізму. Рукі закрываюць папяровы ліст. Належаць яны аднаму чалавеку ці дваім — не істотна, галоўнае — яны расказваюць пра вялікую тайну, магчыма, каханне ўсяго жыцця... Алесю Скарабагатую ведаюць як майстра мяккіх, цёплых адценняў. Мёд, бабуліны бліны з маслам, кава з шакаладам і круасанамі — усё гэта настолькі аб'ёмнае, праўдападобнае, што, гледзячы на карціны, адчуваеш прыемны салодкі водар.

Кацярына Семечка распавядае пра беларускую ноч на мове геаметрычных формаў, Алесь Багданаў вандруе ў сне, а Вікторыя Шыдлоўская паказвае зімовых ружовашчокіх прыгажунь у квяцістых хустках — амаль як у казцы «Марозка». А ёсць яшчэ футурызм і графічнасць Рамана Сустава, лірычныя пейзажы Васіля Пешкуна, фантазійныя графічныя «выбухі» Фёдара Шурмялёва...

Сярод скульптараў вылучаюцца філосаф Арцём Мядзведзеў з яго партрэтамі-развагамі; Рыпсімэ Геваркян з праектам памяці Настассі Слуцкай; Кацярына Шымановіч з казачнымі чалавечкамі, канцэпцыяй спектакля «Сіняя барада»; Лаймэ Мірончык, у якога метал ці шамот з лазурытам ператвараюцца ў аб'екты з моцнай духоўнай аўрай... Мастакі вольныя ў эксперыментах, пошуках сябе, спалучэнні розных стыляў і тэхнік. І яны могуць выстаўляцца на вядучых мастацкіх пляцоўках краіны, што з'яўляецца адной з формаў дзяржаўнай падтрымкі. Бо самае, мабыць, важнае — знайсці сваю аўдыторыю, быць заўважаным, і сцвердзіць, што сучаснае беларускае мастацтва не стаіць на месцы.

Марыя ВОЙЦІК

■ Імпрэзы

«МЫ БУДЗЕМ СПЯВАЦЬ»

ПАЧНІЦЕ З БАЛЯ: ВЫКАНАЎЦА З МАГІЛЁВА Ў НОВЫМ ЦЫКЛЕ КАНЦЭРТАЎ АЎТАРСКАЙ ПЕСНІ

Цыкл канцэртаў «Подых струн» пачынаецца ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі пры ўдзеле тэлевізійнага канала «Беларусь 3». Сустрэчы з бардамі (ці аўтарамі і выканаўцамі ўласных песень) плануюць ладзіць кожны месяц. І не сумнявайцеся, што імёнаў і ўдзельнікаў будзе дастаткова: у нашай краіне нямала тых, хто вядомы сваёй адметнай творчасцю і час ад часу дае канцэрты. 30 студзеня першым выйдзе на сцэну Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі ў рамках новага цыкла выканаўца з Магілёва Аляксандр БАЛЬ.

З песні слова не выкінеш, асабліва калі яна ўжо гучыць пад гітару. Барды, або людзі, што спяваюць свае песні, — гэта асаблівая каста выканаўцаў, якая ведае нейкі асаблівы падыход да слухача. Калі слухаеш песні пад гітару, то неяк міжволі ўяўляеш вольнае паветра, агонь, які ўночы асвятляе твары тых, хто пасеў вакол, і ўзнікае адчуванне спавядальнасці, шчырасці, нібыта ідзе сяброўская размова. Толькі пакладзеная на акорды. І не так важна, сапраўды ты ў лесе або ў іншай нефармальнай абстаноўцы, ці ў прыгожай зале. «Песні пад гітару» яшчэ з савецкіх часоў прыцягвалі цёплай чалавечай інтанацыяй або нервам і энергіяй, якія вылучалі людзей неабыякавых. Аўтары і выканаўцы нават у іміджы імкнуліся падкрэсліць сваю адрозненасць ад эстрадных артыстаў з прадуманым правільным іміджам. І гэта таксама прывабліва. У наш час усё дакладна гэтак жа. І часам, акрамя спеваў пад зададзены рытм, хочацца паўзаў і ціхіх акордаў.

У Аляксандра Баля шмат слухачоў — і не толькі ў Беларусі. Ён лаўрэат шматлікіх фестываляў аўтарскай песні, у тым ліку славутага Грушынскага. Але і ў Беларусі адзначаны ўвагай: лаўрэат рэспубліканскіх фестываляў тэатральнай моладзі, напрыклад у 1998 годзе за стварэнне мона-спектакля «Вайна».

Але сваё права на творчасць даказваў вельмі ўпарта, таму што папрацаваць прыйшлося ў розных прафесіях, нават будаўніком і гандляром. Потым лёс прывёў у Магілёўскае вучылішча культуры, дзе ён вучыўся на аддзяленні харавога дырыжыравання. Пасля стаў загадчыкам музычнай часткі ў Магілёўскім абласным драматычным тэатры. Яго музыку (і песні) можна паслухаць падчас тэатральных пастановак. Але сольны канцэрт дае магчымасць зразумець аўтара і выканаўцу Аляксандра Баля лепш.

Марыя АСІПЕНКА

■ Добрая навіна

АРТЫСТАМ ЦЯПЕР БУДЗЕ ЗРУЧНА

Вялікай падзеяй для Чэрыкава, што на Магілёўшчыне, стала адкрыццё сучаснага раённага Цэнтра культуры, дзе створаны ўсе ўмовы для заняткаў мастацкай творчасцю, гуртковай работай і адпачынку. У вялікім светлым будынку размясціліся харэаграфічныя і вакальныя класы, дыскаклуб і бібліятэка, більярдная зала і студыя дэкаратыўна-прыкладной творчасці. А галоўнае — канцэртная зала на 300 месцаў, разлічаная на правядзенне мерапрыемстваў высокага ўзроўню.

— Гэта сапраўды свята для нас, — падкрэсліла **намеснік старшыні Чэрыкаўскага райвыканкама Анжэла НОВІКАВА**. — Наколькі гэта значная для нас падзея, сведчыла ўжо тое, што на адкрыццё сабралася вялікая колькасць народа. Дагэтуль творчыя калектывы туліліся ў непрыстасаваных памяшканнях, дзе часам не хапала самага неабходнага. Выхоўваць любоў да прыгажосці ў такіх умовах было проста немагчыма. Зараз іншая справа. Тут усё прадугледжана для працы — шмат прасторы, святла. А галоўнае, усё культурнае жыццё засяродзілася ў адным месцы. Раней пра такое прыходзілася толькі марыць.

Дарэчы, будаўніцтва Цэнтра культуры было распачата ў 2010 годзе. Паскорыць будаўніцтва аб'екта дапамог зварот жыхароў да Прэзідэнта падчас яго наведвання раёна. Людзі паскардзіліся на тое, што ў райцэнтры ўмовы для заняткаў творчасцю горшыя, чым у аграгарадках. Просьбу пачулі, і аб'ект быў уключаны ў Пратакол даручэнняў Прэзідэнта. Цэнтр пабудаваны за кошт сродкаў чарнобыльскай праграмы і абласнога бюджэту, на яго было выдаткавана больш за 50 мільярдаў рублёў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

■ Сам-насам

Уладзімір ПРАКАПЦОЎ:

«МАСТАЦТВА ДАПАМАГАЕ ГУРТАВАЦЬ НАЦЫЮ»

У яго жыцці, як два ствалы ад аднаго кораня, цесна пераплялiся мастацтва і праца на дзяржаўнай пасадзе. Яны, як гэта часта бывае ў прыродзе, сталі непадзельнымі, шчыльна ўраслі адно ў аднаго. Таму, расказваючы пра Уладзіміра Пракапцова, дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, нельга не сказаць пра яго як пра мастака. Бо ў кіраванні музеем Уладзімір Іванавіч часта праяўляе выдумку, уласцівую толькі чалавеку творчаму, а ў яго карцінах можна сустрэць вобразы, навеяныя музейнай працай. У размове сам-насам мы запыталі ў нашага візаві, чым адметныя беларускія творцы і каго з іх будуць памятаць нават праз сто гадоў, чым можна прывабіць беларуса ў музей і як выглядае кажан, што ахоўвае Нацыянальны мастацкі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Як лічыце, мова, на якой гаворыць мастак, уздзейнічае на яго творчасць?

— Каб напісаць твор, трэба, перш за ўсё, дакладна ведаць, пра што пісаць. Мая першая карціна была зроблена да 90-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Нацюрморт, прысвечаны яму, — «Апошні санет паэта». Я ішоў ад назвы, ад яго твораў, якія гучаць менавіта па-беларуску і «ўпісаны» ў наш генетычны код.

Пішу карціну «Старыя гнёзды». Бацькоўскі дом, зіма, снег ляжыць, гурбы, жаночы сілуэт. Дрэвы стаяць, і на іх — гнёзды. Але не проста гнёзды, кінутыя птушкамі, а старыя, апусцелыя хаты, у якіх калісьці нарадзіліся птушаняты, што даўно вылецелі і больш не вярнуліся. Хаты пачынаюць пусцець, і, на жаль, няма не тое каб птушынага піску, а ўжо дзіцячых галасоў. Уся ідэя гэта — адтуль, знутры. Усё відаць, узаемазвязана: і філасофія жыцця, і сугучнасць мовы з тым, адкуль мы пайшлі, бо ўсё адно пасля вяртаемся да вытокаў. Як тыя птушкі: спачатку імкнуліся да нябёсаў, хутчэй вылецець і спазнаць свет, а пасля наляталіся і хто ў думках, а хто і па факце вяртаецца да сваіх гнёздаў — малой радзімы.

— Чым адметна беларускае мастацтва?

— Сваімі духоўнымі каранямі. Можна прывесці шмат прозвішчаў мастакоў, якія менавіта праз уласную творчасць уславілі родную зямлю, краіну, гісторыю, культуру. Амаль кожны беларускі мастак падсвядома адлюстроўвае гэта. Нават калі ён пейзажыст, то ўсё адно, калі малюе гістарычныя мясціны, рэшткі замка, сядзібы, алеі ці лес — усё, што робіць мастак, прапускае праз сябе, праз сваю генную памяць, хоцькі-няхоцькі праслаўляе радзіму. Шмат хто з нашых мастакоў расказваў, што не можа пісаць у Італіі ці Іспаніі. Пейзажы атрымоўваюцца халоднымі. А сваю прыроду адчуваеш блізка, пранікнёна. І пэндзаль сам бегае па палатне... А вось заморскі пейзаж будзе намаляваны па правілах, але без душы. Карцінка, як фотаздымак. І не кране гледача. Бо любы твор мастака, калі ён укладвае душу і сэрца, будзе прываблівaць сваёй энергетыкай.

Карціне, якая становіцца дыялогам паміж творцам і тым, хто глядзіць на палатно, наканавана жыць у стагоддзях. Бо да яе хочацца вяртацца зноў. Вядома, павінна быць пэўная недагаворанасць, філасофская нотка, каб палатно прываблівала і кожны раз адкрывала гледачу новыя эмоцыі, светаўспрыманне і адчуванне сябе. Толькі сапраўдныя таленты на гэта здольны. І твораў такіх мастакоў у нашым Нацыянальным мастацкім музеі шмат. Большасць з іх сталі класікай, без якой сёння нельга ўявіць культурную прастору Беларусі. Тое, што ў нас атрымалася сабраць за апошнія гады, асабліва ў пасляваенны час, — агульнанацыянальная духоўная спадчына. Можа быць, мы яшчэ гэтага не разумеем, бо мы сучаснікі і нам складана абстрагавацца і зірнуць збоку.

— Творы каго з сённяшніх мастакоў будуць ведаць праз сто гадоў?

— Праз сто гадоў? Ён можа быць сённяшнім студэнтам Акадэміі мастацтваў.

— А праз 50?

Уладзімір Іванавіч падымаецца і ідзе па стос кніг.

— Бачыце, — *кажа ён і кладзе перада мною вежу з каляровых вокладак*. — У 2012 годзе, які быў Годам кнігі, мы заснавалі адпаведную серыю пра славутых мастакоў з Беларусі. Я сам напісаў пра Станіслава Жукоўскага, Вітольда Бялыніцкага-Бірулю, Фердынанда Рушчыца, пра астатніх — нашы супрацоўнікі. Выйшла ўжо 19 кніг. Гэта мастацкі беларускі іканастас, пачынаючы ад Івана Хруцкага, Валенція Ваньковіча, Віталя Цвіркі, Міхаіла Савіцкага, Аркадзя Астаповіча... Яны ўжо ўвайшлі ў гісторыю. Чакаем новых талентаў.

— Чаму сябе не бераце ў разлік?

— Усё адбірае час, ён вызначае, а не мы. Калі стваралі серыю кніг, думалі абмежаваць яе пэўнай колькасцю — пяцьдзясят творцаў, напрыклад. Але вырашылі, што і гэтага не хопіць, і на вучонай радзе прынялі канчатковае рашэнне, што серыя мусіць быць бясконцай. У яе можа трапіць праз пэўны час і сённяшні навучэнец-мастак. Але ён павінен адпавядаць тром умовам. Першая — нарадзіцца ў Беларусі, другая — стаць вядомым мастаком не толькі на радзіме, а і па-за яе межамі, трэцяя — стаць... нябожчыкам. Зрабіць жа дакладны прагноз немагчыма. Студэнт, які сёння самы таленавіты на курсе, праз колькі гадоў становіцца сярэднім мастаком. А бывае і наадварот. Але тое, што цяпер прадстаўлена ў нашай экспазіцыі, беспамылкова класікі. Яны ўжо пакінулі значны след у гісторыі беларускага мастацтва.

— А так хацелася пажадаць вам таксама трапіць у гэтую серыю. Але ж трэцяя ўмова... Даруйце.

— *(Смяецца.)* Думаю, што кніжка пра мяне выйдзе на стагоддзе з дня нараджэння.

— Хто ведае?.. *(Смяёмся.)* ***Што яшчэ вас можа натхніць?***

— Зараз аднаўляю работу, якую калісьці зафарбаваў, — «Музейныя прывіды». У нашым музеі на падстрэшшы жыве кажан, які залятае праз рашотку ў музейныя залы апоўначы і ператвараецца ў прыгожую дзяўчыну. Яна ходзіць па залах музея і ахоўвае нашы каштоўнасці.

— Значыць, вы яе бачылі і намалюеце?

— Ужо намаляваў. Яшчэ ў нашых залах ёсць містычная карціна. На ёй намаляваны дзве жонкі Януша Радзівіла. У чырвоным адзенні і ў чорным. Калі памерла першая жонка, ён ажаніўся з другой. І замовіў карціну, на якой адначасова выявы абедзвюх. І я сабе задаю пытанне: калі Януш Радзівіл так любіў сваю першую жонку, ён мог бы заказаць яе партрэт і, скажам, павесіць ва ўласным кабінеце, а другой жонкі — у зале, напрыклад. А чаму сумясціў іх? І потым, што адчувала другая жонка, якая хадзіла па палацы і бачыла сябе побач з памерлай першай? Я вырашыў выкарыстаць гэты момант і намаляваў такую карціну. Рыцар у даспехах XVII стагоддзя з маім тварам, стаяць гэтыя дзве жанчыны, па-над намі ляціць дзяўчына-кажан, нібыта балерына.

— Але для таго, каб беларусы пабачылі тое, што вас натхняе, іх трэба перш за ўсё прывабіць у музей. Як гэта зрабіць?

— Відаць, не хапае нам гонару і любові да свайго, да беларускага. Гэта можа праяўляцца па-рознаму. Сёння я іду ў тэатр. І апрану ў яго бабачку з беларускім арнаментам, якую мне пашыла майстрыха з Оршы па спецыяльнай замове. Дэталь, але ж... Мне б хацелася, каб мы як мага больш ганарыліся сваімі дзеячамі культуры, айчынным мастацтвам. Каб не было «культурнага скразняку», каб мы былі болей засяроджанымі, каб любілі і шанавалі тое, што зроблена нашымі суайчыннікамі. Каб паважалі сваю краіну, гісторыю, творцаў. І адна з задач музея — выхоўваць гэта, пачынаючы са школьных часоў, і зачапіць, зрабіць так, каб, прыйшоўшы дадому, захацелася зайсці ў інтэрнэт і пашукаць болей інфармацыі пра тых жа Жукоўскага і Бялыніцкага-Бірулю. Яшчэ пятнаццаць гадоў таму казалі, што яны вялікія рускія мастакі, хоць і беларусы. У гэтым была і наша недапрацоўка. Але ўсё можна выправіць. Быў бы час і жаданне.

Гэты год аб'яўлены Годам культуры. І не трэба так прамалінейна разумець яго: з'явяцца новыя спектаклі, выставы, фестывалі. Ён будзе ў пэўным плане і лёсавызначальным, і няпростым у эканамічным плане, бо сёння крызіс пануе не толькі ў нас, але і ва ўсім свеце. Гэты год можна правесці і карысна. Чалавеку трэба іншы раз маральна «пагаладаць». Калі мы ўжываем шмат прадуктаў, арганізм таксама перанасычаецца. Тады варта зрабіць паўзу, спыніцца і звярнуць увагу на сябе. Бо галоўнае — каб унутры нас была духоўнасць. Грошы былі, ёсць і будуць, больш альбо менш, а вось самавызначэнне нацыі, гонар за яе здабыткі мусіць быць заўжды. Людзі жылі і ў больш цяжкія часы, і недаядалі, і не заўсёды добра апраналіся. Сёння ж ніхто з голаду не пухне. Безумоўна, заўжды хочацца большага. Але колькі купюр ні было б у гаманцы, ад сябе не збяжыш.

Культура робіць людзей лепшымі не толькі ў эстэтычным плане, але і ў жыццёвым. Існуюць паняцці культуры прыняцця ежы, адзення, паводзінаў. Яна растворана ва ўсім. Год культуры — толькі нагода часцей звяртацца да гэтай думкі. І перш за ўсё — гэта ўласная праца кожнага з нас. Калі будзем памятаць пра гэта, тады сапраўды адчуем сябе яшчэ больш годнай, згуртаванай нацыяй.

— Не можам не павіншаваць вас з ганаровай узнагародай — прэміяй «За духоўнае адраджэнне». Як вы лічыце, у тым, што атрымалі яе, якая ваша заслуга?

— Я атрымаў прэмію як кіраўнік музея, але яна была ўручана ўсяму калектыву за той уклад, які мы ўнеслі ў культурнае развіццё краіны. Дакладней, за шэраг выстаў. Некалькі гадоў таму адбылася выстава «Праваслаўная ікона» з нагоды 1020-годдзя Хрышчэння Русі, у якой удзельнічалі Расія, Украіна, Беларусь. Потым, у 2013-м, з бласлаўлення Патрыярха Алексія II мы зладзілі такога ж кшталту выставу да 1025-годзя Хрышчэння Русі (да ўдзельнікаў дадалася і Сербія). Ну і, вядома, мінулы год быў юбілейны і знакавы для Беларусі — 80 гадоў з дня нараджэння ўладыкі Філарэта, Ганаровага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Да яго юбілею мы зрабілі шэраг выстаў сакральнага кірунку — абразоў XVII стагоддзя з Яраслаўскага мастацкага музея, з нашага музея, грэчаскага мастака Аляксандраса Каяса, а таксама прадставілі асабістыя рэчы ўладыкі. Выстава доўжылася амаль 8 месяцаў і мела вельмі станоўчыя водгукі.

Нацыянальны мастацкі музей прадставіў з уласнай калекцыі праваслаўныя і каталіцкія абразы ў трох венгерскіх музеях. У цэлым мы штогод ладзім выставы такога кшталту. Нядаўна зрабілі выставу «Беларускі іканастас». Гэта вялікі пласт работы нашых супрацоўнікаў, рэстаўратараў, выставачнага аддзела. Рыхтуемся да выставы праваслаўных і каталіцкіх ікон у ватыканскім музеі, а яшчэ — да выставы ікон з уласных калекцый для музея Эль Грэка ў Таледа.

Мы рыхтуем выставы і свецкія. Нядаўна да нас прыязджала адна з іх — з Траццякоўскай галерэі. Цяпер — выстава Эль Грэка і Пікаса з мадрыдскага музея. Да 150-годдзя Льва Бакста 10 лютага адкрыем беларускім гледачам яго творы. Шэраг выстаў пройдзе з нагоды аб'яўленага Года культуры. У рамках Трэцяга музейнага форуму адкрыецца ў Магілёве філіял нашага музея Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, які цяпер на рэканструкцыі. І самае галоўнае, што зараз Нацыянальны мастацкі перажывае «Рэнесанс», як я яго называю: ідзе актыўнае будаўніцтва музейнага квартала. Мы спадзяёмся, што праз 5 гадоў, да 80-годдзя музея, праца будзе скончана, і робім усё магчымае для таго, каб музей быў еўрапейскага ўзроўню. Тады ён, кажучы словамі класіка, зойме свой пачэсны пасаг паміж музеяў свету. Таму прэмія для нас — хутчэй стымул рухацца ў тым жа кірунку наперад, вышэй і надалей, а не спыняцца.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

В связи с закрытием склада, компания ООО «Линтерн» проводит оптовую продажу товара на очень выгодных условиях:

СВЕТОТЕХНИЧЕСКАЯ ПРОДУКЦИЯ
производителей «Philips», «Космос» и др.:

• лампы газоразрядные, лампы светодиодные, люминисцентные, энергосберегающая;

• светильники, прожектора, удлинители, фонари, элементы питания и т.п.

Оптовые скидки от 60% Форма оплаты – предоплата.

Более подробную информацию вы сможете получить по тел. **+375 44 508-77-80, +375 29 326-38-88.**

Сайт: **www.lintern.by**

УНП 691450324

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОДАЖЕ АКЦИЙ

Вошкат Анатолий Сергеевич объявляет о продаже акций ЗАО «Солигорский завод технологического оборудования» в количестве 160 простых акций (2,0793% Уставного фонда общества) по цене не ниже 184 долларов США за акцию по курсу Национального банка на день покупки.

Вошкат Дмитрий Анатольевич объявляет о продаже акций ЗАО «Солигорский завод технологического оборудования» в количестве 1015 простых акций (13,1904% Уставного фонда общества) по цене не ниже 184 долларов США за акцию по курсу Национального банка на день покупки.

Чирко Юлия Анатольевна объявляет о продаже акций ЗАО «Солигорский завод технологического оборудования» в количестве 775 простых акций (10,0715% Уставного фонда общества) по цене не ниже 184 долларов США за акцию по курсу Национального банка на день покупки.

Лущицкая Татьяна Анатольевна, объявляет о продаже акций ЗАО «Солигорский завод технологического оборудования» в количестве 775 простых акций (10,0715% Уставного фонда общества) по цене не ниже 184 долларов США за акцию по курсу Национального банка на день покупки.

Срок размещения акций в продаже – 30 календарных дней со дня объявления о продаже.

По вопросу приобретения акций обращаться по адресу: Минская обл., г. Солигорск, а/я 16, т.м. +37544 796 37 31.

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже здания гальванического корпуса, принадлежащего ОАО «Минский экспериментально-фурнитурный завод»

«…стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартир площадью **81,53 кв.м** на 5 этаже - *1300 (одна тысяча триста) долларов США*, площадью **71,79 кв.м** на 15 этаже - *1250 (одна тысяча двести пятьдесят) долларов США*, площадью **66,75 кв.м** на 15 этаже - *1250 (одна тысяча двести пятьдесят) долларов США*.»

Дополнительную информацию можно получить по адресу:
г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704.
Тел. 8(017) 306 20 90, Vel.: 8(029) 153 33 24, 8(044) 781 81 17.

УНП 191061436

ГРЫП: ХТО НЕДААЦЭНЬВАЕ, ТОЙ ПРАЙГРАЕ

А вы не забыліся прышчапіцца мінулай восенню?

Калі вы зараз вельмі пакутуеце ад страху перад грыпам, адкажыце сабе, калі ласка, на пытанне: чаму я не прышчапіўся гэтай восенню?! Гэта будзе лепшым урокам і спробай пераасэнсаваць свае паводзіны ў наступныя гады. На шчасце, 42 працэнты беларусаў вакцынаваліся, і гэта вельмі важна для таго, каб сітуацыя з сезоннай захваральнасцю па грыпе заставалася пад кантролем. Цяпер і расійскія СМІ кажуць аб тым, што не зашкодзіла б пераняць вопыт...

І сапраўды: вакцынацыя застаецца пакуль адзінай эфектыўнай мерай абароны ад грыпу. Не ад усіх вострых рэспіраторных вірусных інфекцый, а толькі ад вірусаў грыпу. Гэта не азначае, што прышчэплены ў прынцыпе не захварэе пры сутыкненні з вірусам, але ён можа пазбегнуць той жа пнеўманіі, якая і павышае верагоднасць лятальнага канца.

Што яшчэ трэба ведаць пра грып? Тлумачыць кіраўнік Нацыянальнага цэнтра па грыпе Наталля ГРЫБКОВА.

РАБІЦЬ «ШТО-НЕБУДЗЬ» — САБЕ ДАРАЖЭЙ

Штогод прыкладна ў канцы студзеня ў нашых шыротах пачынаецца ўздым так званай сезоннай захваральнасці. Вірусы нікуды не знікаюць і летам, але зімой ствараюцца больш спрыяльныя ўмовы для іх атакі — мы менш бываем на свежым паветры, дый вітамінныя запасы «зношваюцца». Часцей за іншых хварэюць дзеці, пажылыя, цяжарныя, людзі з лішняй вагой, цукровым дыябетам і іншымі цяжкімі хранічнымі захворваннямі. Але ў групу рызыкі могуць залічыць сябе... усе, хто знаходзіцца пад уздзеяннем стрэсу. Такое ўздзеянне істотна аслабляе арганізм, і той зусім лёгка здаецца вірусам.

Калі вы сустрэліся з вірусам, а ў крыві няма абарончых антыцелаў, то вы захварэеце. Антыцелы могуць быць толькі калі вы перахварэеце або зробіце прышчэпку. Вірус грыпу мяняе «твар» кожны год, а таму калі вы хварэлі летась, цалкам можаце захварэць і сёлета. Вось чаму і прышчэпкі трэба рабіць штогод. Той, хто вырабляе вакцыны, імкнецца прадугледзець абарону ад усіх актуальных грыпозных вірусаў.

Праз рот, нос і вочы вірус імгненна трапляе ў арганізм і пачынае наводзіць свае парадкі ў ім.

Ніякіх народных сродкаў і нават лекаў з даказанай прафілактычнай эфектыўнасцю не існуе. Пачаць загартоўвацца, ужываць гародніну і мяса, не курыць і вытрымліваць элементарныя правілы гігіены — усё гэта аказваецца непасільным для нашага чалавека. А вось прыйсці ў аптэку і накупіць «хіміі» (дарэчы, не таннай) — гэта па-нашаму. Падобная практыка стабільна не спрацоўвае, людзі хварэюць, але год за годам не вучацца на памылках. Можа быць, канкрэтна вам дапамагаюць гэтыя пілюлі — на здароўе, самаўнушэнне наогул вельмі дзейсная рэч. Але не факт, што вам не дапамог бы і журавінавы морс.

НА АБАРОНЕ АРГАНІЗМА

Калі ў арганізма ўстойлівы імунітэт, то мікробы і вірусы не могуць пранікнуць у яго і распаўсюдзіцца ў ім. Органы і клеткі імуннай сістэмы рассеяныя па ўсім целе і звязаныя паміж сабой крывяноснымі і лімфатычнымі сасудамі. Галоўныя наглядальнікі за парадкам — макрафагі і лімфацыты — утвараюцца ў касцявым мозгу. Лімфацыты дзеляцца на дзве групы. В-лімфацыты, прымітыўна кажучы, абараняюць арганізм ад бактэрый і прасцейшых і іх таксінаў. Т-лімфацыты ўключаюцца, калі нам пагражае вірусная атака, яны ж разбураюць клеткі пухлін або донарскіх трансплантатаў.

Перадача віруса адбываецца ад аднаго чалавека другому. Вось чаму адна з першых рэкамендацый — пазбягаць людных месцаў. Лепей прайсці пешшу, чым ехаць у перапоўненым транспарце; лепей адмовіцца ад пакупкі, чым стаяць у чарзе. Прынцып зразумелы.

Ці насіць маску? Па-першае, здаровому чалавеку яна можа спатрэбіцца, хіба, падчас догляду хворага. Але маску найперш трэба надзець на самога хворага — каб ён з чханнем і кашлем выдзяляў у наваколле менш сліны, у кропельках якой багата віруса, да таго ж, у вадкай «капсуле» ён выдатна захоўваецца.

Рот, нос, вочы, рукі — сачыце за імі. Не дакранайцеся да твару, пакуль не вымылі рукі з мылам. Праз рот, нос і вочы вірус імгненна трапляе ў арганізм і пачынае наводзіць свае парадкі ў ім. Чхайце ў локаць, а не ў далоні. Часцей мыйце, працірайце рукі (звычайным мылам, дэзынфіцыруючымі сурвэткамі). Павіталіся за руку — ідзіце мыць.

Тэмпература паветра ў памяшканні павінна быць каля 20 градусаў, вільготнасць — 50-70 працэнтаў. Вірусы гадзінамі ўяўляюць пагрозу ў цёплым, сухім памяшканні, але разбураюцца амаль імгненна ў халаднаватым, вільготным паветры, якое не «застойваецца». Падчапіць вірус на працы — на раз-два, а на вуліцы нерэальна. Так што смела і без маскі дыхайце паветрам падчас прагулкі, а дома і на працы рэгулярна праветрывайце памяшканні. Мыйце падлогу, карыстайцеся ўвільгатняльнікамі паветра.

Калі слізістая носа перасохне, гэта парушыць работу нашага мясцовага імунітэту, і вірусы з лёгкасцю пераадолеюць гэты бар'ер. У верхніх дыхальных шляхах пастаянна ўтвараецца слізь, якая абараняе нашы слізістыя абалонкі. Перасушыць нашу слізістую можа не толькі сухое паветра, але і некаторыя лекі. У любым выпадку ўвільгатняйце слізістыя абалонкі. Калі ў вас ёсць свабодны флакон-пырскалка (з-пад сасудазвужальных кропель, напрыклад), зрабіце раствор (1 ч. л. звычайнай кухоннай солі на 1 л гатаванай вады), заліце ў гэты флакон і пырскайце хоць кожныя 10 хвілін, калі вакол вас вельмі шмат людзей. Пры з'яўленні насмарку, дарэчы, можна выкарыстоўваць больш салёны раствор. Можна набыць у аптэцы і гатовы фізіялагічны раствор або салявыя растворы для носа. Самаробным салявым растворам апаласквайце хоць бы двойчы ў суткі ротавую поласць. Не забывайце, што ў якасці прафілактыкі дапаможа «аксалінавая мазь» (беларускі аналаг «бораментол»), пры першых прыкметах дрэннага самаадчування — «лейкацытарны інтэрферон» (карыстацца ім неабходна строга па інструкцыі).

КАЛІ ЎЖО ЗАХВАРЭЛІ

Фактычна адзіным прэпаратам, здольным разбурыць вірус грыпу, з'яўляецца азельтамівір (камерцыйнае імя «таміфлю», беларускі аналаг — «флустоп»). Ужываць яго як каму ўздумаецца нельга. Па-першае, не мае сэнсу пры адсутнасці сімптомаў захворвання, па-другое, бескантрольнае прымяненне прэпарату можа спрыяць з'яўленню ўстойлівых да яго вірусаў грыпу. Азельтамівір прымяняюць у першыя 48 гадзін ад моманту з'яўлення сімптомаў грыпу тады, калі захворванне працякае цяжка, або калі лёгка хварэе чалавек з групы рызыкі — словам, ужываць прэпарат можна толькі пад наглядам урача, а часам яшчэ і шпіталізацыя патрабуецца.

Няўжо няма ніякай чароўнай пілюлі? Калі ўрач асабіста вам не прызначыў, значыць, для вас такой пілюлі яшчэ не вынайшлі. Лячэнне грыпу і вострых рэспіраторных вірусных інфекцый — гэта вашы правільныя паводзіны ў дачыненні да ўласнага арганізма, а не глытанне «хіміі».

Лячэнне простае, несакрэтнае, як бы вам ні хацелася ўскладніць гэты шлях.

1. У памяшканні, дзе вы хварэеце, павінна быць халаднавата і вільготна. Тэмпература паветра — лепей +16, чым 22, вільготнасць — лепей 80, чым 30%.

2. Не прымушайце сябе есці, хворае дзіця — тым больш (дзяцей наогул нельга прымушаць есці!). Дастаткова лёгкіх страў.

3. Піць трэба не проста многа, а вельмі многа. Што захочаце, тое і піце, аднак пачынайце з кампоту, морсу, чаю, адвару з сухафруктаў. У аптэках прадаюцца гатовыя растворы (кшталту «рэгідрону», «гастраліту»). Развядзіце па інструкцыі і піце/паіце.

ВОРАГІ І СЯБРЫ

Лічыцца, што імунітэт здольныя падкасіць стрэсы, хранічная стомленасць, незбалансаванае меню, дэфіцыт вітамінаў і мікраэлементаў.

Звярніце ўвагу на дастатковую колькасць магнію. Ужывайце мінеральную ваду, бабовыя, гародніну, морапрадукты, грэцкія арэхі, фундук, міндаль, цэльназерневыя кашы (грэчка, проса, пярлоўка, карычневы рыс, авёс).

Для папаўнення запасаў цынку нам неабходныя белае і чырвонае мяса, рыба, яйкі, морапрадукты (з раслін цынк засвойваецца дрэнна).

Не забывайцеся на тлустую рыбу, гранаты, часнок, чабор, грыбы шыітаке, разнастайныя фрукты і гародніну, чай, горкі шакалад.

4. У нос пырскайце/капайце салявыя растворы.

5. Калі вырашылі змагацца з тэмпературай, то з дапамогай парацэтамолу, ібупрафену.

ШТО ВАМ НЕ ТРЭБА?

Ставіць банкі, ляпіць гарчычнікі, мазацца спіртам ці тлушчам, ужываць алкаголь, аспірын, прыгнятаць кашаль або ўзмацняць яго.

Вірусы гадзінамі ўяўляюць пагрозу ў цёплым, сухім памяшканні, але разбураюцца амаль імгненна ў халаднаватым, вільготным паветры, якое не «застойваецца».

КАЛІ АБАВЯЗКОВА ТРЭБА ЗВЯРНУЦЦА ДА ЎРАЧА?

Да ўрача трэба звяртацца заўсёды — гэта аксіёма. Але слова «абавязкова» якраз указвае на тое, што нашаму чалавеку любая аксіёма — не ўказ. Так што абавязкова, калі:

- няма паляпшэння на чацвёрты дзень;
- на сёмы дзень захоўваецца высокая тэмпература;
- стан пагоршыўся пасля таго, як палепшыўся;
- з'явіліся задышка, цяжкае дыханне, узмацніўся кашаль, пасля глыбокага ўдыху ўзнікае новы прыступ;
- парацэтамол і ібупрафен амаль не дапамагаюць пры павышэнні тэмпературы;
- сутаргі, страта прытомнасці;
- любы боль, сып на целе;
- боль у горле без насмарку;
- галаўны боль з ванітамі;
- ацёчная шыя;
- тэмпература вышэй за 39 градусаў не зніжаецца праз 30 хвілін пасля прымянення гарачкапаніжальнага сродку;
- высокая тэмпература разам з бледнасцю скуры, дрыжыкамі.

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

ПА СУСЕДСТВЕ

Крытычная сітуацыя склалася ва Украіне, дзе памерла больш за 60 чалавек, у шэрагу абласцей уведзены каранцін, а ў Кіеве нават дэзынфіцыруюць грамадскі транспарт. Расійскіх мытнікаў на расійска-ўкраінскай мяжы навучылі выяўляць захварэлых, падазроных нават правяраюць з дапамогай цеплавізараў.

У Маскве і шэрагу расійскіх рэгіёнаў аб'яўлена эпідэмія грыпу і вострых рэспіраторных вірусных інфекцый, на прадпрыемствах аб'яўлены каранцін. Ад наступстваў грыпу загінулі больш за 100 чалавек, якія, як сцвярджаецца ў СМІ, позна звярнуліся па ўрачэбную дапамогу. Спад захваральнасці чакаецца ў лютым. У асноўным жыхары Расіі хварэюць штамам віруса так званага свінога грыпу A(H1N1). Гэта той штам, ад якога прапаноўвалася вакцынацыя гэтай восенню. У суседняй краіне вакцынацыя не дасягнула такога ўзроўню, як у нас. Нашы спецыялісты сцвярджаюць, што менавіта прышчэпкі дапамагаюць сітуацыі заставацца стабільнай, а колькасці выпадкаў грыпу — нешматлікімі.

алімпіец
ЗВЯЗДА
выпуск № 1 (38)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

■ Алімпійскія навіны

СПОРТ БЕЗ МЕЖАЎ

74-гадовы японец хоча прыняць удзел у Гульнях

Хірасі Хакэцу ўпершыню адправіўся на Алімпійскія гульні больш за пяцьдзясят гадоў таму, а ў гэтым годзе падаў заяўку на ўдзел у адборачным раўндзе (конны спорт) да Рыа-2016. Калі па яго выніках ён патрапіць на Гульні, то стане найстарэйшым спартсменам у алімпійскай гісторыі.

На гэты момант гэта званне належыць шведскаму стралку Оскару Свану, які прыняў удзел у Алімпіядзе 1920 года ў Антверпене (Бельгія) ва ўзросце 72 гадоў і заваяваў сярэбраны медаль.

ПАЗМАГАЕМСЯ ЗА ЛІЦЭНЗІЮ

У штаб-кватэры ФІБА адбылося лёсаванне адборачнага турніру па баскетболе на Алімпіяду ў Бразілію. Беларускія дзяўчаты апынуліся ў групе «С», там яны паспрачаюцца за запаветную пуцёўку ў Рыа са зборнымі Карэі і Нігерыі.

Турнір пройдзе з 12 па 19 чэрвеня ў Нанце (Францыя), там выступяць 12 каманд:

Група А: 1. Куба; 2. Новая Зеландыя; 3. Францыя.

Група В: 1. Камерун; 2. Турцыя; 3. Аргенціна.

Група С: 1. Беларусь; 2. Карэя; 3. Нігерыя.

Група D: 1. Венесуэла; 2. Іспанія; 3. Кітай.

Па выніках папярэдняга раўнда каманды, якія занялі 1—2 месцы, выходзяць у наступны круг, дзе пераможцы чвэрцьфіналаў атрымаюць пуцёўкі на Гульні, астатнія чатыры зборныя ў плэй-оф разыграюць апошнюю пятую ліцэнзію на Алімпіяду-2016.

Права выступіць у Рыа ўжо маюць дружыны Бразіліі (краіна-гаспадыня), ЗША, Японіі, Канады, Сенегала, Сербіі і Аўстраліі.

Нагадаем, што на Алімпіядзе-2008 зборная Беларусі пад кіраўніцтвам Анатоля Буяльскага заняла 6-е месца.

■ Неслабы пол

«ЖАНЧЫНА МОЖА НЕ ТОЛЬКІ

СВЯТЛАНА АСТАШАВА —

У сезоне 2015-га Святлана прызнана лепшай футбалісткай Беларусі, да сваіх 34 гадоў, а ўзрост дзяўчына не хавае, яна станавілася чэмпіёнкай краіны ўжо 14 разоў. За яе плячыма гады выступленняў у лепшых жаночых футбольных клубах Расіі і Казахстана, а яшчэ ў перапынку паміж спартыўнымі подзвігамі, яна паспела выканаць галоўнае прызначэнне жанчыны — стаць мамай.

У перыяд, калі новы сезон яшчэ не пачаўся, а адпачынак ужо прайшоў, Святлана знайшла ў сваім напружаным графіку трохі часу. Наша гутарка пачалася з футбола, але хутка перацякла ў звычайную размову пра жыццёвыя перыпетыі найцікавейшага чалавека. Лепшая футбалістка краіны расказвае пра тое, што прымусіла яе вярнуцца ў спорт пасля нараджэння сына, як шукаць агульную мову з мужчынамі, якія не любяць футбол, і адкрывае сакрэт — у гонар каго назвала сваё дзіця Іосіфам.

«Нам часта не хапае пугі»

— Святлана, раскажыце пра ўзровень жаночага футбола ў нашай краіне. Здаецца, ведаюць пра яго няшмат хто.

— Так. Па сутнасці сёння ў чэмпіянаце краіны за п'едэстал у нас змагаюцца тры каманды, узровень калектываў і саміх гульцоў невысокі. Калі казаць пра зборную, то там зараз адбылася змена трэнера, думаю, гэта пойдзе на карысць. За стырном стаў Эдуард Дземянкавец, гэта спецыяліст з галавой, ён добра разумее футбол. У нацыянальную каманду ўсё часцей запрашаюцца маладыя гульцы, гэта, вядома, не дае імгненны вынік, але калі хочаш атрымаць поспех у будучыні — трэба закласці падмурак.

— На ваш погляд, у чым прычына нізкага ўзроўню?

— Мне здаецца, нам часта не хапае пугі. Калі б было больш жорсткасці і дысцыпліны, то можа і вынік быў бы іншы. Недзе самі гульцы не жадаюць браць усю інфармацыю, якую спрабуе данесці трэнер. Сядзяць у адным клубе па 10 гадоў, страпянуцца, калі выклікаюць у зборную, там стараюцца, а калі вяртаюцца — усё забываюць.

У 2005 годзе я была на зборах у Стайках, у гэты час там трэніраваўся маскоўскі «Спартак», іх трэнер мяне заўважыў і запрасіў пагаварыць. Мы проста гутарылі аб футболе, я расказвала пра сваё бачанне гэтай гульні, а ён задаў мне пытанне: «Ты кнігі чытаеш?» Ну калі футбаліст чытае кнігі, у нас жа такое разуменне, правільна? На гэта ён мне адказаў, што любы футбаліст абавязкова павінен чытаць і ведаць гісторыю. «Якую ты першую будзеш чытаць?» — пытаецца. Я дай ды і ляпну — пра Сталіна. Прыйшлося чытаць, і я так уразілася асобай Іосіфа Вісарыёнавіча, што назвала ў гонар яго сына. Біяграфіі вялікіх людзей дапамагаюць расці, рабіць высновы, каб ісці далей.

Гэта я да таго, што гулец павінен мець разумную галаву. Павінны быць тэарэтычныя заняткі, ты абавязаны ведаць памятку футбаліста: як правільна прыняць мяч, як правільна аддаць пас, гэта ўсё прапісана. Трэнер задае пытанні, ты адказваеш. Такой выразнай сістэмы нам не хапае.

— У чым прынцыповая розніца паміж мужчынскім і жаночым футболам?

— Мужчыны хутчэйшыя фізічна і думаюць яны хутчэй, трэнера чуюць лепш. Мне здаецца, у дзіцячым узросце дзяўчынкам і хлопчыкам не пера-

Алена ВАЛЧЭЦКАЯ:

«У ГІМНАСТЫКУ Я ПРЫЙШЛА

І стала першай алімпійскай чэмпіёнкай

Першай з гродзенскіх гімнастак у пятнаццацігадовым узросце выканала нарматыў майстра спорту. Стала першай алімпійскай чэмпіёнкай сярод беларускіх гімнастаў. Першай выканала скачок з паваротам на 360 градусаў і іншыя новыя элементы ў гімнастыцы. Нарэшце, першай разгледзела талент у будучай гімнастычнай зорцы Вользе Корбут. А калі ўтварыўся факультэт фізічнай культуры Алена Уладзіміраўна стала яго першым дацэнтам. Заслужаны майстар спорту СССР. Ганаровы грамадзянін Гродна. Хтосьці ад усяго гэтага мог бы і «забранзавець», не пазбегнуць так званай зорнай хваробы, калі на іншых глядзяць з нейкай недасяжнай для іх вышыні. Але гэта, як пераканаўся карэспандэнт «Звязды», не пра Алену ВАЛЧЭЦКУЮ.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

НЕ ЛЯЛЬКІ, А СКАЧКІ І ДАГАНЯЛКІ

— Алена Уладзіміраўна, ведаю, што калі вы вярнуліся дамоў пасля працы ў Амерыцы, вас здзівіў шырокі асартымент тавараў у крамах. А чым запомніўся Гродна як горад дзяцінства?

— Памятаю, яшчэ да майго першага класа ў горадзе былі руіны, а на Савецкай плошчы, каля Палаца тэкстыльшчыкаў, знаходзіўся прыгожы касцёл з чырвонай цэглы — потым яго ўзарвалі. Гэта да нашага часу горад вельмі разрос, а тады ён быў маленькі. Але, пэўна, не без нейкага шарму. Ала Баянава, калі прыязджала сюды з канцэртам, сказала: «Якія вам Парыжы патрэбны? Вам ніякіх Парыжаў не трэба».

Ведаеце, які бацькоўскі падарунак быў тады для мяне, дзяўчынкі, самым дарагім? Кірзавыя хлапчуковыя боты. Мы жылі ў прыватным доме непадалёк ад цэнтра горада, аднак дарожная сітуацыя была такая, што дайсці, дапусцім, да ўнівермага было даволі праблематычна. І я была такая шчаслівая, што ў мяне ёсць гэтыя боты!

— А якія былі ў дзяцінстве гульні?

— У лялькі мне гуляць не хацелася, больш прываблівалі скачкі з тарзанкі, даганялкі. У нас быў вельмі дружны клас, які практычна не дзяліўся на дзяўчынак і хлопчыкаў. Мы і карысныя справы разам рабілі (напрыклад, металалом збіралі), і актыўна адпачывалі: усе равы, будоўлі — гэта было наша. Дарэчы, у дачыненні да будучай прафесіі наш клас практычна пароўну дзяліўся на маракоў і лётчыкаў. Нават спаборнічалі, хто лепш адкажа на ўроках — маракі ці лётчыкі.

— Вы ў якой групе былі?

— Я лётчыкам хацела стаць. Перачытала безліч кніг, ведала шмат пра авіяцыю і лётчыкаў. Аднак з лётнай кар'ерай у мяне не склалася. Гэтую мару «пахаваў» мой першы трэнер па гімнастыцы Мікалай Фёдаравіч Траццяк. Неяк, калі я ўжо займалася ў Рэнальда Іванавіча Кныша, мы сустрэліся на Савецкай вуліцы. І Мікалай Фёдаравіч пацікавіўся: «Кім хочаш быць пасля школы?» Я кажу: «Лётчыкам». А ён як рассмяецца на ўсю вуліцу...

— Але ж хіба не ажыццявілася мара аб палётах? Няхай не за штурвалам самалёта — на гімнастычных снарадах. Як пачынаўся гэты шлях?

— У верасні, калі вучылася ў пятым класе 8-й школы, з'явілася аб'ява аб наборы ў розныя спартыўныя секцыі. І мы з сяброўкамі чамусьці вырашылі пайсці на гімнастыку. У нашай школе была хоць і ў падвальным памяшканні, але даволі вялікая ў параўнанні з іншымі спартыўная зала — з усімі гімнастычнымі снарадамі. Там я і рабіла першыя крокі ў гімнастыцы. А потым настаўнік фізкультуры Мікалай Фёдаравіч Траццяк завёў нас, групу дзяўчат, у дзіцячую спартыўную школу да Рэнальда Іванавіча Кныша. Гэтай залы на вуліцы Клары Цэткін (цяпер Дамініканская) ужо даўно няма.

— Што яна сабой уяўляла, калі параўноўваць з цяперашнімі гімнастычнымі залами?

— На першым паверсе будынка размяшчаўся... халадзільнік, куды прывозілі мясныя тушы, а на другім — зальчык (пэўна, меншы за памер дывана для вольных практыкаванняў) з пячным ацяпленнем. Тут жа знаходзіўся брыкет для трох печак. Вышыня была недастатковая і, калі круцілі абароты на перакладзіне, то даставалі нагамі столь. Таму менавіта ў гэтым месцы, дзе можа адбывацца дакрананне, у столі выразалі квадрат і павялічылі вышыню. Бервяно з аднаго боку мацавалася да сценкі, а з другога — да стаяка, са штырамі для рэгулявання вышыні.

ТАЛЕНТ ТРЭНЕРА І ТАЛЕНТ ВУЧНЯ

— І ў такіх умовах пачынаўся шлях да алімпійскага п'едэстала...

— Пра тое, што цяпер можа паказацца неверагодным, я тады і не задумвалася. Сяброўкі, якія разам са мной прыйшлі ў гімнастычную секцыю (каля дзесяці чалавек), надоўга там не затрымаліся. А мне падабалася — і займалася, старалася ўсё рабіць добрасумленна. Канешне, нагрузкі, як і ў любога, хто хоча нечага дабіцца ў спорце, былі каласальныя. У Рэнальда Кныша было так: раніцай — зарадка, потым — адна трэніроўка, пасля абеду і гадзіны адпачынку — другая, а то і трэцяя. І так — кожны дзень. Ды і з адпачынкам не так, як у іншых дзяўчат. Аднойчы мы з Тамарай Аляксеевай тайком збеглі на танцпляцоўку ў гарадскім парку, а назаўтра чуем ад Рэнальда Іванавіча: «Што, натанцаваліся? А сілы на трэніроўку будуць?» Хтосьці ўжо трэнеру паведаміў альбо сам убачыў.

Зрэшты, калі робіш любімую справу, то праца на трэніроўках і пэўныя абмежаванні ў асабістым жыцці цяжарам не з'яўляюцца.

ПРАЗ ГАЛАВУ СКОКНУЦЬ, АЛЕ І ВЫШЭЙ»

ПРА СПОРТ, АДНОСІНЫ І СПЕЦЫФІКУ ЖАНОЧАГА КАЛЕКТЫВУ

шкодзіла б трэніравацца разам, дзяўчынкі б цягнуліся, а хлопчыкі набывалі ўпэўненасць.

— Трэнерам таксама павінен быць мужчына?

— На мой погляд, толькі мужчына. Жанчына, як правіла вельмі жорсткая, а нам патрэбна і пуга, і пернік. Тут, напэўна, яшчэ справа ў псіхалогіі, ва ўспрыманні. Мужчына зможа растлумачыць сітуацыю двума словамі, жанчыне спатрэбіцца чатыры. Акрамя таго гулец-жанчына яшчэ будзе сядзець і даказваць свой пункт гледжання трэнеру-жанчыне, мужчына спыняе гэта адным позіркам.

— Напэўна, і канфлікты бываюць нярэдка ў жаночым калектыве?

— Вядома, да таго ж, калі ў мужчын яны не пераносяцца на поле, то ў жанчын гэта можа лёгка здарыцца. Дзяўчаты не забываюць сваркі так хутка, як хлопцы, таму гэта можа адбівацца на гульні. Я заўсёды казала сваім напарніцам: вы можаце ненавідзець мяне за тое, што я кажу вам праўду ў вочы, можаце наогул не вітацца са мной на вуліцы, але калі мы выходзім на поле, то павінны быць адной камандай.

— Вы зарабляеце футболам?

— Гэта вельмі складана зрабіць у нас у краіне, але ў двух клубах — можна, не буду іх называць. У камандзе, дзе гуляю я, лепш мець дзве працы. Раней я, напрыклад, падзарабляла масажам, дапамагала маме па бізнесе.

«У жыцці ў мяне стаяў выбар: спорт або адносіны»

— Чаму вы ўвогуле выбралі футбол?

— Між школамі былі спаборніцтвы, трэнер проста прыйшоў да нас на фізкультуру, каб адабраць туды дзяўчынак. Я, вядома, пагадзілася, таму што мне падабалася бегаць, а з мячом, думаю, пазней ужо навучуся. Потым мой трэнер прыйшоў да мамы прасіць, каб яна аддала мяне ў секцыю, яна паслала яго куды далей, сказала — «не пушчу». Яна, дарэчы, да гэтага часу супраць, толькі я не разумею чаму. У дзяцінстве я гаварыла, што іду ў школу, а сама бегла на трэніроўку. Мне падабалася з пацанамі папіхацца, па нагах ім улупіць, калі табе 13 гадоў, падножку паставіць — гэта ж шчасце.

Потым трапіла ў малодшую каманду «Баброўчанкі», сезон там патрэніравалася, і мяне забралі ў старэйшую. Так з 94-га года пачалася мая кар'ера пад кантрактам, першая зарплата, за якую я купіла сабе красоўкі.

— У дзяцінстве былі хуліганкай?

— Так, з пацанамі расла, гэта выхоўвае.

— А цяпер такі не зусім жаночы род дзейнасці накладвае адбітак на адносіны з процілеглым полам?

— Наогул, я не кажу мужчынам пра тое, што футбалістка, кажу, што так проста займаюся спортам для сябе, бегаю. Калі яны даведваюцца пра маю прафесію — адразу іншае стаўленне, гэта звычайна заканчвалася адным спатканнем. Мне трапляюцца мужчыны, якія не вельмі любяць футбол, асабліва жаночы. Некалькі разоў у жыцці стаяў выбар: спорт або адносіны, і я заўсёды выбірала футбол.

— Зараз ваша сэрца свабоднае?

— Не, у мяне ёсць другая палова і я вельмі шчаслівая. Ён не спартсмен і ніяк не звязаны з гэтым родам дзейнасці. Я заўсёды казала: калі ты футбаліст, то дакладна не мой мужчына. Я ж іх ведаю, навошта ў сям'і два футбалісты? Мы ж ніколі не знойдзем кропку судакранання.

«Я ўсё ўмею рабіць, нават плітку класці»

— Вы нарадзілі дзіця, вярнуліся ў футбол, і ваша кар'ера пайшла ўгару. Як так атрымалася?

— У 2008 годзе мяне запрасілі ў «Варонеж», на той момант я ўжо мела два «срэбры» і адну «бронзу» чэмпіянату Расіі, чэмпіёнскія тытулы Беларусі і Казахстана. Таму, нягледзячы на тое, што ў Варонежы вельмі моцная каманда, адмовілася, вырашыла, што мне хопіць. Праз два гады нарадзіла дзіця, і так атрымалася, што месяц жыла з ім зусім адна. Таму вырашыла патэлефанаваць Мікалаю Фёдаравічу Касаткіну (трэнер бабруйскага клуба), спытаць, ці можна прыйсці на трэніроўку. Ён дазволіў, і я да гэтага часу яму за гэта вельмі ўдзячная.

Прыйшла на трэніроўку, а ўжо на наступны дзень выйшла гуляць у асноўным складзе, праўда, правяла на полі толькі адзін тайм — пасля родаў прайшоў усяго месяц, таму арганізм быў яшчэ не зусім гатовы да такіх нагрузак. Іосіф у гэты час быў побач з полем, спаў у калясцы.

У наступным сезоне (2011 год) я ўжо была лепшым гульцом у камандзе, у 2012-м стала лепшай нападаючай краіны.

— Раскажыце пра Іосіфа?

— Майму дзіцяці зараз 5 гадоў, бывае, бачу ў ім сябе. Сын сказаў, што будзе варатаром, я была ў шоку. Годнага галкіпера вырасціць вельмі складана, яны ж зусім іншыя людзі, каб быць варатаром, трэба ім нарадзіцца. Калі Іосіф абярэ спорт, я, вядома, не буду супраць, але ўсё роўна павяду яго яшчэ ў адну дарогу. Я бачыла ў жыцці толькі адзін шлях — спорт, хачу каб ён змог і машыну адрамантаваць і каб кнігі чытаў.

— Не здзіўлюся, калі вы і самі мужчынскімі навыкамі валодаеце.

— Калі чалавек таленавіты — то ва ўсім, не толькі баршчы варыць, шыць або жангліраваць. Калі разабрацца, то я ўсё ўмею рабіць, нават плітку класці, шпалеры клеіць, гэта ў мяне ад мамы. Але дзяўчынкам не варта паказваць такія здольнасці.

— А што тычыцца жаночых заняткаў?

— Я ўмею шыць, вось нядаўна ліпучкі Іосіфу на басаножках перашывала, гатую часта. У асноўным гатую тое, што падабаецца маёй сям'і: галубцы, боршч, калдуны. На гітары ўсё жыццё мару навучыцца іграць, люблю спяваць у караоке.

— Што спяваеце?

— Многія песні Рыгора Лепса люблю, Міхаіла Баярскага «Зялёнавокае таксі» — гэта наогул выдатна. Я, калі была ў Егіпце, выйграла конкурс і стала міс гатэля, з гэтай нагоды ў мяне там быў бенефіс, вечарам я тры гадзіны спявала, пасля чаго падыходзілі людзі, і замежнікі і нашы, дзякавалі. Арганізатары нават прапанавалі заставацца працаваць аніматарам, але я не ведаю англійскай мовы (смяецца).

— На завяршэнне раскажыце пра свае планы.

— Заканчваць з футболам я не збіраюся, як кажуць мужчыны — яшчэ папылю. У мяне не хапае пятнаццаціразовага чэмпіёнства, таму хацела б зацвердзіць усе гэтыя тытулы і перш за ўсё даказаць сабе, што жанчына можа не толькі праз галаву скокнуць, але і вышэй.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

■ Легенды спорту

ЗА КАМПАНІЮ З СЯБРОЎКАМІ»

на Гродзеншчыне

— Зразумела, што спорт — гэта не толькі ўзнагароды, апладысменты гледачоў, слава, але і няўдачы, расчараванні, нерэалізаваныя магчымасці...

— Не магу сказаць, што цалкам скарысталася ў гімнастыцы сваім патэнцыялам. Магла б, верагодна, дабіцца і большага. Аднак існавалі пэўныя рэаліі, праз якія немагчыма было «пераскочыць» так, як у гімнастычнай камбінацыі. Напрыклад, гэта цяпер ужо норма ў многіх відах спорту, што спартсмен едзе на спаборніцтвы са сваім трэнерам. А падчас падрыхтоўкі да такійскай Алімпіяды 1964 года было інакш. Рэнальда Кныша на зборы не ўзялі — ліпень, жнівень, верасень і палову кастрычніка я займалася практычна сама. Методыка трэніровак кардынальна адрозніваласяад той, што была ў нас з Рэнальдам Іванавічам. Гэта як у школе, калі пасля аднаго настаўніка ў клас прыходзіць іншы. Здавалася б, праграма адна і тая ж, аднак для вучняў зусім не аднолькава.

— Тым не менш менавіта ваша вялікая заслуга ў тым, што зборная СССР заваявала на Алімпійскіх гульнях у Токіа камандное «золата»...

— Не трэба рабіць з мяне героя, але вазьму на сябе смеласць сказаць, што мая заслуга ў перамозе савецкай каманды сапраўды ёсць. Уявіце сабе сітуацыю. На другі дзень спаборніцтваў мы выйшлі, прайграючы чэшкам 0,7 бала. Першы снарад — брусы. Усе мы працавалі з магнэзіяй, і толькі Тамара Маніна ёй не карысталася — рукі і жэрдкі ў яе павінны былі быць без гэтага сродку. А я разміналася за ёй. Падыходжу да брусоў: раз «з'язджаю» з жэрдак, другі... Пасля трэцяй няўдачы вырашыла зрабіць размінку ў канцы выдзеленага часу, атрымаўшы магнэзію. Паглядзела на трыбуну — Рэнальд Іванавіч (ён там турыстам сядзеў) пакруціў пальцам каля скроні. Маўляў, глупства раблю. Так і аказалася: час на размінку скончыўся, і я не паспела патрэніравацца. А далей...

Першая думка перад пачаткам выступлення на брусах у мяне была такая: залік ідзе па пяці спартсменках з шасці, і калі я практыкаванне завалю, то каманду выцягнуць іншыя. Але тут... Першай выступае Людміла Громава — падае. У Тамары Манінай — таксама няўдача. Шмат страчваем у балах і права на памылку ўжо няма. Падыходзіць мая чарга. Гэта быў адзіны выпадак у маёй спартыўнай біяграфіі, калі я выйшла да снарада і вельмі доўга перад ім стаяла, бо... не бачыла жэрдак. Такое было хваляванне. Не за сябе — за каманду, бо ў выпадку і майго зрыву шанцаў на перамогу ў нас ужо не заставалася. І я зрабіла сваю камбінацыю, як трэба.



ЗМАГАЦЦА І ШУКАЦЬ, ЗНАЙСЦІ І НЕ ЗДАВАЦЦА

— Хтосьці з блізкіх пайшоў па Вашых спартыўных слядах?

— Не.

— Не шкадуеце?

— А навошта? У кожнага павінен быць свой жыццёвы шлях, і свае «шышкі» трэба набіваць самім.

— А як абазначыце сваё жыццёвае крэда?

— Я шмат чытала і чытаю цяпер. Мусіць, мне вельмі блізкі знакаміты дэвіз з кнігі Веніяміна Каверына «Два капітаны»: «Змагацца і шукаць, знайсці і не здавацца». Памятаю, на зборах перад такійскай Алімпіядай у мяне ніяк не атрымліваўся мой пералёт на брусах: падзенне за падзеннем. Рэнальд Іванавіч (хоць мяне і аддалі іншаму трэнеру, у той дзень ён усё ж прыехаў) сказаў мне выкінуць гэты элемент з праграмы, бо стаяла задача трапіць у каманду. Але я адмовілася рабіць практыкаванне менш складаным і ўсё ж яго выканала.

Вышэйпамянёны дэвіз важны не толькі ў спорце, а ў розных жыццёвых сітуацыях. Калі нехта з маіх студэнтаў авалодаў не толькі тэорыяй і методыкай фізічнай культуры, але і сфарміраваўся як асоба, дастойны чалавек, буду лічыць сваю выкладчыцкую работу недарэмнай. Дарэчы, мае вучні, працуючы цяпер у розных навучальных установах, часта запрашаюць мяне на сустрэчы ўжо са сваімі выхаванцамі. А некаторыя тэлефануюць, каб проста пагаварыць па шчырасці. Такія адносіны дарагога вартыя.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

ПОПЫТ НА СЛАВЯНСКУЮ ПРЫГАЖОСЦЬ

Ці можа дзяўчына з райцэнтра стаць топ-мадэллю?

Паказы Prada і Armani, кантракт з мадэльным агенцтвам Нью-Ёрка, вокладка Vogue — вось далёка не поўны спіс дасягненняў беларусак. Якія тыпажы сёння запатрабаваныя і ці можна спадзявацца толькі на знешнасць, у інтэрв'ю «Звяздзе» расказала Ніна ДРАКО, дырэктар подыум-школы і рэжысёр-пастаноўшчык Студыі моды Сяргея Нагорнага.

— Пачнём адразу з галоўнага. Як становяцца «зоркамі»?

— «Зорны» чалавек у любой прафесіі апрыёры разумны, цярплівы, працаздольны, удачлівы. Топ-мадэллю стаць няпроста. У любым выпадку ўсё пачынаецца з навучання. У подыум-школе асвойваюць такія спецыяльныя дысцыпліны, як дэфіле, этыкет, асновы стылю, сцэнічнае майстэрства.

На подыуме яшчэ, бадай, найбліжэйшыя гадоў 20 будзе панаваць канон вытанчаных дзяўчат. На высокіх і худых адзенне льецца. Гэта вельмі прыгожа.

— З тых дзяўчат, што да вас прыходзяць, які працэнт выбіваецца на сусветныя подыумы?

— Мы заўсёды кажам, што гэтая прафесія эксклюзіўная. Яна прымае нямногіх. Тут як з дзецьмі, што заканчваюць харэаграфічныя вучылішчы і музычныя школы. Не ўсе ж з іх становяцца прымамі і вядомымі музыкантамі. Патрэбны сапраўды высокія прафесійныя якасці. Наша каманда спрабуе расшыфраваць код прыгажосці, паспяховасці новага моднага сезона. Як дызайнеры ствараюць трэнд у адзенні, так і мы пралічваем модны твар наступнага сезона. І ён можа кардынальна адрозніваца ад таго, што было год таму. Таму мы заўсёды ў пошуку імёнаў. Кагосьці выпадкова сустракаем на вуліцы. Нават калі мы з Сяргеем Нагорным і Вольгай Паповай (генеральным дырэктарам і дырэктарам міжнароднага аддзела, дэпартамента новых імёнаў) проста ідзём выпіць кавы, углядаемся ў дзяўчат і хлопцаў, якія сядзяць за суседнімі столікамі.

На пачатку верасня ў 13 гарадах Беларусі — Брэсце, Віцебску, Бабруйску і іншых — мы праводзім кастынгі. Прыходзяць дзяўчаты з райцэнтраў, вёсак. За год да нас звяртаецца — праз асабістыя сустрэчы, сацыяльныя сеткі — некалькі тысяч чалавек. З іх у найлепшым выпадку 30 абновяць мадэльны склад. Гэта з усіх філіялаў. А працэнт тых, хто будзе працаваць на тыднях моды ў Лондане і Парыжы, яшчэ меншы.

Бывае, звяртаюцца людзі, якія не зусім разабраліся, што ўяўляе сабой прафесія мадэлі. Ім проста хацелася б нейкай папулярнасці. Такія падлетка-выя мары. Хоць мы ўсім удзячныя. Бо часта разам з імі прыходзяць іх сяброўкі ці сёстры, якія якраз нам патрэбны. Такіх гісторый вельмі шмат.

— Вось вы кажаце, што патрэбны працаздольнасць і прафесіяналізм. А калі спадзявацца толькі на знешнасць?

— Тыя мадэлі, якія ў 15-16 гадоў ужо праходзяць кастынгі ў Еўропе, павінны заканчваць школу, паступаць у ВНУ на завочную форму і паспяваць усё. Зняцца для моднага часопіса не так проста. Для гэтага трэба не толькі прыгожа ўсміхацца. За кожнай вокладкай, выхадам у самых гучных паказах на еўрапейскіх тыднях моды стаіць вялізная праца. Мы памятаем, колькі зроблена, каб дзяўчына з Барысава Жэня Катава стала тварам Dolce & Gabbana, каб Маша Царыкевіч з Мазыра выйшла ў эксклюзіўным паказе ад Prada. Проста трапіць на такі кастынг — ужо вельмі шмат. Там стаяць у чарзе найлепшыя мадэлі свету.

Віцябчанка Лера ВАРАБ'ЁВА на паказе ў Мілане.

— Калі бачыце чалавека, можаце адразу сказаць: «О, гэта будучая топ-мадэль!»?

— Можам, вядома. Але тут няма 100-працэнтнай гарантыі. Мы можам толькі выказаць здагадку: гэты чалавек, хутчэй за ўсё, будзе запатрабаваны ў Амерыцы, а той — у Парыжы. Можа і не спрацаваць. З розных прычын. Стан здароўя мадэлі, замужжа... Бывае і наадварот. У мадэляў, пра якіх мы думалі «магчыма, давайце паспрабуем», кар'ера складваецца вельмі паспяхова.

— Якія тыпажы цяпер запатрабаваныя?

— Сёння подыум заўважна памаладзеў. Калі раней у асноўны склад мадэльнага агенцтва дзяўчаты прыходзілі ў 19—20 гадоў, то цяпер — у 13. Яны, калі заканчваюць школу, ужо разумеюць, чым будуць займацца далей.

Славянская прыгажосць запатрабаваная. Дзяўчаты, якія атрымліваюць запрашэнні, як правіла, тыповыя беларускі з прыгожымі пшанічнымі валасамі, разумнымі вачыма, з характарам. Рост ад 170 сантыметраў. Кагосьці просім адnавіць колер валасоў ці бровы адрасціць. Усё, што тычыцца сантыметраў, карэкціруецца, калі размова ідзе пра прафесійны старт. Але звяртаюся да ўсіх чытачак: не трэба адразу актыўна скідваць кілаграмы. Можа, вам гэта проста не патрэбна.

— Дзяўчаты на подыумах — не заўсёды прыгажуні ў класічным разуменні. Чаму ў модзе папулярныя дзіўныя твары і позы?

— Справа ў тым, што кожны дызайнер у сваёй калекцыі стварае пэўны настрой. Мадэль — тое палатно, з дапамогай якога гэты вобраз дэманструецца. Адсюль і дзіўныя позы. На паказах высокай моды некласічная прыгажосць, агрэсіўная ці нават «непрыгожая», бударажыць. Мастацтва заўсёды мусіць выклікаць эмоцыю. Мода — гэта не тое, што павінна падабацца ўсім.

Дызайнеры даўно былі б забытыя, калі б зачапіліся за нейкі адзін вобраз. Безумоўна, у кожнага ёсць свая традыцыя. Дом моды Valentino часцей за ўсё апявае класічныя каноны прыгажосці — і ў адзенні, і ў вобразе мадэлі. Што мы ніколі не ўбачым у амерыканскага дызайнера Тома Браўна. Там можа быць правакацыя, скандал, аголеныя мадэлі на сцэне.

Топ-мадэль з Барысава Жэня КАТАВА стала тварам Dolce & Gabbana.

«За год да нас звяртаецца — праз асабістыя сустрэчы, сацыяльныя сеткі — некалькі тысяч чалавек. З іх у лепшым выпадку 30 абновяць мадэльны склад».

— А што з параметрамі? Калі паглядзець на дадзеныя мадэлі, то атрымліваецца, што нават 90-60-90 — гэта ўжо шмат.

— На подыуме яшчэ, бадай, найбліжэйшыя гадоў 20 будзе панаваць канон вытанчаных дзяўчат. На высокіх і худых адзенне льецца. Гэта вельмі прыгожа. Мне асабіста падабаюцца такія мадэлі: вытанчаныя, празрыстыя, з тонкімі кісцямі, шыяй. Так, гэта вельмі высокі стандарт. Але, хачу заўважыць, што ў нас на дыетах практычна ніхто не сядзіць. У дзяўчат збалансаванае харчаванне, якое адпавядае іх нагрузкам. І спорт — басейн, напрыклад.

— Мадэляў «плюс» шмат набіраеце? На іх, калі шчыра, ёсць попыт?

— Не. Запатрабаваны заўсёды стандарт. А памер «плюс» — асаблівасці таго ці іншага паказу. На эксклюзіўны выпадак. Хоць выключэнне заўсёды мае права быць. Мне, напрыклад, вельмі падабаецца, калі мужчынскі касцюм дэманструе дзяўчына.

— Дарэчы, пра хлопцаў. Ці шмат іх прыходзіць у індустрыю?

— Гэты шлях хутчэй для дзяўчат. Адзінкі хлопцаў прыходзяць у мадэльную гісторыю. Па сваім агенцтве бачым, што яны менш запатрабаваныя. Дызайнеры часцей ствараюць жаночыя калекцыі. Так больш выгадна ў камерцыйным плане: жанчыны больш сочаць за модай. Я лічу, што мадэльны бізнес — гэта не зусім мужчынская прафесія. Хутчэй, хобі.

— Дзе нашы дзяўчаты запатрабаваныя?

— Усюды. Славянскі тыпаж чакаюць у Амерыцы, Еўропе, Японіі. Беларускія мадэлі заваёўваюць такія подыумы, як Calvin Klein, Dior, Chanel.

— А што лічыцца верхам кар'еры?

— Быць папулярнай і запатрабаванай. Мадэль паспяховая тады, калі ў яе шмат працы. Можна зрабіць адзін паказ ад Prada (здаецца, куды вышэй) — і больш нічога. І тады ўсім доўга расказваць: «А вы ведаеце, што тры гады таму я ўдзельнічала ў гэтым паказе? Не?»

— Калі разглядаць Беларусь: мадэль знойдзе ў нас працу?

— Вядома. Мадэль патрэбна тады, калі ёсць дызайнеры і фатографы. Дзяўчаты здымаюцца для відэарэкламы, каталогаў. І не трэба думаць, што мадэлямі становяцца толькі сталічныя жыхаркі. Мы знаходзілі «зорак» і ў Маларыце, Фаніпалі, Жодзіне. Шанцы аднолькавыя ва ўсіх.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by
Фота Студыі моды Сяргея НАГОРНАГА.

ОБЪЯВЛЕНИЕ о торгах

Наименование (описание) имущества и его стоимость	Лот №1. Экскаватор ЭТЦ, стоимость 337 425 000 руб.; Лот №2 Трактор Т-130, стоимостью 248 297 742 руб.
Собственник (владелец) имущества	Витебское коммунальное унитарное снабженческо-сбытовое предприятие «Витебскснабмелиоводхоз»
Местонахождение имущества	Лот №1: Витебская область, г. Дубровно, ул. Кондратьева, 56а; Лот №2: Витебская область, Оршанский район, п. Высокое, ул. Садовая, 13 По всем вопросам касающимся осмотра имущества обращаться к директору Витебского коммунального унитарного снабженческо-сбытового предприятия «Витебскснабмелиоводхоз» Аксенову Виктору Викторовичу (МТС(29) 1070881)
Наличие обременений	ЗАЛОГ
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, д. 10/1 16 февраля 2016 года в 10.00
Справочная информация об организаторе торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, д. 10/1, каб. 2.3 Судебный исполнитель Ланцунцевич Сергей Александрович тел. (0212) 61 40 06, (033) 6879142 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович тел. (0212) 61 40 15. (033) 6878807
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 - Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 14.00 часов 15 февраля 2016 года. Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Начальник управления принудительного исполнения
Главного управления юстиции
Витоблисполкома А.И. Коржов

Логойский сельский исполнительный комитет сообщает о проведении 2 марта 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Инженерная инфраструктура	Начальная цена, руб.	Расходы по подготовке землеустроительной документации руб.	Задаток (рублей)
1	д. Заозерье, ул. Речная, д.27А 623284602101000178	0,1253	водоснабжение, газоснабжение	42 832 600	14 158 200 + реклама	4 283 300
2	д. Рудня, ул. Центральная, д.24 623284605101000046	0,1468	водоснабжение, электроснабжение	26 659 300	14 646 700 + реклама	2 666 000

Земельный участок в д. Заозерье, ул. Речная, д.27А имеет ограничения в использовании площадью 0,1253 га в связи с расположением в водоохранной зоне ручья № 2 и земельный участок в д. Рудня, ул. Центральная, д.24 имеет ограничения в использовании площадью 0,1468 га в связи с расположением в водоохранной зоне реки Гайна.
Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577, код 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.
Аукцион состоится 2 марта 2016 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. Последний день приема заявлений 25 февраля 2016 года до 17.00. Контактные телефоны: (801774) 55056, 55473.

НЕ ПАГРЭЛА СКРАДЗЕНАЕ ФУТРА

Сталічныя аператыўнікі раскрылі крадзеж норкавага футра коштам больш за 40 мільёнаў рублёў з павільёна аднаго з гандлёвых цэнтраў.

— Камеры відэаназірання зафіксавалі, як адна з наведніц, знаходзячыся побач з развешанымі футрамі, узяла адно з іх. Дзяўчына акуратна склала норкавы выраб, павесіла на руку і, скарыстаўшыся тым, што прадаўцы былі занятыя абслугоўваннем іншых пакупнікоў, выйшла з секцыі праз вузкі праход. Апошні не быў абсталяваны ахоўнымі рамкамі. Было ўстаноўлена, што футра скрала беспрацоўная 23-гадовая жыхарка сталіцы.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Ликвидатор объявляет о продаже следующего имущества ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой» (УНП 690019233):

Таблица №1

№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов (движимое имущество)	Начальная стоимость с учетом НДС 20%
1	Бензорез Still TS 420	4 849 800
2	Кусторез Still	3 614 400
3	Сварочный аппарат НТС КАВИК	1 371 600
4	Паркетно-шлифовальная машина	1 987 200
5	Мозаично-шлифовальная машина	2 452 200
6	Вагон-бытовка	4 002 000
7	Вагон-бытовка	2 686 800
8	Вагон-дом	3 386 400
9	Вагон-дом	2 435 400
10	Вагон-дом	1 695 600
11	Вагон-дом	1 695 600
12	Автомобиль ГАЗ-31029	5 179 200
13	Автомобиль УАЗ-31512	9 952 800
14	Полуприцеп КАЗ-9368	5 338 800
15	Автомобиль ЗИЛ 130V1	8 358 000
16	Копировальный аппарат IR1600	4 453 200
17	Компьютер Филипс с МФУ MF4018 I-Sensys и пр. комплектующими, 2009 год	1 226 400
18	Компьютер ТАО с принтером Samsung ML-2010PR и пр. комплектующими, 2009 год	1 176 600
19	Компьютер Финист с комплектующими, 1998 год	1 124 400
20	Компьютер Финист с комплектующими, 1998 год	1 124 400
21	Компьютер ACEP с комплектующими, 2008 года	1 124 400
22	Компьютер с комплектующими, 1996 года	1 124 400
23	Форма для ФБС-40 см (2,5х1м)	1 878 600
24	Форма для ФБС-40 см (2,5х1м)	1 878 600
25	Форма для ФБС-40 см (2,5х1м)	1 878 600
26	Форма для ФБС-40 см (2,5х1м)	1 878 600
27	Форма для ФБС-40 см (5х1м) инв. 072310	1 878 600
28	Форма для ФБС-40 см (2,5х1м)	1 878 600
29	Форма для ФБС-40 см (2,5х1м)	1 878 600
30	Форма для ФБС-30 см (2,5х0,85м) инв. 102310	1 809 000
31	Форма для ФБС-30 см (2,5х0,85м)	1 809 000
32	Форма для ФБС-30 см (2,5х0,85м)	1 809 000
33	Форма для ФБС-30 см (2,5х0,85м)	1 809 000
34	Форма для ФБС-30 см (2,5х0,85м)	1 809 000
35	Форма для ФБС 50 см (2,4х1,3м)	1 948 800
36	Форма для ФБС 50 см (2,4х1,3м)	1 948 800
37	Форма для ФБС 50 см (2,4х1,3м)	1 948 800
38	Форма для ФБС 50 см (2,4х1,3м)	1 948 800
39	Форма для перемычек на 10 отделений (1,3х3м)	2 289 000
40	Форма для перемычек на 10 отделений (1,3х3м)	2 289 000
41	Форма для перемычек на 10 отделений (1,3х3м)	2 289 000
42	Форма для перемычек на 5 отделений (0,8х3м)	3 097 200
43	Форма для перемычек на 5 отделений (0,8х3м)	3 097 200
44	Форма для перемычек на 5 отделений (0,8х3м)	3 097 200
45	Форма для перемычек на 12 отделений (2х1,1м)	2 746 800
46	Форма для плитки, 50х50 см	75 600
47	Форма для плитки, 50х50 см	75 600
48	Форма для бордюров на 12 секций (2х1,1) инв 282310	1 422 000
49	Форма для фундаментной подушки	2 160 600
50	Емкость для хранения нефтепродуктов, 11 м³	13 287 000
51	Емкость для хранения нефтепродуктов, 11 м³	13 287 000
52	Емкость для хранения нефтепродуктов, 11 м³	13 287 000
53	Емкость, 2,20х2,80 – объем 5,3 м³	3 501 000
54	Емкость, объем 78 м³	23 913 600
55	Емкость, объем 78 м³	23 913 600
56	Стол строительный (железный), 5,4х2,1	384 000
57	Стол строительный (железный), 5,4х2,1	384 000
58	Стол строительный (железный), 5,4х2,1	384 000
59	Стол строительный (железный), 5,4х2,1	384 000
60	Стол строительный (железный), 5,4х2,1	384 000
61	Стол строительный (железный), 5,4х2,1	384 000
62	Стол строительный (железный), 5,4х2,1	384 000
63	Стол строительный (железный), 5,4х2,1	384 000
64	Стол строительный (железный), 5,4х2,1	384 000
65	Стол строительный (железный), 5,4х2,1	384 000
66	Стол строительный (деревянный), 1х2	54 600
67	Стол строительный (деревянный), 1х2	54 600
68	Станок для распиловки дерева	16 537 800
69	Заточный станок инв 1048	2 060 400
70	Обрезной станок 821 инв	2 644 200
71	Станок для отбора четверти инв 7819	1 648 800
72	Плиты перекрытия 2,65х1,2 (кол-во: 5 шт.)	1 306 250
73	Плиты перекрытия 3,25х1,45 м	307 500
74	Плиты перекрытия 2,97х1,45 (кол-во: 6 шт.)	1 740 000
75	Плиты под колодцы 2,50х1,75 (кол-во: 6 шт.)	1 050 000
76	Фундаментная подушка 1,95х50 (кол-во: 13 шт)	2 925 000
77	Нивелир НИ-3, произ. Украина (в комплекте триноги,линейка)	960 000
78	Перфоратор Bosch CBH 2-26 DFR	1 148 750
79	Перфоратор Bosch CBH 2-26 DRE	1 148 750
80	Бензорез Still TS 4000	2 505 250
81	Циркулярная пила ДИОЛД ДП-1.3-160	387 000
82	Бензопила	774 050
83	Капитальное строение с инв. №663/С-10604, общая площадь, кв.м. -941,7, расположенное по адресу: город Мядель, ул. Интернациональная, 17 на земельном участке площадью 2,5099 га с кадастровым №624050100001001502 на праве постоянного пользования	202 800 000

Торги в отношении имущества, указанного в таблице №1, проводятся повторно третий раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 13.01.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов движимого и недвижимого имущества снижена на 50%.

Таблица №2

№ Лота п/п	Наименование	Ед.изм.	Количество	Начальная стоимость с учетом НДС 20%
1	Балон газовый	шт	1,00	142 412
2	Кабель АВВ 2х4	пог.м	24,00	13 174
3	Кабель сварочный	пог.м	24,00	129 292
4	Провод ПВС 3,0х1,5	м	120,00	668 261
5	Провод 2х6 б\у	м	100,00	648 000
6	Сетка плетен. зелёная	рул	2,00	2 235 600
7	Удлинитель 10.9	шт	1,00	140 309
8	Фонарь передний с бок. повтор.	шт	2,00	69 556
9	Арматура (в ассортименте)	кг	970,92	6 810 216
10	Балон газовый	шт	1,00	142 411
11	Блок балконный	м²	20,83	2 839 681
12	Блок дверной	м²	18,79	2 381 011
13	Блок дверной «Адалия»	шт	2,00	367 120
14	Блок оконный	м²	26,92	6 707 811
15	Блок оконный 4,5-6	шт	6,00	510 075
16	Блок оконный 9-9	шт	7,00	2 754 247
17	Ванна чугунная 170х70	шт	1,00	2 438 516
18	Ванночка малярная	шт	4,00	103 321
19	Вентблоки	шт	2,00	58 385
20	Вентель	шт	30,00	274 821
21	Воронка расширительная	шт	8,00	124 226
22	Выключатель	шт	61,00	120 511
23	Выключатель автоматический	шт	1,00	24 840
24	Гайка	шт	25,70	178 165
25	Гвозди строительные	кг	97,00	1 092 675
26	Головка д.50	шт	11,00	254 470
27	Дверки люка	м²	2,43	679
28	Дверь подвальная	шт	19,00	11 031 388
29	Двойное соединение	шт	2,00	6 901
30	Держатель желоба водосточного	шт	30,00	312 790
31	Динрейка	шт	1,00	22 680
32	Доска п/оконная	пог.м	127,80	3 887 614
33	Доска подоконная	м²	3,33	220 179
34	Доска подоконная окраш.	м²	28,02	5 662 670
35	Дюбель -анкер	шт	13,00	21 060
36	Дюбель быстр. монт с гвоздём 6х60	шт	250,00	69 589
37	Дюбель быстрого монтажа	шт	190,00	113 368
38	Дюбель с гвоздём	шт	600,00	175 967
39	Желоб водосточный	пог.м	5,00	440 584
40	Жилет сигнальный	шт	29,00	551 257
41	Кабель 1х16 б\у	м	34,00	301 288
42	Кабель 2х2,5 б\у	м	55,00	113 850
43	Кабель Кг 3х2,5	м	13,00	222 309
44	Колено	шт	13,00	31 256
45	Колено 45 ду 110	шт	1,00	13 050
46	Колено 50\45	шт	7,00	31 498
47	Колено 90\60	шт	16,00	139 104
48	Кольца резиновые	шт	8,00	11 638
49	Кольца резиновые САМ	шт	4,00	61 158
50	Комплект для креплен кронштт.	шт	1,00	3 599
51	Конек	шт	5,00	87 863
52	Контрогайка	шт	357,00	308 971
53	Кран шаровой	шт	29,00	769 422
54	Крепление для кронштейна	шт	153,00	182 933
55	Крепление для полотенцесушителя	шт	6,00	20 088
56	Крепление металлопласт	шт	10,00	26 296
57	Крестовина	шт	92,00	394 332
58	Крестовина металлопласт	шт	1,00	12 960
59	Кровельная мембрана	рул	1,00	241 531
60	КТР-100	шт	1,00	7 020
61	Лента малярная	рул	16,00	305 459
62	Лента сигнальная	пог.м	200,00	42 297
63	Линейка 1 метр	шт	1,00	8 959
64	Линейка 1,5 метра	шт	1,00	2 862
65	Линейка 3 метра	шт	1,00	3 780
66	Линейка 5 метров	шт	1,00	4 698
67	Лючок 200х400	шт	1,00	78 337
68	Маяк штукатурный 3 м	шт	50,00	432 000
69	Метчик М-20х2	шт	1,00	37 411
70	Муфта	шт	384,00	1 542 965
71	Муфта	шт	5,00	197 694
72	Муфта к полотенцесушителю	шт	6,00	61 968
73	Муфта-пресс	шт	20,00	215 978
74	Муфта-переходник	шт	38,00	194 289
75	Нагреватель воздуха газ.	шт	1,00	1 415 221
76	Нагреватель промышленный	шт	1,00	747 138
77	Накладка на подоконник	шт	8,00	26 749
78	Наличник	пог.м	10,10	284 372
79	Наличник	м	150,00	201 082
80	Наличник окрашенный	пог.м	1 354,00	11 999 558
81	Напольное покрытие ПВХ	м²	104,53	4 382 337
82	Обогреватель «Каприз»	шт	2,00	183 060
83	Обои (в ассортименте)	м2	257,79	1 589 181
84	Ограждение торцовое	шт	2,00	19 693
85	Окно ОД 10,7,5,15	шт	1,00	3 395 235
86	Окно ОД 10.9.9	шт	3,00	6 104 507
87	Окно ОД10.6,18	шт	1,00	2 525 239
88	Отвод	шт	1 007,00	2 085 452
89	Отвод	шт	15,00	31 683
90	Отвод д110	шт	5,00	44 777
91	Отвод стальной	шт	8,00	137 488
92	Переход ПП110\50	шт	4,00	23 399
93	Планка	шт	15,00	301 919
94	Планка торцовая	пог.м	209,00	8 453 440
95	Планка угла наружного	пог.м	8,00	103 394
96	Пленка гидроизоляционная	м²	255,88	452 386
97	Плинтус	пог.м	133,81	223 408
98	Плинтус	пог.м	30,39	34 286
99	Плинтус с кабель каналом	пог.м	2,60	18 673
100	Плита из минваты	м³	1,98	2 640 924
101	Плитка Грес	м²	5,63	345 845
102	Плитка декоративная	шт	100,00	5 832
103	Плитка облиц. 300х200 стеновая	м²	2,64	178 200
104	Плитка облицовочная	м²	10,54	569 160
105	Плиты минераловатные	м³	1,00	1 542 251
106	Плиты пенополистерольн. ППТ -20	м³	0,50	250 192
107	Плиты ППТ-15 пенополистерольные	м³	4,99	2 250 661
108	Подоконник	пог.м	18,60	371 440
109	Пояс предохранительный	шт	1,00	52 426
110	Провод б\у	м	4,00	3 956
111	Провод ПНСВ	м	50,00	24 192
112	Провод САПС б\у	м	68,20	319 294
113	Прочистка	шт	7,00	23 309
114	Рама	шт	17,00	933 112
115	Рама проходная	шт	3,00	157 950
116	Рама с лестницей	шт	1,00	57 921
117	Рама балконная	м²	9,86	639
118	Рейка 2 метра	шт	1,00	90 720
119	Рейка контрольная	шт	2,00	223 285
120	Рейка контрольная	шт	1,00	165 564
121	Рейка нивелирная	шт	2,00	286 330
122	Рулетка 20,м	шт	1,00	19 349
123	Рулетка 10 метров	шт	1,00	57 803
124	Рулетка 3м	шт	1,00	14 568
125	Рулетка 5,0м	шт	2,00	38 134
126	Рулетка 50 метров	шт	1,00	44 912
127	Саморез 3,5х45	шт	1 042,00	131 287
128	Саморез для гипсокартона	шт	800,00	46 203
129	Саморез кровельный 4,8х38	шт	200,00	116 640
130	Смеситель	шт	4,00	240 515
131	Соединение желоба	шт	15,00	194 287
132	Соединение ПВХ	шт	2,00	18 900
133	СПД 10-4-10-4-10-стеклопакеты	м²	2,20	196 959
134	Специзделие отлив	м²	16,30	939 366
135	Стекло оконное	м²	10,37	162 483
136	Стеклопакет двухкамерный	м²	0,99	80 584
137	Стеклоткань	м	88,00	406 771
138	Тепловая пушка	шт	1,00	576 000
139	Тройник	шт	67,00	750 635
140	Тройник для п\э д.32	шт	5,00	240 660
141	Тройник ду-20	шт	3,00	21 714
142	Тройник оцинков .ду-15	шт	12,00	86 664
143	Тройник ПВХ 100	шт	3,00	34 966
144	Тройник ПВХ 32х32	шт	2,00	39 555
145	Тройник соединительный	шт	6,00	146 616
146	Труба металлопласт	пог.м	9,00	67 558
147	Труба 160 х3м	м	0,80	38 362
148	Труба а/ц диам.400	пог.м	2,50	151 632
149	Труба а\ц 200	пог.м	5,00	250 182
150	Труба ВГП д.25	м	5,00	123 745
151	Труба ВГП ду40 ст .	кг	34,00	249 696
152	Труба ВГП оц 20 х2,8х6000	м	6,00	174 195
153	Труба Д-150-ЧВ	шт	2,00	430 829
154	Труба Д-20	кг	14,92	126 118
155	Труба Д-20 оцинкованная	кг	42,00	123 956
156	Труба Д-25 стальная	кг	12,00	97 200
157	Труба Д-32	кг	13,00	44 748
158	Труба металлическая	кг	8,15	18 806
159	Труба пластм. к водостойк. системе	пог.м	28,00	306 059
160	Труба ПНД 160х1,5м	шт	3,00	215 784
161	Труба ПНД 160х4м	шт	4,00	767 232
162	Труба ПЭ -100	м	8,40	67 357
163	Труба ПЭ 110	пог.м	57,80	1 400 669
164	Труба ПЭ 63-100	пог.м	20,35	156 989
165	Труба Ч-В	шт	6,00	398 779
166	Труба чугунная	пог.м	6,00	151 146
167	Удлинитель д. 10 м	шт	1,00	50 015
168	Удлинитель д.15 м	шт	2,00	150 044
169	Хомут 90	шт	65,00	256 202
170	Хомут с дюбелем и шурупом	шт	50,00	18 792
171	Хомутик	шт	60,00	191 981
172	Хомуты КТР	шт	317,00	636 209
173	Цветочница	шт	3,00	1 555 200
174	Чаша	шт	2,00	285 552
175	Черепица	шт	222,00	70 277
176	Черепица вентиляционная	шт	37,00	460 499
177	Черепица пазовая	шт	132,00	284 417
178	Черепица половинчатая	шт	120,00	572 832
179	Черепица проходная	шт	10,00	119 016
180	Черепица снегозадерживающая	шт	62,00	706 428
181	Черепица фронтонная левая	шт	8,00	51 814
182	Шайба	кг	31,50	237 667
183	Швеллер	кг	157,60	971 377
184	Щиты подмостей (Хихель)	м²	4,91	67 805
185	Осушитель воздуха б/у	шт	1	1 215 000

Торги в отношении имущества, указанного в таблице №2, проводятся повторно первый раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 19.12.2015 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов движимого имущества снижена на 10%.

Торги в виде **аукциона** состоятся **16 февраля 2016 года в 12.00** по адресу: **г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4** (по месту нахождения имущества). Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения, предварительно согласовав дату и время с организатором торгов.

Шаг аукциона – 5 процентов. Продавец – ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой» (тел.: (017) 268-54-52). Организатор торгов – ООО «Партнёр-Консультант» (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10, тел.: (017) 268-54-52 (Анастасия).

Прием заявок начинается с момента выхода объявления, осуществляется по месту нахождения организатора торгов и прекращается за три дня до начала торгов. Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 10 процентов от начальной цены предмета торгов (с НДС) на р/с 3012452420020 в Филиале ОАО «Белагропромбанк» Минское областное управление, код 942, УНП 690019233, получатель — ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой», назначение платежа: задаток за предмет торгов.

При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, возможна продажа предмета торгов этому участнику по цене, увеличенной на 5 процентов.

К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме с учетом НДС 20% не позднее 5 рабочих дней (30 рабочих дней для недвижимого имущества) с даты подписания договора купли-продажи.

■ Песню бярыце з сабой

ЗНАЕ ТОЛЬКІ БОГ АДЗІНЫ

Голас зямлі... Роднай зямлі!..
Меладычна-сцішаны,
напоўнены тугой і болем,
выпакутаваны ў змаганнях за роўнасць
і справядлівасць, ён абуджальна-ўпэўнена
гучыць у прасторы,
пералівістым звонам павольна
расплываецца да далягляду...

Спеў Івана Краснадубскага, заслужанага артыста Беларусі, прачула перадае мастацкую задуму аўтараў песні «Знае толькі Бог адзіны». Ён не спявае, ён задуменна-мужна прамаўляе душою пра духоўна-інтэлектуальную еднасць асобы з родным краем, мякка пазначае абрысы беларускіх краявідаў, працятых бязмежнымі людскімі перажываннямі, выказвае надзею на светлую прышласць.

Ігар Лучанок не ўпершыню звярнуўся да творчасці народнага паэта. Песня «Мой родны кут», створаная на адаптаваны тэкст з паэмы «Новая зямля», у выкананні «Песняроў» успрымаецца патрыятычфным гімнам. Да 110-й гадавіны Якуба Коласа кампазітар імкнуўся падрыхтаваць такі вакальны твор, у якім бы вячыста выявілася непаўторная філасофская глыбіня мастацкіх радкоў, высокае паэтычнае майстэрства ў адлюстраванні шматграннага жыццестваральнага духу беларускай зямлі. У аснову новай песні Ігар Міхайлавіч паклаў верш «Роднаму краю», які Якуб Колас з абвостраным успрыманнем рэчаіснасці напісаў у 1914 годзе, якраз напярэдадні грандыёзных грамадскіх узрушэнняў і сацыяльных пераўладкаванняў, што на цэлае стагоддзе істотна змянілі аблічча планеты.

Грамадзянска-патрыятычная пазіцыя Ігара Лучанка прасочваецца ва ўсіх яго творах і робіць іх высокадухоўнымі, шматаблічна выразнымі. І песня «Знае толькі Бог адзіны» абуджае гістарычную памяць, падтрымлівае веру ў светлую будучыню працавітага беларускага народа.

ЗНАЕ ТОЛЬКІ БОГ АДЗІНЫ

Верш Якуба КОЛАСА
Музыка Ігара ЛУЧАНКА

Знае толькі Бог адзіны,
Як мне любы лугавіны (2 р.)
І родныя межы,
Стужкі поля і дарогі,
Пустак немыя разлогі (2 р.)
І курганы-вежы.

Знае Бог адзін, як мілы
Мне мужычыя магілы (2 р.)
І той крыж драўляны,
Пад каторым косці тлеюць,
Дзе бярозкі зелянеюць (2 р.)
І на дол пясчаны
Майскім ранкам слёзы роняць,
І галінкі ціха клоняць, (2 р.)
І шумяць маркотна.

Тут я вырас, ўзгадаваўся,
Дзе спрадвеку
заснаваўся (2 р.)
І бруіць дрыготна
Жаль вялікі і пакута,
Дзе пануе гора люта (2 р.)
І нуда разліта.

І я зросся з гэтым горам,
Як віхры-вятры
з прасторам,(2 р.)
Як з загонам жыта.
А я песню заспяваю
Аб знішчоным
гэтым краі,(2 р.)
Дзе нам з вамі жыці.

Няхай стогне, няхай плача,
Покуль жыцце
стане йначай, (2 р.)
Плачам аддаецца.
І скрозь цемрадзь і гушчары,
Нібы сонейка
праз хмары, (2 р.)
Свет да нас прарвецца!

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН

Суботнік з Вожыкам

Хаханькі

❍ Вадзіцелі маршрутак разлічваюцца ў крамах, стоячы спінай да прадаўца.

❍ Калі пакупка аўтамабіля зусім не радуе, значыць, вы набылі яго жонцы, а крэдыт афармілі на сябе.

❍ Дзяльба шкуры незабітага мядзведзя сёння называецца бізнес-планаваннем.

❍ Мае суседзі слухаюць якасную музыку. І не важна, хочуць яны гэтага ці не.

Ахмет ХАНАЎ.

ЗАЯВА

«Начальніку аддзела кадраў таварыства з абмежаванай адказнасцю «Паўночнае ззянне» Паўлоўскаму Т. І. ад інжынера аддзела збыту Сідарава Анатоля Дзям'янавіча, 1959 года нараджэння, беларуса, добрасумленнага, працалюбівага, стараннага, ініцыятыўнага, дысцыплінаванага, вопытнага работніка, высокаэрудзіраванага, кампетэнтнага спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, які бачыць перспектыву і ўмее выбіраць прыярытэтныя напрамкі ў сваёй дзейнасці, надзейнага настаўніка маладых супрацоўнікаў, узорнага сем'яніна без шкодных звычак, выдатнага мужа і бацькі дваіх цудоўных дзяцей, ветлівага, добра выхаванага, маральна ўстойлівага чалавека.

Заява: прашу выдаць мне характарыстыку для прад'яўлення ў раённы аддзел унутраных спраў у сувязі з тым, што супрацоўнікі міліцыі затрымалі мяне ў нецвярозым стане, калі я рэгуляваў рух аўтатранспарту на скрыжаванні Сідараў А. Д.».

ТОНКІ РАЗЛІК



У двары стаяла старая альтанка, якую трэба было тэрмінова знесці. Старшыня жыллёвага кааператыва некалькі разоў прасіў жыхароў дома разабраць яе, але ніхто і пальцам не паварушыў.

Тады старшыня пакінуў на альтанцы запіску: «Ахоўваецца дзяржавай!»

За адну ноч яна была разабрана.

Міхась КАВАЛЁЎ.

Вандроўнік

Турысты кожны дзень па візы
Стаяць у даўкай таўкатні.
А мне лупаты тэлевізар
Усе вандроўкі замяніў.

Ляжу нязрушна на канапе
З нязменным пультам у руцэ.
То я гуляю па Анапе,
То муху ўжо лаўлю цэцэ.
То з хваль успененага Ніла,
Узрушаны, раскрыўшы рот,
Цягну за лапы кракадзіла —
Не страшна, хоць ён жываглот!
А вось, надзвычай сарамлівы
(Аж бачыць тое не магу),
Плыву з дзяўчатамі ў заліве,
За імі, голымі, бягу.
Забыў пра страхавы я поліс
І паліто не прыхапіў —
Нагою босаю на полюс,
Канал змяняючы, ступіў.
Ад шчасця не знаходзіў месца,
Ажно узвыў на ўвесь пакой,
Калі вяршыню Эверэста
Пакратаў горда я рукой.
А ўжо, як браў вачамі Месяц,
Тады трымцеў да самых жыл.
Адчуў, што ногі мае месяць
Зляжалы за стагоддзі пыл.
Уткнуўся моўчкі ў тэлевізар —
І ты, як кажуць, на кані!
І не спатрэбіцца па візу
Стаяць у даўкай таўкатні.

Нічыпар ШЭРАНЬКІ.

Міранізмы

Што нясе з сабою
Дваццаць першы век?
У Чырвонай кнізе
Ёсць пакуль што месца,
Хай бы там зрабілі
Запіс: «Чалавек»!

Бяспамяцтва

Над гэтым вы
Задумайцеся, людзі:
Куды бяспамяцтва
Нас прывяло?
Не можам ведаць,
Як далей што будзе,
Калі не знаем,
Як раней было!..

Вечная загадка

Загадка вечная —
Жыццё людское
Ад нараджэння
І да забыцця.
Каб зразумець,
А што ж яно такое,
Табе не хопіць
Цэлага жыцця.

Святло і агонь

Калісьці пры лямпах,
А то й пры лучыне
Навуку жыцця
Мае продкі вучылі.
Наш час перад імі
Я не бараню —
Святла цяпер болей,
Ды меней агню.

Чырвоная кніга

Нешта нам не спіцца,
Нешта нам не есца —

Міхась МІРАНОВІЧ.

Праўда ў вочы

ГУМАРЭСКА

Аднойчы ў абедзенны перапынак супрацоўнікі фірмы завялі размову пра паводзіны эканаміста Сямёнава.

— Ён увесь час гаворыць усім толькі прыемнае, камплімэнтамі сыпле, але ж я не веру ў шчырасць яго слоў! — катэгарычна заявіла галоўны бухгалтар Інеса Алегаўна.

— Сапраўды, — падтрымаў яе начальнік аддзела кадраў Рамізін, — ён, у адрозненне ад нас, ніколі не выказваў абурэння паводзінамі дырэктара. Як быццам і не ведае, што шэф грубы, з кліентамі нахабнічае... Дык не, Сямёнаў і слова дрэннага не прамовіць!

— Але, баіцца сказаць людзям праўду ў вочы, — уключылася ў размову менеджар Ганна Патапаўна, стрыечная сястра дырэктара. — Хіба ў нас няма недахопаў? Хоча выглядаць для ўсіх добранькім. А трэба быць прынцыповым!

Усю гэтую размову чуў сам эканаміст, бо ягоны кабінет быў побач, а гукаізаляцыя там дрэнная. Сямёнаў набраўся цярпення і зрабіў выгляд, што нічога не ведае. Але ж зерне сумнення, кінутае калегамі, дало свае ўсходы. «Можа, яны і сапраўды маюць рацыю? — закралася ў галаву думка. — Відаць, трэба быць смялейшым, не баяцца выказаць сваё меркаванне. Тым больш што гэта будзе імпанаваць супрацоўнікам фірмы».

...Праз дзень Сямёнаў, забіраючы ў галоўнага бухгалтара накладныя на чарговую партыю тавараў, не стрымаўся і сказаў тое, што думаў. А менавіта: выказаў абурэнне, што Інеса Алегаўна, як заўсёды, затрымала аплату па дакументах, няўважліва ставіцца да даручэнняў кіраўніцтва і наогул тармозіць многія добрыя пачынанні. Інеса Алегаўна пазелянела ад злосці і сціснула кулачкі. Пачала падбіраць у адказ патрэбныя словы, каб выказаць сваё раздражненне паводзінамі Сямёнава, але той хуценька шмыгнуў за дзверы.

Назаўтра эканаміст у размове з сакратаркай у прысутнасці начальніка аддзела кадраў выказаў нязгоду з новымі ідэямі і патрабаваннямі дырэктара. А потым, распаліўшыся, ляпнуў, што той яшчэ большы лайдак, чым менеджар Ганна Патапаўна...

Праз некаторы час з Сямёнавым перастала вітацца Ганна Патапаўна, галоўны бухгалтар пры сустрэчах злосна зыркала на яго, а дырэктар не запрашаў да сябе параіцца, як раней.

А неўзабаве начальнік аддзела кадраў Рамізін зайшоў у кабінет эканаміста і паведаміў, што праз месяц з Сямёнавым заканчваецца кантракт. Рашэнне дырэктара ўжо вядомае: на новы тэрмін кантракт падпісаны не будзе...

Міхась СЛІВА,
г. Рагачоў.

Дарагая, выручай!

Глыбокай ноччу адбылося гэта.
Зімой, не адчуваючы марозу,
За стан абняўшы ладную кабету,
У дзверы стукаў дзядзька нецвярозы.
Святлом квадрат акна заззяў у хаце,
І тут жа клямка ў сенцах загрымела.
На ганку жонка сонная ў халаце
Ажно ад нечаканасці знямела.
Па-змоўніцку хітрун прыжмурыў вока.
Пакуль была на вуліцы сяброўка,
Зайшоў у дзверы нетрывалым крокам:
«Скажы, што ты сястра мне, а не жонка!»

Уладзімір ЦАНУНІН, *г. Вілейка.*

ХТО ДА СОНЦА ЎСТАЕ, ТАМУ БОГ ДАЕ

Гэту гісторыю мне расказала бабуля маёй жонкі. Пачала яна з таго, што за польскім часам просты люд жыў па-жабрацку. Яе старэйшы брат Ігнат, напрыклад, шчыраваў дзень і ноч, а перабіваўся з жонкай і дзецьмі з хлеба на ваду. Чаму? Ці трэба і казаць: найлепшая зямля належала мясцоваму пану (яго ўсе звалі Кратом), а на няўдобіцы, на камяніцы хіба што вырасціш?

Вось і надумаўся той брат Ігнат паехаць у Амерыку, зарабіць трохі грошай — купіць сабе добрай зямлі, а калі пашанцуе, то яшчэ і каня.

Жонка, хоць і з плачам, стала збіраць яго ў дарогу, складваць нейкія рэчы... Як раптам у дзверы да іх нехта пастукаў, і на парозе з'явілася Марфа, вядомая ўсім варажбітка.

Як заведзена, павіталася, прысела:

— Можа, знойдзецца ў вас што з'есці? — спытала ў гаспадыні. — А то нешта я згаладалася.

Жанчына ад слова, што называецца, узяла нож, адрэзала госці хлеба, прынесла з каморы скваркі — можа, і апошняй...

Падзякавала варажбітка за гэткі пачастунак. А заадно і спыталася:

— Нешта ж ты, маладзічка, сумная... Куды мужыка свайго выпраўляеш?

— Ды ў Амерыку, ліха на яе, — заплакала жанчына. — Можа, ён хоць там нейкіх грошай заробіць... У Крата хацелі б зямелькі добрай купіць.

Паглядзела Марфа на гэтых сужэнцаў, на дзетак іх, памаўчала і, трохі падумаўшы, кажа:

— Не спяшайцеся, за вашу дабрыню я вам тут паспрабую падмагчы... Зараз вось да вашага пана, да Крата, іду — прасіў, каб паваражыла яму. А вы пакуль нікуды не рушцеся.

Паслухаў Ігнат варажбітку — адлажыў сваю паездку.

І правільна зрабіў, бо хутка на яго падворку сталі адбывацца сапраўдныя цуды. Ну па-першае, недзе праз тыдзень — гаспадар вачам не паверыў — завітаў на падворак сам Крот!

— Ігнат, — прамовіў ён, злазячы з шыкоўнай брычкі, — я пачуў, што ты ўшчэнт збяднеў, што ў цябе зямлі зусім мала. Вось і падумаў: дык чаму б мне не аддаць (?!) табе поле, што ля самай пушчы?.. Прыйдзеш у маёнтак — я табе ўсе паперы зраблю.

Не паспеў Ігнат з гэтым дарункам зжыцца, як на галаву яму зваліўся новы: панскі конюх прывёў на паселішча ладнага жарабца.

А далей болей, як той казаў: дзён праз колькі панскія служкі прыгналі на падворак вялікую пярэстую свінаматку з трыма парасятамі.

Ігнат з жонкай ды дзецьмі не маглі нацешыцца сваёй гаспадаркай, сваім багаццем: кожны вечар яны маліліся за здароўе варажбіткі Марфы.

...Міналі гады. У Заходнюю Беларусь прыйшла савецкая ўлада. Пан Крот, прыхапіўшы нешта з багацця, уцёк у Польшчу. Яго землі адышлі мясцоваму калгасу... Пачалася вайна.

— Мой брат Ігнат быў на фронце, ваяваў з фашыстамі, — расказвала бабуля, — з узнагародамі вярнуўся дамоў.

— А як жа тая варажбітка? Як яна змагла дапамагчы? — папыталіся мы.

— Гэтага ніхто не ведаў і, відаць, не даведаўся б, калі б я выпадкам не сустрэла Марфу. Яна і расказала мне, што ў той самы вечар варажыла пану. А той вазьмі ды спытай, колькі ж яму жыць яшчэ? Марфа «падумала» і сказала: «Ты, пане, будзеш жыць на гэтым свеце столькі, колькі будзе жыць твой парабак Ігнат!»

Тут хоць-нехаць дапамагаць чалавеку будзеш!

...Што цікава, той бабулін брат Ігнат жывы дагэтуль: яму ні многа ні мала 96 гадочкаў цяпер!

А вось ці жывы пан Крот...

М.В. Маскальчук,
г.п. Бераставіца.

ДЫПЛОМ КУПІШ, А ВЕДЫ?..

У сярэдзіне 70-х, ды і ўвогуле ў так званы савецкі час, разнарадкі даводзілі шмат на што: на колькасць жанчын сярод дэпутатаў усіх узроўняў, на колькасць «белых каўнерыкаў» (гэта значыць, ітээраўцаў, начальнікаў) сярод камуністаў, на студэнтаў — вячэрнікаў і завочнікаў...

Не скажу, што вучоба на гэтых аддзяленнях — справа дрэнная, бо сам я пасля васьмігодкі скончыў вячэрнюю школу, пасля яе — паступіў у тэхнікум. І вучыўся там зноў жа завочна.

Але ж гэта — перадгісторыя. А сама яна — вось.

Да выхаду на пенсію працаваў я ў адным калектыве, на базе. І быў там механік... Не будзем называць яго прозвішча, тым больш што па прозвішчы ды за вочы яго ніхто ніколі і не зваў. Казалі: «Схадзі да Хэ-у два наверсе, хай запчастку выпіша»...

«Хэ-у» ды «Хэ-у», карацей... Цікава ж, чаму яго так завуць?

Аказалася, што некалі на гэта прадпрыемства прыйшла разнарадка — адправіць на вучобу некага з рабацяг. Загадана — лічы што зроблена. Вучыцца пасылаюць маладога слесара, прычым далёка не лепшага (бо на базе без лепшага як без рук)...

А ў тэхнікуме, мусіць, таксама нейкі план быў: залічылі хлапца. І стаў ён вучыцца. Кантрольныя (не за дзякуй, вядома ж) пісалі яму старэйшыя таварышы, на сесіі ездзіў сам.

На першай жа прыйшоў на заняткі — выклікаюць яго нейкую задачку рашаць. Формула на дошцы доўгая, незразумелая, але ж на пачатку яе — дзве літаркі.

— Чытайце, што напісана? — кажа выкладчык.

— Хэ-у два наверсе, — смела прамаўляе студэнт (там было «ікс», «ігрэк» у квадраце).

Аўдыторыя ў покат...

Як ён скончыў той тэхнікум, не ведае ніхто. Гаварылі, «за свіныя плечы» дыплом атрымаў», гэта значыць за хабар. А ёсць дакумент, — значыць, павінна быць і пасада. Прызначылі чалавека механікам. Неяк працаваў...

Разумею, што смешнага ў гэтым мала, але ж, баюся, што такіх «Хэ-у...» выпускаюць дагэтуль. Калі грошы ў кішэні ёсць, можна паступіць, куды хочаш, атрымаць спецыяльнасць.

...Сумна, што веды не купіш!

Мікалай Х.,
Салігорскі раён.

«НУ ЯК ТЫ МАГЛА?»

Мы з прыяцелькай кабеты не маладыя, пенсіянеркі са стажам, як той казаў. У вольны час любім спакойна пасядзець, тое-сёе абмеркаваць... Вось і нядаўна гутарка пра разводы зайшла, пра тое, што цяпер, пажаніўшыся, маладыя разбягаюцца ледзь не назаўтра. І спытай, чаму, — уважлівую прычыну выставяць: каханне знікла. А што гэта такое — хто ведае?

...Муж маёй прыяцелькі — чалавек не дурны, усё жыццё пры пасадах быў. Ды і дома — нічога не скажаш — ён гаспадар. Але ж часам і такім быццам нейкі нячысцік на карак садзіцца. І ўжо тады, як ні гадзі чалавеку, усё роўна спытае: «Ну чаму ты такая?», усё роўна да нечага прычэпіцца. А ўжо ж нагаворыць! Ну, усё, здаецца, — гэта канец.

Нацярпелася жонка: і горка плакала, і моцна крыўдавала, і з дому сыходзіла, і, дарэчы, не раз на развод хацела падаць... Але ж з часам паспакайнела: перастала ўступаць у спрэчкі. Нават больш за тое — з гадамі... папярэджваць іх навучылася.

Як? Адзін са спосабаў мне найбольш спадабаўся.

Котка ў іх дома ёсць — рыжая, вялікая, прыгожая... Дык жонка перад «бурай» яе зловіць і да мужа прынясе: на стол пасадзіць і кажа, напрыклад:

— Ведаеш, Лёнічак, гэтая зладзюга ледзь мяса ў мяне не скрала...

Што тады гаспадар?

Ну вядома ж, пачынае «разбірацца», пытае (у коткі — не ў жонкі ўжо!): «Ну як ты магла?» Кажа гэтай рыжай, што яна ў іх доме як сыр у масле плавае. Мышэй не ловіць (бо іх няма), смачна есць, доўга спіць... І вось гэтак дзячыць?!

Котка галаву апусціць і слухае; бывае, што вока расплюшчыць — паглядзіць на «аратара»; бывае, штось мяўкне ў адказ. І гаспадар тады далей распінаецца...

Глядзіш, пабалабоніць, душу адвядзе — і тым самым злосць сваю выпусціць.

...Факт, што ўлетку гэтыя сужэнцы будуць залатое вяселле спраўляць. На яго, трэба разумець, з'едуцца сыны з нявесткамі, дачка з зяцем і, дасць Бог, усе сямёра ўнукаў. І як падумае жанчына, што ў маладосці магла б пакрыўдзіцца на мужа, не дараваць і развесціся, дык, кажа, аж вусцішна робіцца! Бо тады ж усёй гэтай радні на свеце не было б!

А таму прыйшлі мы з ёй да высновы, што на каханні, можа, сям'я і ствараецца, але ж трымаецца не толькі на ім: на спагадзе, на жаданні зразумець і, відаць, на пэўных ахвярах.

Валянціна Пабягайла,
г. Ляхавічы

Рубрыку вядзе
Валянціна ДОЎНАР.
dounar@zviazda.by

■ Нефармат

ЧАРГА Ў ПАЛІКЛІНІЦЫ

Ці то адносіны людзей да чакання ў чарзе памянялі ся, ці пацыенты такія падабраліся, ці так супала, але дзве гадзіны, якія давялося прачакаць каля кабінета ўчастковага доктара, прайшлі надзвычай спакойна. Людзі няспешна гутарылі. Было нават цікава пачуць своеасаблівы зрэз грамадскай думкі. У чарзе адразу абазначыліся лідары — дзве жанчыны, якія задавалі тэмы, і да іх многія перыядычна далучаліся. Ніхто не высвятляў адносіны, не спрабаваў прарвацца без чаргі. Быў адзін на самым пачатку, але яго хуценька асадзілі, і ён цярпліва чакаў, раз-пораз адпускаючы крытычныя рэплікі наконт прадмета размовы, у думках я яго празвала скептыкам.

А яшчэ вясёлы і дасціпны былы вайсковец пасмейваўся з суседзяў: наводдаль стаяла нашмат большая чарга ў кабінет электракардыяграмы, там даволі часта ўзнікала перапалка. Сюжэт класічны, нехта заняў за некім, потым адышоў, пра яго забылі, а калі прыйшоў, аказалася, што жанчыны ў жоўтай шалі, якую ён запомніў, ужо не было. Ну і пайшло...

— Ва ўсім вінаватая тая жанчына, шукайце жанчыну, — гучна гаварыў наш «палкоўнік», каб пачулі ў той чарзе.

На што суседка з лідараў яму парэкамендавала не высоўвацца, маўляў, далей ад граху: людзі і так нервуюцца, а ты ім пад руку са сваімі жартачкамі. З такой пастаноўкай пытання былы ваенны чалавек катэгарычна не згаджаўся:

— Ну, з усяго ў нас робяць праблему. Падумаеш, адна жанчына ў жоўтым ці дзве ў зялёным пройдуць раней за цябе! Нібы гэты, што крычыць, працуе галоўным маклерам на біржы, і яго час сапраўды варты грошай. Абы стварацца напружанасць, як усё роўна з тым снегам. Раз на зіму ў нас выпаў снег, дык тыдзень тэлебачанне, газеты трубілі аб гэтым, быццам адбылося нешта дагэтуль невядомае і нябачанае. Мы некалі ў Забайкальскай ваеннай акрузе з салдатамі на вучэннях месяцамі жылі ў палатках. Тое, што снегу кругом было ледзь не па пояс, нават не лічылася нечым надзвычайным. А зараз інтэрв'ю даюць ад высокіх чыноўнікаў да дворнікаў: «Усе на барацьбу са снегам!» І не так ужо ўсіх заваліла тым снегам, каб біць ва ўсе званы. Вось і зноў прывычная слата наступіла, пад нагамі хлюпае, гразь месіцца, і ўсё больш прыгожых дзяўчат прыходзяць сюды з блакітнымі паперкамі, — паказаў ён у бок вельмі сімпатычнай дзяўчыны, якая трымала свой бальнічны ліст.

Наведвальніца з бальнічным, хоць і не схільная да размоў, але, відаць з ветлівасці, рашыла падтрымаць грамаду. Сказала, як па ёй, дык лепей глядзець па тэлебачанні пра снег, чым пра войны, тэракты, бежанцаў і праблемы, якія прынеслі апошнія ў Еўропу.

Дзяўчыне горача запярэчыла самая актыўная з чаргі і стала даводзіць, што Еўропа ў нас за Бугам, сёння ў іх бежанцы, а заўтра невядома, як яно павернецца. «Бачыце, што на Новы год рабілася, гаварылі, што толькі ў Германіі, а дачка прачытала на нейкім сайце, што ва ўсіх еўрапейскіх сталіцах было адно і тое ж. Хуліганы чапляліся да жанчын, абражалі, крыўдзілі, нават гвалтавалі. Усе цяпер купляюць электрашокеры, запісваюцца на курсы самаабароны».

— Вядома, што ва ўсіх гарадах выкарыстаны аднолькавы сцэнарый, — падхапіў наш «палкоўнік». — Яны правялі разведку боем, і атрымалі патрэбны ім вынік. Паліцыя стаяла ўбаку, гэта значыць, улады бяздзейнічалі. Цяпер тыя, хто арганізаваў падобныя правакацыі, будуць больш смелымі. Вось пабачыце.

— Няхай яны самі там разбіраюцца, — пастаралася перавесці гаворку на іншае жанчына пенсійнага ўзросту. — У нас сваіх праблем хапае. Людзі без работы застаюцца. А мая дачка працуе, дык у іх зарплату ўсё ўразаюць. А ёй дзяцей вучыць. Што нам тыя бежанцы?

— Дарэмна вы так, — не згадзілася з ёй «актывістка». — Далёка — блізка, усё цяпер адносна. Я ў адзін дзень пачула па тэлебачанні дзве навіны і жахнулася. У Маскве, у элітным доме загінула адзіная дачка вядомага тэлевядучага, упала ў шахту ліфта. А ў канадскім горадзе, назву не запомніла, загінула настаўніца пачатковых класаў. Старшакласнік, ці то абгуляўся ў стралялкі, ці абкурыўся чаго, узяў зброю, пайшоў у школу і стаў страляць у каго папала. Параненыя дзеці, настаўніца загінула. Яна была адзінай дачкой мэра горада. За акіянамі, і тысячамі кіламетраў, а гора ў людзей аднолькавае...

З гэтай жанчынай пагадзіліся амаль усе, і толькі скептык, якога на самым пачатку не пусцілі без чаргі, заўважыў, што ў нашых мэраў дочкі настаўніцамі не працуюць. Агучаны тэзіс ніхто развіваць не стаў, бо яго аўтар зайшоў у кабінет да доктара.

Мая чарга была за ім, як аказалася, мне заставалася чакаць 35 хвілін. Каля дзесяці хвілін быў на прыёме папярэдні пацыент, затым без малога паўгадзіны ўрач парадкавала патрэбную ёй справаздачнасць. Ну, вы ведаеце, гэта звычайная практыка. Самае цікавае адчуванне, калі стаіш пад кабінетам у чаканні што паклічуць, бо там больш нікога няма з наведвальнікаў, а ніхто не кліча. За гэты час я паспела сама сабе адзначыць, што ў нас вельмі добразычлівая чарга, прааналізаваць, пра што гаварылі, успомніць, што ніхто не згадаў любімую тэму падобных аўдыторый — пра цэны. І тут падышла бабулька з кіёчкам, вельмі пажылая, сказала, што ёй толькі выпісаць рэцэпт. Я запрасіла заходзіць разам са мной, як толькі паклічуць. А яна без усялякіх уступаў пачала: «Во дзіва, зайшла па дарозе ў магазін, а там яблыкі польскія амаль па 11 тысяч, а нашы — па 18. Чаму так?»

— Дык добра ж, у вас ёсць выбар, а вы наракаеце, — строга ўказаў пенсіянерцы «палкоўнік».

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

ПАДЛІЎКІ ДА МАКАРОНАЎ

Сырная

Спатрэбіцца: *2 ст. л. мукі, шклянка малака, 50 г масла, алей, соль, перац, 200 г надзёртага сыру, кмен, базілік.*

Муку абсмажыць да залацістага колеру, павольна ўліць шклянку малака, размешваючы, давесці да кіпення, дадаць надзёрты сыр, змяшаць. Дадаць прыправы, мяккае масла (загадзя дастаць з халадзільніка), змяшаць. Падаваць гарачым, заліўшы макароны або патушыць макароны ў соусе пару хвілін.

З курыцы

Спатрэбіцца: *адна курыная грудка без костак, цыбуля, мука, смятана або вяршкі (шклянка), вада, базілік, часнок.*

Нарэзаную саломкай курыную грудку абсмажце на патэльні да залацістага колеру, дадайце дробна нарэзаную цыбулю, змяшайце. Калі цыбуля зазалаціцца, дадайце пару лыжак мукі, абсмажце да карамельнага колеру, дадайце трохі вады, змяшайце, накрыйце вечкам і дайце патушыцца на маленькім агні. Калі мяса будзе практычна гатова, заліце яго смятанай (або вяршкамі), дадайце здробнены часнок, базілік, соль і перац, патушыце яшчэ пару хвілін і здымайце з агню.

З курыцы з грыбамі

Спатрэбіцца: *курыная грудка (філе), дзве цыбуліны, 300 г шампіньёнаў, смятана, соль, перац, зеляніва, 2 л. масла, алей.*

На алеі абсмажце нарэзаную на невялікія кавалачкі курыную грудку, трохі пасаліце. Калі курынае мяса стане залацістым, дадайце нарэзаную саломкай цыбулю і патрымайце на сярэднім агні яшчэ хвілін дзесяць. Нарэжце шампіньёны (саломкай або палавінкамі), дадайце на патэльню, паперчыце, змяшайце, дадайце масла, зрабіце слабы агонь. Праз пяць хвілін дадайце смятану, пасаліце, дадайце зеляніва.

Са шпінату

Спатрэбіцца: *свежы (500 г) або замарожаны шпінат (адна ўпакоўка), алей, базілік, соль, вяршкі (смятана), 50 г масла.*

На патэльню змясціце дробна нарэзаны шпінат або здробнены з крамнага пачка, накрыйце вечкам, крыху патушыце. Трохі прысаліце, уліце шклянку вяршкоў або нятлустай смятаны, дадайце лыжку масла, дадайце базілік (сухі або свежы). Далікатная і карысная страва гатуецца на працягу 10 хвілін і выдатна падыходзіць да макаронаў.

З ялавічыны

Спатрэбіцца: *300—400 г ялавічыны, дзве-тры цыбуліны, дзве морквы, мука, мясны булён або вада, кубак вяршкоў, соль, перац, часнок, зеляніва.*

Ялавічыну нарэзаць саломкай, абсмажыць на алеі, пакуль не ўтворыцца карычневая скарыначка. Пасля гэтага заліць булёнам або вадой, дадаць нарэзаныя саломкай цыбулю і моркву, тушыць да мяккасці мяса на слабым агні. Паралельна на іншай патэльні абсмажыць дзве лыжкі мукі да карычневага колеру, дадаць трохі вады, размяшаць, дадаць вяршкі, пасаліць, паперчыць, пераліць у сатэйнік з мясам. У гатовую падліўку дадаць здробненае зеляніва і часнок.

ВАРТА ВЕДАЦЬ

КРОК ЗА КРОКАМ

Правільная паслядоўнасць работ пры рамонце

1. Выберыце стратэгію

Калі вы хочаце рабіць рамонт паэтапна, адначасова пражываючы ў кватэры, то лепш пачаць работы з самых складаных, самых «брудных» — гэта значыць, кінуць усе сілы на ванны пакой, санвузел і кухню. Пасля чаго паступова пераходзіць у жылыя пакоі.

2. Прыдумайце ідэю інтэр'ера

Было б выдатна мець нейкія думкі, а яшчэ лепш — дакладны план таго, што вы хочаце атрымаць у выніку.

3. Дэмантаж і замена вокнаў

Капітальны рамонт пачынаюць з дэмантажу ўсяго, што вам не спатрэбіцца. Наступны крок — замена вокнаў (калі патрабуецца).

4. Пракладка камунікацый, установка новых канструкцый і сцен

Калі нічога новага не ўзводзіцца, то займаюцца водаправоднымі работамі: усталёўваюць радыятары, трубы для падключэння пральнай машыны, змяшальнікаў, воданагравальніка, пасудамыйнай машыны, ванны, мыек, душавой кабіны. Ужо на гэтым этапе вы павінны ведаць вышыню вашай будучай ванны, тып душавой кабіны, месцы і асаблівасці размяшчэння так званых «вільготных» прыбораў.

Усе работы па электрыцы выконваюць таксама ў гэты перыяд. Не забудзьцеся на гэтым этапе аб правядзенні кабелю для тэлевізара, інтэрнэту, дамафона і тэлефона.

5. Выраўноўванне паверхняў, тынкавачна-малярныя работы

Будаўнікі рэкамендуюць пачынаць зверху, гэта значыць са столі. Устаноўкай цёплай падлогі таксама мае сэнс заняцца на гэтым этапе.

6. Укладванне керамічнай пліткі і іншыя віды аздаблення работ

Калі вы захацелі афармліць сцены, напрыклад, керамікай «пад цэглу» або пад камень, выкласці пліткі з бамбука, наклеіць дэкаратыўную мазаіку ці нешта падобнае, то цалкам магчыма зрабіць гэта цяпер.

7. Устаноўка сантэхнікі

Вывады пад сантэхніку былі зроблены раней, цяпер толькі трэба ўстанавіць усе прыборы і абсталяванне.

8. Чыставое аздабленне і выкладванне падлогавых пакрыццяў

З бруднымі відамі работ скончана. Цяпер можна фарбаваць столь і сцены, клеіць шпалеры альбо спачатку заняцца ўкладкай падлогавага пакрыцця.

9. Устаноўка міжпакаёвых дзвярэй

Яшчэ на этапе працы са сценамі ў вас павінны быць запланаваны дзвярныя праёмы неабходнай шырыні і вышыні. Выберыце дзверы загадзя, хаця б прыгледзьцеся і ўдакладніце ўсе неабходныя памеры.

10. Устаноўка асвятляльных прыбораў, разетак

Завяршальны штрых — устаноўка ўсіх асвятляльных прыбораў, дэкаратыўных рамак разетак, мацаванне плінтусаў.

Ваш рамонт гатовы, і на гэтым этапе вы ўжо адчуваеце сябе трошкі профі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.01	17.46	8.45
Віцебск —	8.55	17.30	8.35
Магілёў —	8.51	17.36	8.45
Гомель —	8.42	17.38	8.56
Гродна —	9.15	18.01	8.46
Брэст —	9.10	18.08	8.58

Месяц

Поўня 24.01-31.01.

Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Антона, Паўла.*

К. *Марціны, Марціна, Мацея, Себасцьяна, Фелікса.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

30 СТУДЗЕНЯ

1895 год — нарадзіўся (вёска Мышкавічы, цяпер Кіраўскі раён) Кірыл Пракопавіч Арлоўскі, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, арганізатар калгаснай вытворчасці, Герой Савецкага Саюза (1943), Герой Сацыялістычнай Працы (1958). У 1918 годзе ў час германскай акупацыі Беларусі па заданні Бабруйскага падпольнага райкама РКП(б) арганізаваў і ўзначаліў на радзіме партызанскі атрад. У 1920-1935 гадах — у органах АДПУ і НКУС. У якасці камандзіра разведвальна-дыверсійнай групы, якая дзейнічала ў тыле праціўніка, ваяваў на баку рэспубліканскага ўрада ў грамадзянскай вайне ў Іспаніі ў 1936-1939 гадах. У 1940-1942-х выконваў спецыяльнае заданне ў Кітаі. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 года быў на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Арганізатар і камандзір партызанскага атрада «Сокалы», які 17 лютага 1943 года знішчыў «галоўнага камісара» Баранавіч. У гэтым баі Арлоўскі атрымаў цяжкае раненне, у выніку якога страціў абедзве рукі і слых. З 1944 года быў старшынёй калгаса «Рассвет», які пад яго кіраўніцтвам стаў буйной шматгаліновай гаспадаркай. Памёр у 1968-м. На радзіме яму ўстаноўлены помнік.

1926 год — заўтра, 31 студзеня, святкуе свой 90-гадовы юбілей Міхаіл Канстанцінавіч Міцкевіч, беларускі вучоны ў галіне тэхналогіі апрацоўкі металаў, доктар тэхнічных навук (1985), майстар спорту па стэндавай стральбе (1956). Сын Якуба Коласа. У 1949 годзе скончыў БПІ. У 1949-2005 гадах працаваў у Фізіка-тэхнічным інстытуце НАН Беларусі. Аўтар навуковых прац па электрафізічных метадах апрацоўкі матэрыялаў, у тым ліку па навуковых асновах электраэразійнага метаду. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980). **Віншуем юбіляра і зычым моцнага здароўя і бадзёрага духу!**



1930 год — ЦК ВКП(б) зацвердзіў пастанову «Аб мерапрыемствах па ліквідацыі кулацкіх гаспадарак у раёнах суцэльнай калектывізацыі», якая санкцыянавала канфіскацыю маёмасці, масавую высылку на пасяленне ў неабжытыя раёны Сібіры і іншыя рэпрэсіўныя меры ў дачыненні да «кулакоў». 4 лютага 1930-га была зацверджана інструкцыя ЦВК і СНК саюзным рэспублікам, краям і абласцям пра ўскладанне на АДПУ арганізацыі «раскулачвання».

Было сказана

Антон БЯЛЕВІЧ, паэт:

«Не ўчарашнім днём жыву на свеце — велічнай наступнасцю жыву».

УСМІХНЕМСЯ

Сёння на дзень нараджэння тату грошы падарылі, заўтра пойдзем маме туфлі купляць.

— Марына, зайка ты мая. Да нас сёння Каспяровічы зойдуць, прыгатуй што-небудзь на вячэру.

— Добра. А як прыгатаваць — каб потым яшчэ раз прыйшлі ці каб больш наогул не прыходзілі?..

У дзяцей, якія вучацца добра ў школе, бацькі проста добра памятаюць школьную праграму.

Не знайшла сваё імя на бутэльцы «Кока-колы», пакрыўдзілася... Купіла каньяк!

Малюнак Мікалы ГІГРГЕЛЯ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.886. Індэкс 63850. Зак. № 307. Нумар падпісаны ў 19.30 29 студзеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12